Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАКТЫКУМ
## ПА АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Дапаможнік*

Мінск 2010

УДК 811.161.3(075.8)
ББК 81.2(4Беи)–923
П691

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 4 ад 20.11.09)

А ў т а р ы : В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, В.Г. Качан, П.В. Юцкевіч

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філалагічных навук, загадчык кафедры рускай мовы БДПУ
*Т.Р. Трафімовіч*;
кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай і рускай моў
БНТУ *Н.В. Гаўрош*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Практыкум** па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы : дапаможнік /
П691 В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, В.Г. Качан і інш. – Мінск : БДПУ, 2010. – 128 с.
ISBN 978-985-501-846-0.

У дапаможніку змешчаны практыкаванні, кантрольныя заданні і тэсты для засваення асноўных правілаў беларускай арфаграфіі і пункутацыі з улікам змяненняў, прадугледжаных «Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (2008 г.).

Адрасуецца студэнтам факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, а таксама студэнтам і навучэнцам іншых навучальных устаноў.

**УДК 811.161.3(075.8)**
**ББК 81.2(4Беи)–923**

**ISBN 978-985-501-846-0**

© БДПУ, 2010

# ПРАДМОВА

Беларускі правапіс на сучасным этапе – гэта цэласная сістэма, якая склалася гістарычна і не супярэчыць заканамернасцям фанетыкі беларускай мовы, адпавядае жывым законам яе граматычнага ладу і адлюстроўвае асаблівасці формазмянення часцін мовы. Засваенне норм беларускай літаратурнай мовы – адна з найважнейшых умоў падрыхтоўкі настаўніка. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі сучаснай беларускай мовы падрыхтаваны ў адпаведнасці са зменамі, прадугледжанымі ў новых «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»[1].

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя заданні і практыкаванні на ўсе традыцыйныя раздзелы арфаграфіі і пунктуацыі. Асаблівая ўвага надаецца словам, правапіс якіх зменены ў новай рэдакцыі правілаў. У кожным раздзеле падаюцца практыкаванні на замацаванне правіла, кантрольныя заданні і тэсты, што дае магчымасць самастойна ці з дапамогай выкладчыка паўтарыць і праверыць веды па дадзенай тэме.

Дапаможнік мае на мэце сістэматызаваць ужо набытыя веды, узбагаціць і паглыбіць іх, удасканаліць і замацаваць веданне правілаў, развіць у студэнтаў здольнасць самастойна аналізаваць моўныя з’явы, грунтоўна авалодаць нормамі літаратурнай мовы, павысіць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць.

Практыкум прызначаецца для студэнтаў педагагічных навучальных устаноў, настаўнікаў гімназій, ліцэяў і агульнаадукацыйных школ. У залежнасці ад мэты і характару заняткаў і ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі аўдыторыі выкладчык можа спрасціць умовы практыкаванняў або ўскладніць іх дадатковымі заданнямі (у дапаможніку падаюцца пад значком ).

Дапаможнік з’яўляецца спробай навучання арфаграфіі і пунктуацыі пры дапамозе ўстойлівых асацыяцый, якія ўзнікаюць пры чытанні афарызмаў, паколькі яны змяшчаюць яркія кароткія вобразы, маюць строгую ўнутраную логіку. Выказванні беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў культуры, філосафаў, народныя выслоўі даюць вельмі багаты матэрыял, што дазваляе праілюстраваць асноўныя асаблівасці беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

---

[1] Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2008.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Аўтары выказваюць шчырую падзяку кандыдатам філалагічных навук прафесару Н.В. Гаўрош і дацэнту Н.М. Нямковіч за магчымасць выкарыстаць афарызмы, змешчаныя ў часопісе «Роднае слова» за 2006, 2007 і 2009 гады.

Аўтарамі дапаможніка з'яўляюцца супрацоўнікі кафедры беларускай мовы і методыкі яе выкладання БДПУ дацэнты В.У. Азарка (тэмы «Правапіс мяккага знака і апострафа», «Правілы пераносу», «Правілы пастаноўкі працяжніка», «Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе»), А.С. Васілеўская (тэмы «Правілы напісання галосных», «Правапіс часціц *не, ні* з рознымі часцінамі мовы», «Знакі прыпынку ў канцы сказа», «Знакі прыпынку пры цытатах і простай мове»), В.Г. Качан (тэмы «Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок», «Правапіс скарачэнняў», «Знакі прыпынку ў складаным сказе»), асістэнт П.В. Юцкевіч (тэмы «Правілы напісання зычных», «Правапіс прыставак», «Правапіс суфіксаў», «Правапіс вялікай і малой літар»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАВІЛЫ АРФАГРАФІІ

## Правілы напісання галосных

### Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я

*1. Размяркуйце прапанаваныя словы па групах паводле правіл правапісу галосных: 1)* ***о, э*** *пішуцца пад націскам; 2)* ***а*** *пішацца ў ненаціскным становішчы на месцы* ***о, э****; 3)* ***э*** *пішацца не пад націскам у запазычаных словах; 4)* ***я*** *пішацца ў першым складзе перад націскам на месцы* ***е, ё****; 5) замест ненаціскных* ***о, э*** *пішацца* ***ы****; 6) у канцы запазычаных слоў не пад націскам пішуцца спалучэнні* ***-аль, -ар****; 7) на канцы ўласных імёнаў пішуцца спалучэнні* ***-эль, -эр****; 8)* ***я*** *пішацца незалежна ад націску; 9)* ***е*** *пішацца ў першым складзе перад націскам у запазычаных словах.*

Імпрэсары…, дз…вяты, вінчэст…р, Піт…р, с…рца, бр…во, Генд…ль, капрычы…, пяцьдз…сят, пам…ць, р…форма, ш…сцёра, шпат…ль, дз…журства, ж…стыкуляцыя, В…нецыя, ц…ц…рук, г…рой, літ…ратура, сув…зь, інж…нер, Шапенгаў…р, л…пух, м…тодыка, гр…моты, гіпот…за, Каларад…, ц…жкавата, пост…р, гард…роб, Гюнт…р, п…сняр, крат…р, ж…раў, л…ксічны, майст…рня, нав…ліст, л…мантаваць, бл…ха, г…нар, тыс…ча, Манчэст…р, ц…лафан, лід…р, бр…зент.

*2. Размяркуйце словы па групах: 1)* ***е*** *пішацца ў сярэдзіне слова; 2)* ***э*** *пішацца ў сярэдзіне слова; 3)* ***е*** *пішацца на канцы слова; 4)* ***э*** *пішацца на канцы слова. Назавіце ўмовы напісання галосных* ***э*** *і* ***е*** *ў запазычаных словах.*

Бурымэ, сенбернар, каноэ, вельвет, фрагмент, дэфіле, санет, рэле, купэ, тунэль, бізнес, макрамэ, каравела, сервер, манумент, камюніке, прэзентацыя, фуэтэ, панэль, піке, інерцыя, музей, кашнэ, эдэльвейс, алоэ, сканер, шрапнэль, парламент, дыспансер, кузен.

*3. Прачытайце сказы. Растлумачце правапіс галосных у выдзеленых словах.*

1) Культура нацыі без культуры роднай мовы – ***нонсэнс***, ***бяссэнсіца*** (Н. Гілевіч). 2) Не ***родзіцца*** мудрае слова, калі не ***радзіўся*** мудрэц (І. Ралько). 3) Раднёю і мовай не грэбуй, ты – ***колас*** сярод ***каласоў***…

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(С. Законнікаў). 4) Ва ўсім ***цывілізаваным*** свеце ***родная*** мова з’яўляецца асноваю, якая лучыць усе прадметы школьнага курса, якая праходзіць праз усе яго часткі (Р. Шырма). 5) Хай ***злыдні*** над намі ***скрыгочуць*** зубамі – любі сваю ніву, свой край (Я. Купала). 6) З ***глыбіняў*** вякоў узнікаюць і зноўку знікаюць дарожныя знакі – людзі, што сустракаюцца нам на нашых шляхах (А. Разанаў). 7) А вось чуласць, чалавечнасць – ім дарога проста ў вечнасць – больш за ўсё нам ***даражэй*** (Я. Колас). 8) Для мастацтва «***маладых***» не існуе. Як не існуе «сталых» ці «старых». У ім іншае суаднясенне, іншыя ***катэгорыі*** – ***эстэтычныя***, а не ***дэмаграфічныя*** (А. Разанаў). 9) ***Дабро*** мы можам ***ацаніць*** самі, а зло часцей за ўсё ***ацэньваюць*** на нашым горкім вопыце другія (Г. Марчук). 10) ***Размова*** – мова думак, ***маўчанне*** – мова ісціны (А. Разанаў).

*4. Устаўце **э** ці **а**.*

Форт…ль, альма-мат…р, кано…, кр…дыт, орд…р, орд…н, эспанд…р, д…легат, р…візор, бухгалт…р.

*Растлумачце значэнне слоў.*

*5. Устаўце **э** ці **ы**.*

Др…зіна, дыр…жор, р…клама, т…орыя, ц…р…монія, інт…рвал, ар…шт, д…таль, пр…зідэнт, хр…сціць.

*Растлумачце значэнне слоў.*

*6. Спішыце сказы, устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс галосных **е, ё, я**.*

1) А слова павінна быць, як насенне, якое сеем у дзень в…сенні, слова павінна прарастаць, даваць усходы, рунець, красаваць (А. Вярцінскі). 2) Ды калі ты не б…зродны сын – гавары са мной па-беларуску (Я. Янішчыц). 3) Каб вольна было думцы, трэба, каб вольна было словам, каб лёгка ліліся яны з душы, з падсв…домасці, з падсв…домай пам…ці. Н…абходна менавіта такое веданне мовы, адчуванне яе (Т. Бондар). 4) Пароль н…ўміручасці – родная мова (П. Макаль). 5) Як закаханыя людзі на час не зважаюць, так падарожныя кал…ндароў не чытаюць (А. Куляшоў). 6) Кожны мае дружбака такога, захавана ў сэрцы да якога прыязні даўнейшай ц…плыня (А. Куляшоў). 7) Пылінку бачым у суседа, ды што? – ў яго іх не адна! А ў сваім воку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

даўнім следам на заўважаем б…рвяна (Я. Купала). 8) Бо…зь засцерагае: у будучыні – смерць! Адвага натхняе: у будучыні н…ўміручасць! (А. Разанаў). 9) Галоўнае – з з…млёй бацькоўскай сув…зь, што б ні было, трывалай зб…рагчы (С. Законнікаў). 10) Вялікая гэта справа – чалавечая адкрытасць, праўдзівая спов…дзь без грама разліку, жаданне падаць сябе лепшым, чым ёсць на самай справе (В. Быкаў). 11) Ёсць задачы-адкрыцці і задачы-пасткі, якія адно толькі забіраюць тваю эн…ргію і розум і, нават вырашаныя, нічога табе не кажуць і нікуды цябе не в…дуць (А. Разанаў). 12) Светлы лёс паэта – усё жыццё імкнуцца ў маладосць. Заўжды ў паходзе быць, пакуль дыханне ёсць – быць маладосці п…сн…ром для свету (К. Кірэенка). 13) Шчырае н…ўменне ў паэзіі – больш паэзія, чым праф…сійная імітацыя (А. Разанаў). 14) Добра, што сэрца не знае в…рлібраў, а роўна адлічвае кожны ўдар (С. Грахоўскі). 15) Еднасці лепшай не знойдзецца, мусіць, – слова з м…лодыяй, як спарышы (С. Законнікаў).

*7. Устаўце* ***е*** *ці* ***э****.*

Пенсн…, каф…, в…тэран, цэнтн…р, тэмперам…нт, м…бля, с…рвіс, лаз…р, с…рвіз, Кампан…ла.

Растлумачце значэнне слоў.

*8. Устаўце* ***е*** *ці* ***я****.*

Л…генда, ц…гнік, зам…ць, за…ц, мес…ц, по…с, шэсцьдз…сят, м…тро, св…ткаваць, кал…ктыў.

Растлумачце значэнне слоў.

## Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

*9. Перакладзіце словы на беларускую мову. Запоўніце табліцу.*

Мемориал, папайа, идеология, импрессионизм, аббревиатура, гигиена, неологизм, Иерусалим, Йемен, адажио, акционер, диалект, клиент, геолог, Нью-Йорк, майор, реакция, Майя, абитуриент, фойе, Иоанн, Неаполь, портфолио, юниор, реализм, аккордеон, период, Иосиф, Савойа, майонез, метеор, миниатюра, йена, комедиограф, йод, Иордания, геология, конвейер, иерархия, Агайо, семиотика, ионный, сольфеджио, ионосфера, майорат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| У рускай мове | У беларускай мове | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | пад націскам | | не пад націскам | | |
| | пачатак слова | сярэдзіна слова | пачатак слова | сярэдзіна слова | канец слова |
| ИО | | | | | |
| ИА | | | | | |
| ИЕ | | | | | |
| ЕО | | | | | |
| ЕА | | | | | |
| ЙЕ | | | | | |
| ЙО | | | | | |
| ЙА | | | | | |

*10. Спішыце сказы, устаўце прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне спалучэнняў галосных.*

1) Кожны народ стварыў хоць бы адзін ген…льны твор, і твор гэты – мова (А. Разанаў). 2) Мова – гэта душа нац…нальная народа, калі ёсць такая душа, то ёсць і гаспадар яе – гэта сам народ, а як не гіне народ з нац…нальнальнай душой, так не загіне беларускі народ! (Ядвігін Ш.). 3) У ак…не слова – ані мяжы, ні донца. Ёсць там адна аснова – праца і праца бясконца (В. Жуковіч). 4) Пісьменнік павінен добра ведаць, што творы – гэта таксама яго б…графія, а б…графіяй трэба даражыць (Я. Скрыган). 5) Ар…нціраў не ведае страх і не разбірае дарогі (Н. Гілевіч). 6) Дык ён жа двойчы хамел…н! Там, дзе авечкі, – у шкуры авечай. Там, дзе чалавекі, – у чалавечай (А. Вярцінскі). 7) Цукар – твая мова, слодыч скрозь адметна. Сведчу, адным словам, – пішаш д…бетна (В. Вітка). 8) Душа п…та – то ж р…ктар вечны, што выпраменьвае часціцы болю і сотні тысяч сэрцаў чалавечых бамбардзіруе імі без адбою, каб шляхам ядзернага расшчаплення прывесці ў рух энергію сумлення (Н. Гілевіч). 9) Патр…тызм – гэта ўпрыгожванне радзімы талентамі і справамі (Г. Марчук). 10) Каб людзі ў шматміл…рдным стане нарэшце зваліся людзьмі (Н. Мацяш).

## Правапіс літар ы, і, й пасля прыставак

*11. Разгледзьце алгарытм правапісу галосных* ***і, ы, й*** *пасля прыставак, дапоўніце яго прыкладамі.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ




*12. Спішыце сказы, устаўляючы патрэбныя літары. Растлумачце правапіс літар пасля прыставак.*

1) Ніколі не ўз…дзе зерне, што ўпала ў бясплодны пясок (В. Вітка). 2) Пра сталасць і вартасць народа сведчыць не тое, якіх талентаў, якіх геніяў нарадзіў народ, а тое, як ставіцца народ, нацыя да народжаных сваіх талентаў; як народ, нацыя з імі аб…шліся і аб…ходзіцца (Ф. Янкоўскі). 3) Калі чалавек у зямлю с…ходзіць, вылушчваецца з яго зернейка духу (Н. Мацяш). 4) Мы ўсе памалу пры…дзем к небыццю (П. Глебка). 5) Будзем адхукваць з…нелую рунь, колькі магі ёсць, дзеля ўмалоту і шляху ў зару вольнасці, а не ў магілу (Н. Мацяш). 6) Жыццё пражыць – не поле пера…сці, а трэба і жыццё пра…сці, як поле, і хоць адным зярняткам уз…сці, а бур'яном не зарасці ніколі (С. Грахоўскі). 7) О край мой мілы! Усёй душою хачу злучыцца я з табою, у тваіх палях пазычыць сілу, у тваёй зямлі с…сці ў магілу (Я. Колас). 8) Назад не пры…дзе хваля тая, што з быстрай рэчкай уплывае (Я. Колас). 9) Па…шоў пясняр, а песня засталася, памёр паэт, а песня будзе жыць (С. Грахоўскі). 10) Пакуль паэты будуць пець – не быць Радзіме без…меннай, зямлі бацькоў – не анямець (Н. Гілевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*13. Пры дапамозе прыставак утварыце новыя словы.*

| | |
|---|---|
| звыш- | індустрыяльны, інфляцыя, імклівы |
| з- (с-) | ісці, імправізаваць, ігр噶цца, іскаць, іначыць |
| контр-, супер- | ігра, ідэя |
| дэз- | інтэграцыя, інфармацыя, інфекцыя |
| суб- | інспектар |
| перад- | інфарктны, імперскі, іспытны |
| за- | іскрыцца, інтрыгаваць, ісці, іграць, інець |

*14. Устаўце **і** ці **й**.*

Вы…грыш, за…меннік, па…менны, Пры…ртышша, не…стотны, за…кацца, пра…маць, над…ндывідуальны, між…нстытуцкі, пера…начыць.

## Правапіс у і ў (у нескладовага)

*15. Складзіце алгарытм на правапіс **у** і **ў** (у нескладовага), карыстаючыся ўзорам, прыведзеным у практыкаванні 11.*

*16. Размяркуйце словы на два слупкі: 1) пішацца **у** (у складовае), 2) пішацца **ў** (у нескладовае).*

А…дыторыя, фа…на, прэзіды…м, кло…н, ма…залей, ва …ніверсітэце, Брэсцкая …нія, князь …ладзімір, кантрольна-…ліковы, фіна-…горскі, бакала…р, самы …нікальны, рады…с, каля …шач, да …рны, со…с, Бернард Шо…, крыкі «…ра», тра…р, а…л, а…дыякасета, са…на, шэдэ…р, тры….мф, дыназа…р.

## Правапіс прыстаўных галосных

*17. Выпішыце словы з прыстаўнымі галоснымі. Сфармулюйце правілы іх напісання.*

1) Слова валодае таямнічай сілай – бывае хвіліна ці імгненне, калі яно, кінутае ў свет, як каменьчык, выклікае абвал – нябачны, нячутны, які доўжыцца гады (В. Іпатава). 2) Нізка ў пояс схіляецца жыта, сінім морам вітаюць ільны. Беларускі народ працавіты, твае поспехі свету відны (А. Астрэйка). 3) Кожны чалавек імкнецца да шчасця. Шукае, як шукальнік залатую жылу (І. Грамовіч). 4) Паны сварацца, а ў мужыкоў ілбы трашчаць (Прыказка). 5) Мова – жывая істота. Яна жыве, а не існуе (К. Чорны). 6) І жалеза



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сатрэцца, калі ржа завядзецца (Прыказка). 7) Жыццё заўжды – іспыт на мужнасць. Яе ж не возьмеш напракат… (Н. Мацяш). 8) З дробнага вялікае, дробнае з вялікага – вось ён, існавання пакручасты ход! (А. Звонак). 9) Паспей для ўнука дрэва пасадзіць і пыл з іконы старадаўні сцерці. І памятай заўсёды: толькі ў смерці ёсць права ўсё спакойна рассудзіць (Г. Бураўкін). 10) Ніякіх скідак на імклівы век! Душа не знойдзе аніякіх лекаў, калі ў жалезным веку чалавек не будзе заставацца Чалавекам (А. Камароўскі).

## *Правапіс галосных у складаных словах*

*18. Запішыце словы ў адпаведныя калонкі, растлумачце свой выбар. Прывядзіце свае два прыклады на кожнае правіла.*

| О | Э | А | Е | Ё | Я |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Г…л…валомка, музе…знаўства, х…разнаўства, в…гнеўстойлівы, сл…ваформа, п…лісемія, час…піс, адн…разовы, м…танакіраваны, ст…працэнтны, св…тапогляд, в…лікадушны, В…лікабрытанія, л…гкаатлетычны, дво…ўладдзе, кін…герой, земл…роб, с…мікласнік, жыцц…сцвярджальны, ш…сцьсот.

*19. Замест словазлучэнняў запішыце ўтвораныя ад іх складаныя словы. Напісанне галосных растлумачце.*

Сто галасоў, від краю, радавацца жыццю, любіць вольнасць, роўныя правы, шэсць ствалоў, устойлівы да вады, з вялікай галавой, варыць мёд, насіць зброю, склад зерня, з жоўтымі лістамі, лячэнне вадой, падобны да хвалі, Новы год, гонкі на матацыклах, апрацоўваць шэрсць, з вострым верхам, дробны лес, Белая вежа.

*20. Спішыце, устаўце прапушчаныя літары.*

1) Творчасць – індыкатар, св…еасаблівы дарожны знак: кожны раз яна паказвае табе самому, дзе ты цяпер і які ты цяпер (А. Разанаў). 2) Паэты паміраюць на світанні – і астаюцца з намі жыць шт…дзень (Г. Бураўкін). 3) Пісьменнік і навуковая творчасць – душэўная хвароба, але выс…кародная хвароба (В. Каваленка). 4). Тварыць шт…дзённа, апантана – для чалавека значыць – жыць (Н. Гілевіч). 5) Д…ўгавечнасць кахання залежыць ад д…ўгацярплівасці жанчыны і ад ступені мужчынскай ляноты (Г. Марчук).

*Растлумачце сэнс аднаго з афарызмаў.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *Кантрольныя заданні*

*21. Знайдзіце пятае лішняе.*

1) палан…з, шын…ль, фан…тыка, м…даль, нэцк…;
2) камп'ют…р, лід…р, менедж…р, Юпіт…р, шніц…ль;
3) сальта-мартал…, с…мнаццаць, в…лікамучанік, л…гкадумны, в…люр;
4) гр…смайстар, м…вазнаўства, шт…год, ст…годдзе, к…нтрігра;
5) пра…нфармаваць, пра…снаваць, пра…граць, пра…люстраваць, пра…ранскі.

*22. Назавіце адным словам.*

1) спіс літаратуры па якім-небудзь прадмеце, пытанні; 2) правілы літаратурнага вымаўлення; 3) літары *е, ё, ю, я, і*, якія абазначаюць два гукі; 4) навука, якая вывучае быт і культуру даўніх часоў па знойдзеных шляхам раскопак рэчавых помніках; 5) музычны твор для трох выканаўцаў; 6) фігурны знак у сістэме ідэаграфічнага пісьма; 7) асобная адзінка, асобны прадмет з шэрага падобных; 8) манера пісаць, характар абрысаў літар; 9) глабальная тэлекамунікацыйная сетка інфармацыйных і вылічальных рэсурсаў, Сусветная павуціна; 10) прыстасаванне для друку лічбавай інфармацыі на цвёрдыя носьбіты.

**Словы для даведак**: інтэрн…т, арф…пія, экз…мпляр, тры…, бібіл…графія, поч…рк, …таваныя, прынт…р, арх…логія, …рогліф.

## Тэст

1. Адзначце, у якіх словах пішацца ***а***:

| | | |
|---|---|---|
| 1) Токі_, | 2) Ланд_р, | 3) фельч_р, |
| 4) ст_гадовы, | 5) д_бразычлівы. | |

2. Адзначце, у якіх словах пішацца ***о***:

| | | |
|---|---|---|
| 1) м_вазнавец, | 2) ф_таграфія, | 3) п_ліглот, |
| 4) в_семсот, | 5) Вад_хрышча. | |

3. Адзначце словы, у якіх пішацца ***э***:

| | | |
|---|---|---|
| 1) світ_р, | 2) ц_мент, | 3) без_, |
| 4) ж_мчужына, | 5) м_тазгодны. | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Адзначце словы, у якіх пішацца ***е***:
1) рэн_санс, 2) дз_сяты, 3) маян_з,
4) мес_ц, 5) в_лікасвецкі.

5. Адзначце словы, у якіх пішацца ***я***:
1) с_кунда, 2) дроб_зь, 3) м_тровы,
4) кал_ндар, 5) крыв_носны.

6. Адзначце словы, у якіх пішацца ***ы***:
1) тр_вога, 2) р_партаж, 3) канц_лярыя,
4) кр_шыць, 5) раз_граць.

7. Адзначце словы, у якіх пішацца ***і***:
1) за_кнуцца, 2) пед_нстытут, 3) пера_маць,
4) без_менны, 5) супер_нтэлект.

8. Адзначце словы, у якіх пішацца ***й***:
1) аб_сці, 2) пера_менаваць, 3) аб_лгаць,
4) не_маверны, 5) за_скрыцца.

9. Адзначце словы, у якіх пішацца ***ё***:
1) Эфі_пія, 2) _гурт, 3) ра_ніраваць,
4) басты_н, 5) л_дадрабілка.

10. Адзначце словы, у якіх пішацца **у** (у складовае):
1) ля _нівермага, 2) пры князю _сяславе, 3) ска_т,
4) а_тар, 5) стра_с.

11. Адзначце словы, у якіх пішацца **ў** (у нескладовае):
1) з’ява _нікальная, 2) а_тамат, 3) ваку_м,
4) выпукла-_вагнуты, 5) мане_р.

12. Адзначце словы, у якіх пішуцца прыстаўныя галосныя:
1) ранішняя _мгла, 2) на _льдзіне, 3) пры_мчацца,
4) алей _льняны, 5) новыя _льготы.

13. Адзначце словы, у якіх пішацца спалучэнне ***ія(ыя)***:
1) ід_логія, 2) б_логія, 3) рад_станцыя,
4) _нічнае мора, 5) д_фрагма.

14. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) фортэ, 2) Ватэрлоо, 3) васямнаццаць,
4) арнамент, 5) кратэр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

15. Адзначце правільна напісаныя словы:

1) аўдыенцыя, 2) дыяметр, 3) заіржавець,
4) фраў, 5) раяль.

# Правілы напісання зычных

## *Правапіс звонкіх і глухіх зычных, шыпячых і свісцячых*

*23. Змяніце словы ці падбярыце аднакаранёвыя словы так, каб выдзелены зычны знаходзіўся ў моцнай пазіцыі.*

Малодшы, дзежка, інструктаж, дзядзька, ледзь, вузкі, грыб, просьба, штаб, загад, грып, ёт, ёд, лясгас, Об, сэрвіс, сервіз, холад, лыжка, глотка, жэмчуг, рэкорд, дэлегат, матавоз, рэдказубы, повязь, Прыпяць, яцвяг, ёгурт, мільярд.

*24. Размяркуйце словы па групах: 1) звонкі зычны пішацца ў канцы слова; 2) звонкі зычны пішацца ў сярэдзіне слова перад глухім; 3) глухі зычны пішацца ў сярэдзіне слова перад звонкім; 4) шыпячы пішацца перад свісцячым; 5) свісцячы пішацца перад шыпячым. Сфармулюйце правілы напісання такіх зычных.*

Чэшскі, касьба, завод, маянэз, лёгка, перапісчык, вупраж, тыраж, стужка, ксёндз, добрушскі, малацьба, рыбка, пясчаны, казка, Парыж, рыжскі, вылезці, жолуд, крыжадзюб, смяешся, дождж, нясвіжскі, носьбіт, глог, дэвіз, бэз, перавязь, чародка, лад.

*Параўнайце вымаўленне і напісанне слоў.*

*25. Прачытайце сказы. Растлумачце правапіс зычных у выдзеленых словах. Змяніце гэтыя словы так, каб зычныя сталі ў моцную пазіцыю.*

1) Беларусу і ў Парыжы сняцца белізна ***бяроз*** і сосен ***медзь*** (П. Панчанка). 2) Будуць давеку крыніцы на гэтай зямлі, будзе давеку наш мужны і мудры, вялікі ***народ*** (Н. Гілевіч). 3) ***Дуб*** і той, калі ў полі адзін, не заўсёды адольвае буру (А. Бачыла). 4) Калі ў чалавека няма любові, самому чалавеку ***цяжка*** і з ім ***цяжка*** (Г. Марчук). 5) Зямля – мая калыска, табе адной відаць, што ***немагчыма нізка*** ні падаць, ні лятаць (Я. Янішчыц). 6) Шчасце ў кожнай тваёй перамозе, шчасце – адолець і вецер і ***град***, шчасце – нідзе не спыняцца ў дарозе, ***спынішся*** – плынню адгоніць ***назад*** (С. Грахоўскі). 7) Найбольш трывалае шчасце – у сумленным выконванні

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

***абавязку*** (Я. Брыль). 8) Піце з чыстай крыніцы, з напеваў ***матчыных***, сцеражыцеся, хлопцы, частушкі таннай, паважайце, любіце бацькоўскую ***спадчыну*** – усё сплыве, а легенда і песні застануцца (У. Караткевіч). 9) Ды горшае – гэта сціранне ***меж*** паміж непрыяцелямі і сябрамі (А. Вярцінскі). 10) Не срэбра шчырае, шчырае слова – галоўны ***скарб*** наш у свеце часовым (Р. Барадулін).

*26. Устаўце патрэбную літару.*

Фу..бол, апафео…, бара…ьбіт, абру…, баске…бол, ва…зал, ай…берг, э…замен.

*Растлумачце значэнне слоў.*

*27. Устаўце **з**, **с** або **ш**.*

Бру…чатка, ва..чыць, выпе..чаны, гу..чар, гру…чык, дано…чык, зра…чэнне, мя…чанства, ні…чымны, невіду…чы, во…чык, пя…чаны, пя…чотны, разно..чык, ра…чоска, ра…чуліць, ра…чыніць (цеста), ра…шпіліць, ра…чыніць (вокны), у…чуваць, у…чыльную, у…чэнт, …часлівы, рэ…чыцкі.

*28. Устаўце **ж** або **дж**.*

Амала…энне, бра…энне, вярблю…ы, мядзве…ы, прадугле…ваць, прахо…ы, гара…анін, са…анцы, працэ…ваць, праяз…аць, прыез…ы, перапу…аць, сала…ава, у…аліць, ула…ваць, ура…энец, ура…ай.

## Правапіс зычных д, т і дз, ц

*29. Устаўце **д** ці **дз**.*

І..(э,е)аліст, …(ы,і)ктатура, ін…(ы,і)ец, мун…(ы,і)р, ін…(э,е)ец, прэзі…(ы,і)ум, і…(э,е)аграфія, …(ы,і)ягназ, …(ы,і)рван, хін…(ы,і).

*Растлумачце значэнне слоў.*

*30. Устаўце **т** ці **ц**.*

Аван…(у,ю)рыст, …віст, ча…вер, скеп…(ы,і)к, на…(у,ю)рморт, пражэк…(о,ё)р, жаке…(ы,і)к, увер…(у,ю)ра, э…(ы,і)кет, па…(э,е)фон.

*Растлумачце значэнне слоў.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

*31. Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс **д**, **т** і **дз**, **ц**.*

Командировка, теорема, активный, тюль, аплодисменты, дирижер, подвиг, кандидат, делегат, телефон, тираж, технический, методика, Тадеуш, Гарибальди, Тереза, Матвей, Дели, Витебск, Братислава, Стендаль, Данте, сатира, метель, пластика, митинг, десант, диктант, батистовый, мотив, триптих, медицина, в саду, подвязать, дикция, двери, десерт, гвоздь, деликатес.

## Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

*32. Перакладзіце словы на беларускую мову. Супастаўце вымаўленне і напісанне спалучэнняў зычных у рускай і беларускай мовах.*

Немилосердно, баластный, разостланный, солнечный, постный, контрастный, Шмидт, лестница, проездной, Гумбольдт.

*Назавіце спалучэнні, правапіс якіх адрозніваецца ў рускай і беларускай мовах.*

*33. Прачытайце сказы, растлумачце правапіс спалучэнняў зычных у выдзеленых словах.*

1) Лаві не ўласнай славы промні, а ***сонца*** кожнае душы (П. Панчанка). 2) Калі ты нават ***нешчаслівы***, надзею ў ***сэрцы*** не губі (А. Астрэйка). 3) Хто навучаны болем – маліцца часцей – і маленькаму шчасцю быў ***радасна*** рады (В. Аколава). 4) Значная чалавечая асоба звычайна не крычыць пра сябе на ўсіх скрыжаваннях. Сціпласць для яе – часта неўсвядомлены спосаб абароны сваёй значнасці, боязь раўнадушнай людской цікавасці, ***помслівай*** зайздрасці і непавагі (М. Стральцоў). 5) На хісткай кладцы ты не ***пахіснія***, калі прайсці патрэбна напрасткі (С. Грахоўскі). 6) Не гіне род майстроў нажывы, а я малюся аб адным: не дай мне, Божа, стаць ілжывым, ***зайздросным***, ***злосным*** і старым (П. Панчанка). 7) Кожнаму з нас лёс адводзіць свой зямны куток, дае бясцэнны дар жыцця і непаўторную матчыну ласку, родную мову і святое адчуванне ***ўласнай*** годнасці (Г. Бураўкін). 8) Чалавечнасць, як вечнасць, твой бязмерны ***маштаб***! (П. Макаль). 9) Усё больш думаю пра адказнасць паэта, і для мяне самае галоўнае ў паэзіі – праўда жыцця, праўда пачуццяў маіх ***сучаснікаў***, чалавечнасць (П. Панчанка). 10) Паэт – ***равеснік*** усім пакаленням (Р. Бярозкін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных

*34. Перакладзіце словы на беларускую мову. Растлумачце правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных.*

Отблеск, образный, орган, обострённый, отмель, оптом, остров, охра, окись, опера, оптика, заочник, околица, узел, взвод, взмах, узор, укол, влево, уникум, угольник, ученик, вдоль, врассыпную, вьюн, этот, этика, эй, эпос, экстренный.

*35. Разгледзьце алгарытм правапісу прыстаўной літары* **в***. Дапоўніце алгарытм прыкладамі.*




*36. Дапішыце, дзе неабходна, прыстаўны або ўстаўны зычны* **в***.*

На…обмацак, …ольха, …астрэйшы, …устрыца, за…улак, …ужака, …уздэчка, …узкаваты, па…уцінне, …уголле, …унія, Лары…он, за…облачны, …удзільна, …уда, аб…углены, чарна…усы, …омнібус, …орыва, …охра, …опіум, трох…угольны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*37. Устаўце прапушчаныя літары. Сфармулюйце правілы іх правапісу.*

1) Першае слова, якому трэба …учыць дзяцей і прэзідэнтаў, – Мір! (П. Панчанка). 2) За..орваю сляпога зла быльнёг – у гэтым соль жыццёвага закону (З. Марозаў). 3) Да скону пчолам бараніць свой …улей, свой сподак працы, сонца і дажджоў (Н. Мацяш). 4) Час у маленстве вымяраецца днямі. Два, тры гады таму назад – …эта ўжо вельмі многа, а тое, што было да нас, да нашага ўступлення ў свядомасць – ужо і на…огул легенда (Я. Брыль). 5) Не …усцішна ні за сябе, ні за радню, ні за сябрыну, ні за бяссілую Айчыну: хіжак ёй печань не дзяўбе. Бо годны шлях, і ланцугі сарваны з духу, і рух разгортвае абсяг бязмежжа за вяршыняй скрухі… (Н. Мацяш). 6) Як самую звонкую ў свеце на…уку, як ройных вякоў пчаліную складчыну, прымаю па складу, па смаку, па гуку мову маю матчыну! (П. Макаль). 7) Я не развітваюся з моваю: яе не выкрасліць з душы ні пастановаю, ні змоваю, навіда…оку і ў цішы (С. Грахоўскі). 8) Бадзёры звон …асенняга званца мяне ўспамінам веснім саграваe (З. Марозаў). 9) Травой траву ніколі не стрымаеш, і ветрам ветру, мусіць, не спыніць, і полымя не спаліш у …агні… (Я. Сіпакоў). 10) Пароль неўміручасці – родная мова. Рассуньцеся, часу перагародкі: вядуць, як суседзі праз …окны, размову Учора і Заўтра, патомкі і продкі… (П. Макаль).

## Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных

*38. Устаўце, дзе неабходна, літары.*

Абсцыс…а, кел…я, маладуш…а, мал…юск, ***мас…аж***, Мек…а, міс…іс, па..чарыца, па…цвердзіць, паэтэс…а, перадплеч…а, ***пес…імізм***, пер…он, ***пpагрэс…***, ***прымадон…а***, прэс…-служба, рас…тацца, рас…трэл, рос…тань, сес…ія, старасве…чына, стэл…аж, тэн…іс, ***чул…івасць***, шас…і.

*Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.*

*39. Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс падоўжаных і падвоеных зычных.*

Касса, программа, судья, затишье, новелла, грязью, Полесье, чтение, гамма, ванна, пятьюдесятью, бассейн, аллея, территория, аттракцион, аккорд, печью, корреспондент, аффикс, интеллигентный, Алла, Анна, Жанна, Ефросинья, Инесса, Наталья, Стелла, Татьяна, Ульяна, Апполон, Илья, Диккенс, Руссо, Третьяков, Бонн, Ницца, Полесье, полесский, Уручье.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*40. Спішыце сказы, устаўце прапушчаныя літары.*

1) Эф…ект творчасці: з цягам часу тое, пра што пішаш, становіцца тым, як пішаш (А. Разанаў). 2) Жыц…ё – шляхоў і рэк падабенства: рух падарожны распачынае юнацтва наша з крыніц маленства і ў акіян небыц…я ўпадае (А. Куляшоў). 3) Любая прафес…ія заўсёды была і будзе прывадам, што злучае чалавека і грамадства (М. Стральцоў). 4) Сярод людзей пануе адчужэн…е, і ахінае нас духоўны смог (З. Марозаў). 5) Усякі, нават геніяльны паўтор – гэта ёсць бяс…іл…е непаўтору (Я. Скрыган). 6) Не страшны боль, не страшна смерць, страшней застацца без кахан…я, у адзіноце анямець, любімай не пачуць дыхан..я (П. Панчанка). 7) Радзіма – дол і паднябес…е тое, дзе ходзіць слова Бога пехатою (Р. Барадулін). 8) Не люблю ап…лікацыі ні ў паэзіі, ні ў прозе, калі і хаты, і дрэвы, і людзі, і нават сонца здаюцца быц…ам бы наклеенымі – няма ў іх аб'ёмнасці, шматмернасці, глыбіні, гульні светаценяў на блізкіх і далёкіх планах. І мова герояў таксама тады здаецца наклеенаю. А хочацца жывых людзей, жывой мовы (Я. Сіпакоў). 9) І б'е па сэрцах даўкай хваляй стрэс… (З. Марозаў). 10) Душою не крыві, бо чалавечы век усё ж кароткі, і водгул…ем у кожнага ў крыві азвацца могуць прашчуры і продкі (С. Грахоўскі).

## Кантрольныя заданні

*41. Знайдзіце пятае лішняе.*

1) амніс…(ы,і)я, гілья…(ы,і)на, пан…(э,е)он, паш…(э,е)т, факуль…(э,е)т;

2) бамбар…(ы,і)роўшчык, …(ы,і)спетчар, Ні…(э,е)рланды, кан...(ы,і)цыянер, …(э,е)густатар;

3) …астрыць, …устрыца, …оканне, еса…ульскі, …востраў;

4) Аксін…я, Іл…я, Жан..а, Ган..а, Тац…яна;

5) двукос…е, дон…а, суд…я, Мек…а, пан…о.

*42. Назавіце адным словам.*

1) адступнік ад догматаў пануючай рэлігіі; 2) паслядоўнік старажытнаіндыйскага вучэння аб метадах і прыёмах кіравання псіхікай; 3) кароткая фраза, у якой выражаецца кіруючая ідэя паводзін або дзейнасці; 4) памяшканне для вучэбнай стральбы; 5) музычны твор віртуознага характару; 6) галава царкоўнай акругі ў праваслаўнай царкве; 7) надпіс на ніжняй частцы кадра фільма з перакладам тэксту; 8) храматычны гармонік з клавіятурай фартэпіяннага тыпу для правай рукі; 9) суджэнне або вывад з двума ўзаемавыключальнымі палажэннямі, з якіх неабходна выбраць адно, бо трэцяе немагчыма; 10) асоба, якая кіруе хорам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэст

1. Адзначце словы, у якіх пішацца ***д***:
   1) па_кладка, 2) поез_, 3) даве_ка,
   4) фу_бол, 5) ха_ка.

2. Адзначце, у якіх словах пішацца ***з***:
   1) про_ьба, 2) ля_к, 3) калы_ка,
   4) бяро_ка, 5) паў_ці.

3. Адзначце словы, у якіх пішацца ***б***:
   1) ла_ка, 2) ру_чык, 3) штам_,
   4) дро_, 5) слу_.

4. Адзначце словы, у якіх пішацца ***ц***:
   1) універсі_(э, е)т, 2) Палес_(ы, і)на, 3) нак_(у, ю)рн,
   4) я_вяг, 5) у Лі_ве.

5. Адзначце словы, у якіх пішацца ***дз***:
   1) по_віг, 2) _(ы, і)настыя, 3) _(ы,і)рван,
   4) мун_(ы, і)р, 5) мар_він.

6. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:
   1) рас…цяліць, 2) ра…сол, 3) запоз…нена,
   4) сэр…ца, 5) лімон…ы.

7. Адзначце словы, у якіх пішацца ***нн***:
   1) Но_а, 2) па_а, 3) і_авацыя,
   4) безыме_ы, 5) Ефрасі_я.

8. Адзначце словы, у якіх пішацца ***цц***:
   1) трыцца_ю, 2) ку_я, 3) Закарпа_е,
   4) пі_эрыя, 5) пя_і.

9. Адзначце словы, у якіх пішацца ***ш***:
   1) ра_чыніць (цеста), 2) да_чэнту, 3) ра_чараваццa,
   4) бя_шумны, 5) ра_шчодрыцца.

10. Адзначце словы, у якіх пішацца ***с***:
   1) ра_чысціць, 2) у_чуваць, 3) ня_часны,
   4) францу_скі, 5) _шыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11. Адзначце словы, у якіх не пішуцца прыстаўныя зычныя:
   1) _опера, 2) _окіс, 3) еса_ул,
   4) Матэ_уш, 5) _улада.

12. Адзначце словы, у якіх пішуцца прыстаўныя зычныя:
   1) _ачамі, 2) _одум, 3) _урна,
   4) за_очны, 5) _(У, у)мань.

13. Адзначце словы, у якіх прапушчана літара:
   1) бязлітас_на, 2) Шмі_т, 3) латы_скі,
   4) рас_таноўка, 5) балас_ны.

14. Адзначце правільна напісаныя словы:
   1) каранцін, 2) Мардзвінаў, 3) Целяханы,
   4) мярцвяк, 5) літвін.

15. Адзначце правільна напісаныя словы:
   1) кантрасны, 2) Брандт, 3) міласэрднасць,
   4) капустны, 5) маштаб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Правапіс мяккага знака і апострафа

*43. Абапіраючыся на схему, сфармулюйце правілы напісання раздзяляльнага мяккага знака і апострафа, у якасці прыкладаў выкарыстоўвайце прыведзеныя словы.*




Аб'ява, Аркадзьевіч, браканьер, б'юцца, вераб'і, Грыгор'еў, дасье, інтэрв'ю, каньён, Карбюзье, мільён, надвор'е, парцье, Соф'я, трох'ярусны, уз'яднанне, Х'юстан, цэхячэйка, шмат'ядзерны, шчаўе.

*44. Назавіце словы, у якіх: 1) на месцы пропуску трэба пісаць мяккі знак; 2) апостраф пішацца пасля прыставак на зычны; 3) на месцы пропуску нічога не пішацца.*

Аб...інець, ад…езд, бар...ер, В...етнам, дзярж...юрвыдавецтва, кал...е, Кандрац...еў, кан...як, малакроў...е, між...ярусны, Н...ю-Ёрк, пас...янс, п...юць, пагалоў...е, рэл...еф, салаў...і, суб...ект, саф...ян, сям...я, шмат...ёмісты.

*45. Запоўніце табліцу. Падкрэсліце літару, якая папярэднічае мяккаму знаку ці апострафу.*

| мяккі знак | апостраф |
|---|---|
| | |

Аб..ём, Амудар..я, Афанас..еў Іл..я Арсен..евіч, батал..ён, Васіл..еўскі востраў, Лук..ян Пракоф..евіч Дзям..янаў, з..есці, з..ява, кастан..еты, Кас..ян, куп..ё, Лавуаз..е, Вен..ямін, мадз..яры, Мал..ер, Мантэг..ю, міл..ярд, манпас..е, нал..ю, парц..еры, п..яўка, разал..ю, сен..ёр, сузор..е, Ул..яна Кандрац..еўна.

*46. Назавіце адным словам.*

1) артыст, які вядзе канцэртна-эстраднае прадстаўленне, аб'яўляючы нумары праграмы і займаючы гледачоў у перапынках паміж нумарамі; 2) асоба, якая праходзіць навуковую стажыроўку; 3) асоба, якая жыве на працэнты з аддадзенага ў пазыку капіталу, з даходаў ад акцый, аблігацый і інш.; 4) ваеннаслужачы пры камандзіры для выканання службовых даручэнняў; 5) ваенны або ўрадавы кур'ер для дастаўкі важных, сакрэтных папер; 6) саюз, аб'яднанне дзяржаў або арганізацый на аснове дагаворных абавязацельстваў; 7) сукупнасць умоў, становішча, абставіны, якія склаліся ў той ці іншай галіне дзейнасці і ўплываюць на ход якіх-небудзь падзей, спраў; 8) унутраная частка будынка, памяшканне, архітэктурна і па-мастацку аформленае; 9) упрыгожанне ў выглядзе невялікага малюнка ў пачатку або ў канцы кнігі, раздзела; 10) частка войска, якая знаходзіцца ззаду галоўных сіл, каб абараніць іх ад нападу з тылу.

**Словы для даведак**: ад..юнкт, ад..ютант, ал..янс, ар..ергард, він..етка, інтэр..ер, канферанс..е, кан..юнктура, ранц..е, фельд..егер.

*47. Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце. Растлумачце правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.*

Бильярд, варьете, воробьиный, двухъярусный, Заднепровье, здоровье, Ивье, Игнатьев, компьютер, копьё, Лаврентьев, Льеж, Марьина Горка, медальён, объединять, объектив, павильён, подъёмник, предъявить, Приамурье, Приазовье, пьедестал, пятиборье, разъезд, разъярённый, Сантьяго, Севилья, Соловьёв, фельетон, Юрьев.

*48. Аб'яднайце прыведзеныя словы ў групы ў адпаведнасці з умовамі напісання мяккага знака: 1) мяккі знак абазначае мяккасць зычных на канцы слова; 2) мяккі знак абазначае мяккасць зычных перад цвёрдым зычным; 3) мяккі знак абазначае мяккасць зычных перад мяккім зычным; 4) мяккі знак не пішацца.*

Ас..вятлен..не, барац..ба, вішан.., вос..мы, гус.., дзен., дз..ме, іл..няны,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ін..шы, крыл..ле, лял..ка, маз.., натхнен..не, па прос..бе, печ.., раз..бяр, с..мятана, філ..тр, хадз..ба, ц..мяны, эмул..сія.

*49. Падбярыце па 2–3 прыклады і праілюструйце кожнае палажэнне.*

- Мяккі знак пішацца
  - у дзеясловах
    - у неазначальнай форме
    - у форме 3-й асобы
    - у форме загаднага ладу
    - перад постфіксам ***-ся***
  - у назоўніках
    - перад канчаткам ***-мі*** ў форме творнага склону множнага ліку
    - перад суфіксамі ***-к-, -чык-***
  - у складаных лічэбніках
  - у прыметніках
    - з суфіксам ***-еньк-, -аньк-, -эньк-***
    - перад суфіксам ***-ск-***
  - у постфіксе ***-сьці***

*50. Закончыце фразы, праілюструйце іх прыкладамі.*

а) мяккі знак пішацца пасля зычных…

б) мяккі знак пішацца ў назоўніках перад суфіксамі ***-к-, -чык-,*** калі…

в) мяккі знак пішацца перад суфіксам ***-ск-*** у прыметніках, калі…

*51. Утварыце ад назоўнікаў прыметнікі з дапамогай суфікса* ***-ск-****. Растлумачце правапіс мяккага знака.*

Брусель, Версаль, Канстанцінопаль, Капыль, Кубань, Лукомль, Обаль, Тамань, Пнампень, Свержань, Суздаль, Сызрань, Умань, Цзіньчуань, Цзяньмынь.

*Якія з гэтых геаграфічных назваў можна знайсці на карце Беларусі?*

*52. Запішыце форму 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу наступных дзеясловаў. Растлумачце правапіс мяккага знака.*

Адзець, адсунуць, адрэзаць, астыць, дастаць, ехаць, забяспечыць, заносіць, сэканоміць, марозіць, наладзіць, праверыць, прыгалубіць, сустрэць, траціць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*53. Перакладзіце словы на беларускую мову, вызначце адметныя асаблівасці напісання мяккага знака ў беларускіх і рускіх словах.*

Восьмью, зверь, июльский, меньше, мышь, Нарочь, насыпь, несёшь, нянчить, осмотрись, отрежьте, пятьюдесятью, семьсот, степь, твёрдый.

*54. Размяркуйце словы ў табліцу, аргументуйце свой выбар.*

| пішацца **ь** | не пішацца **ь** |
|---|---|
| | |

Балон..чык, бац..кі, вас..мюстамі, відэл..цы, вясел..ле, дз..веры, дзес..ці, дзец..мі, дз..мухавец, завес..ся, збуц..велы, з..зян..не, камус..ці, кон..скі, ліс..це, людз..мі, нос..біт, нян..кі, ноч.., памнож..це, песен..ка, піс..мо, подпіс.., прайс..ці, проц..ма, пяц..дзясят, рамен..чык, рыжан..кі, рэдз..ка, с..ветлыя, сем..дзесят, сінен..кі, старэн..кі, сядз..ма, хрэс..біны, чамадан..чык, час..цей, чац..вёрты, штос..ці, яблын..ка.

## Кантрольныя заданні

*55. Знайдзіце чацвёртае лішняе.*

1) адхлын...це, з'еш...це, кроч...це, насып...це;
2) раёны Гомел...скі, Любан...скі, Скідал...скі, Чэрвен...скі;
3) пяц...сот, шэсц...сот, восем...сот, дзевяц...сот;
4) вагон…чык, карэн…чык, прамен...чык, струмен...чык.

*56. Запішыце фразеалагізмы, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф. Патлумачце, у якім кантэксце ўжываюцца гэтыя ўстойлівыя выразы.*

Барабаніц... кас..ц...мі; вераб...ю па калена; вось табе, бабка, і Юр...еў дзен...; гул...ня ў бірул...кі; дзе ты дзенеш...ся; дз...муц... у адну дудку; Дзям...янава юшка; з вераб...ёў нос; за абедз...ве шчакі; за сям...ю замкамі; залівацца сляз...мі; заходз...це на аген...чык; з...ес...ці пуд солі; з...ехаць з глузду; іс...ці па лініі наймен...шага супраціўлен...ня; кідацца рап...ём у вочы; куды вецер дз...ме; ламаць коп...і; ледз...ве дыхаць; мерац... ас...мінай; мядз...ведз... на вуха наступіў; на казе не пад...едзеш…; наводзіц... цен... на с...ветлы дзень; не воз...меш... за руб... дваццац...; ні бол...ш ні мен...ш; сам д...ябал галаву скруціц...; у двукос…сі; як дзядз...ка ў Віл...ні.

*Якія з прыведзеных фразеалагізмаў: а) паходзіць з літаратурнага*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*твора, хто яго аўтар; б) сваім паходжаннем звязаны з гістарычным фактам; в) з'яўляецца сінонімам фразеалагізма* ***пераліванне з пустога ў парожняе****; г) мае значэнне 'мала'; д) мае значэнне 'многа'; е) характарызуе важнага і строгага чалавека, да якога цяжка падступіцца?*

## Тэст

1. Адзначце правільныя сцвярджэнні:

   1. Раздзяляльны мяккі знак, як і апостраф, паказвае на раздзельнае вымаўленне зычнага і наступнага галоснага.
   2. Апостраф не можа пісацца пасля літар ***л, н, з, с, дз, ц***, бо пасля іх пішацца мяккі знак.
   3. Змякчальны мяккі знак пішацца ў прыслоўях, утвораных ад прыметнікаў з суфіксамі ***-аньк-, -еньк-, -эньк-.***
   4. Змякчальны мяккі знак пішацца перад суфіксам ***-ск-*** толькі ў прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў на ***-нь***.
   5. Змякчальны мяккі знак не пішацца паміж літарамі, якія абазначаюць падоўжаны гук [л'].

2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца раздзяляльны мяккі знак:

   1) сем...янін; 2) аб...яднанне; 3) канферанс...е;
   4) кампан...ён; 5) суб...ект.

3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца апостраф:

   1) л...ецца; 2) п...еса; 3) шчаў...е;
   4) бракан...ер; 5) Соф...я.

4. Адзначце слова, у якім на месцы пропуску нічога не пішацца:

   1) В...етнам; 2) Сырдар...я; 3) Заслаў...е;
   4) Дзям...ян; 5) Юл...ян.

5. Адзначце рады, у якіх ва ўсіх словах на месцы пропуску пішацца апостраф:

   1) бар...ер, б...юцца, бракан...ер;
   2) двукроп...е, двукос...е, двух...ярусны;
   3) кан...юнктывіт, кар...ерыст, кур...ёз;
   4) мнагаслоў…е, між...ярусны, мадз...яр;
   5) пад...ёмны, п...яўка, пад...езд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца змякчальны мяккі знак:
   1) воз...меш; 2) тол...кі; 3) восем…дзясят;
   4) чамус...ці; 5) мен...шы.

7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску мяккі знак пісаць не трэба:
   1) с...мех; 2) голуб...; 3) нос...біт;
   4) іс...ці; 5) кон...мі.

8. Адзначце рады, у якіх ва ўсіх словах на месцы пропуску пішацца мяккі знак:
   1) вяз…мо, ваз...мі, восен…скі;
   2) дз...ве, у дзядз...кі, добран...кі;
   3) зац...менне, запаведз..., збол...шага;
   4) смял…чак, соцен...ка, смаргон...скі;
   5) на хуткас...ці, ціхен...ка, цюмен...скі.

9. Знайдзіце «лішняе» слова і запішыце яго:
   ін…екцыя, кан.. юнкцыя, н...юанс, мыш...як, суб…ектывізм.

10. Знайдзіце слова, у якім дапушчана памылка і запішыце яго правільна:
   астраханскі, лепельскі, смаргонскі, цянь-шаньскі, чэрвеньскі.

## Правапіс прыставак

*57. Прачытайце сказы, параўнайце вымаўленне і правапіс прыставак у вылучаных словах.*

1) Дно ў чалавека заўсёды відаць, і рух увесь яго як на далоні; і гэтым вось і вядома, што там ні з чым непараўнальная тонкасць і ***бясконцы*** рух – як бы гэта свет знайшоў для сябе вечнае і адзінае люстэрка (К. Чорны). 2) Для ***стварэння*** лепшых пакаленняў трэба помніць гора ўсіх (П. Панчанка). 3) Дружба, не ***зведаўшая*** ліхалецця, слава без працы мазольнай, упартай, слова, якое не грэе, не свеціць, – нічога не варты (М. Танк). 4) Узіраешся ў побыт – бы ***расчытваеш*** почырк чужы, незнаёмы. Зноў і зноў намагаешся ўцяміць сэнс кожнага знака – інакш застанецца замкнёны сэнс і слова, і тэксту ўсяго (Н. Мацяш). 5) З горнай вяршыні не ***сходзіць*** туман, з вернага сэрца – любоў (М. Танк). 6) Дыстанцыя ў часе дае пэўную аб'ектыўнасць у стаўленні да ***зробленага*** самім табою (Я. Брыль). 7) Як можна дапамагчы сапраўднаму таленту? Па-першае, не пабаяцца ***сказаць*** яму, што ён талент. А па-другое, ***стрымаць*** тых, хто абавязкова хоча пашкодзіць яму працаваць (Я. Сіпакоў). 8) Жыццё – ***ступанне*** па канаце пад ***зменлівым*** скляпеннем неба: ***скульнешся***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўправа, а ці ўлева – і так, і гэтак разаб’ешся… (Н. Мацяш). 9) О чалавек, у сквапнасці ***бясконцай*** ты можаш патушыць аднойчы сонца, яго ад нас ужо хавае смог (З. Марозаў). 10) Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё ***згубіў*** (У. Караткевіч).

*58. Устаўце **з** ці **с**.*

Ра…кідаць, …біць, ро…піс, …даць, ро…шукі, …несці, …ыграць, і…ноў, у…няць, у…біцца, і…пыты, ро…галас, у…хваляць, бя…межны, бе…’языкі, небя…грэшны, небе…карысны, абе…галосець, абя…грошыць, пра…мерны, цера…палосіца, ра…’езд, …’інець, …ымправізаваць, абя…шкодзіць, ра…’юшаны, бя…’ядзерны, …кінуць, …хапіць, бе…падстаўны, …’ялчэць, абя…кровіць, ро…чырк, …эканоміць, …ыначыць.

*59. Складзіце сказы з прапанаванымі словамі, растлумачце адрозненне ў лексічным значэнні слоў.*

Зысці – сысці, зысціся – сысціся, зыходзіць – сыходзіць, зыходны – сходны, сыходны, зыход – сход.

*60. Спішыце словы, выдзеліце прыстаўкі, растлумачце іх правапіс.*

Дызасацыяцыя, дызартрыя, дыз’юнкцыя, дысгармонія, дыспрапорцыя, дыскваліфікаваць, дысфункцыя, дыскрэдытаваць, дыскамфорт, дэзактывацыя, дэзарыентацыя, дэзурбанізацыя.

*Якое значэнне маюць прыстаўкі **дыз- (дыс-), дэз-**?*

*61. Выпішыце словы з прыстаўкамі, якія заканчваюцца на **б** і **д**, растлумачце іх вымаўленне і правапіс.*

1) Адвыклі мы ад простых добрых слоў і пераўжоўваем старыя ісціны… (П. Панчанка). 2) Дрэвы паміраюць, калі перастаюць пазнаваць змены года і не адгукаюцца рэхам; вада – калі забывае, куды ёй плыць, і нікому не спатольвае смагі; зямля – калі перастае радзіць хлеб і быць калыскай песняў; чалавек – калі страчвае здольнасць здзіўляцца і захапляцца жыццём (М. Танк). 3) Багата песняроў на Белай Русі, не ўсім даецца талент адкрыцца (З. Марозаў). 4) Нам усім не хапае спагады, і любові жывым не стае… Нам адпушчана так небагата, што й грахі не запомніш свае (А. Пісьмянкоў). 5) Душою прадчуваю час дабра, хоць не пазнаў усіх зямных сакрэтаў (З. Марозаў). 6) Жыццё – бязмернае і неабдымнае, і перад адчуваннем яго нішто абшары свету, і сэнс яго – у радасці; адчуваючы смутак, істота адчувае і не забывае, што існуе радасць і што ў ёй і ў вечным імкненні да яе – апраўданне жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(К. Чорны). 7) Песня помніць: адступіся яна ад людское душы – і ўжо не ўберагчы анічым чалавека (Н. Мацяш). 8) Каханне – ёсць мудрасць, якую Бог людзям адкрыў, каб грахі дараваць (Э. Акулін). 9) Душа беларуса – вечная ка́ня, якая адводзіць бяду ад гнязда… (Р. Барадулін). 10) Хоць свой відушчы посах надтачыў, аб камяні не раз я сэрца раніў (З. Марозаў).

*62. Да дзеясловаў незакончанага трывання падбярыце дзеясловы закончанага трывання, звярніце ўвагу на правапіс прыставкі.*

Абрываць, адсылаць, раздзіраць, абганяць, падганяць, адпіхваць, зрываць, надгінаць, збіраць, разрываць, абдзіраць, згінаць, абзываць, адрываць, абтыкаць, адсыпацца, падбіраць, рассылаць, здзіраць, узбірацца.

*63. Спішыце сказы, знайдзіце словы з падвоенымі зычнымі, растлумачце правапіс.*

1) Вялікая сімфонія свету – гэта цішыня, бо калі б на хвіліну аддзяліцца ад зямлі і падняцца ў іншую сферу свету – што, апроч успамінаў, астанецца ад таго, што называецца чалавечымі клопатамі? (К. Чорны). 2) Я на зямлю не для таго прыйшоў, каб жменяй поўнай уцехі браць. Я – аддаваць люблю (Н. Гілевіч). 3) Дзень, што без дружбы й любві пражыты, знікне бясследна, навекі забыты (М. Зарыцкі). 4) Ад кахання да расстання – дарога тая, што праз нас (В. Аколава). 5) Пакіньце цішу вуснам і вачам, аддайце неба зорам і каханым (Я. Янішчыц). 6) Ёсць замест прыватнай неўміручасці – бессмяротнасць нацыі тваёй (У. Караткевіч). 7) Гэта – мудрая тайна жыцця – жыць аддана да забыцця (С. Грахоўскі). 8) Калі чалавек у масе, ён невідочны, але ён бессмяротны (В. Іпатава).

*64. Дзве літары ці адна?*

Рас…ольнік, з…аду, з…елянелы, рас…аднік (‘тое, што з’яўляецца крыніцай чаго-небудзь’), контр…азведка, звыш…татны, транс…ібірскі, над…аць, бяз…орны, ір…эальны, ім…іграцыя, ад…алены, рас…ыпаць, раз…лавацца, рас…ол, ус…аджваць, рас…ада, рас…аднік (‘месца, скрынка для вырошчвання расады’), Над…вінне, с…івелы.

*65. Устаўце патрэбныя спалучэнні (**сч**, **сш**, **сшч, зж**, **здж** або **шч**).*

Ра…ахляць, ра…ырэнне, ра…аць, ро…ына, ра…ыніць (дзверы), …апіць, ні…ымны, бе…алавечны, бя…улы, бя…любны, ра…апіць (раз’яднаць), ра…ыць, ра…ыніць (паставіць цеста), ра…умецца, …ытак, ра…пілены, у…уванне, бя…кодны, ра…чапіць (раскалоць), ра…одрыцца,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

…арэлы, бе…урботна, бе…ыццёвы, …ысціць, у…уваць, ра…эсваць, ра…ыцца, бя…умна.

*66. Устаўце* ***а*** *ці* ***у****.*

С…сед, с…існаваць, с…слоўе, с…наймальнік, с…сватаць, с…ладдзе, с…курснік, с…вязны, с…іскальнік, с…межжа, с…дружнасць, с…апякун, с…працоўнік, с…ўдзел, с…выканаўца, с…звоньвацца, с…зіральнік, с…стракаць, с…суд, с…купны, с…служывец, с…праць, с…мяшчальнік, с…праўдны, с…пярэчлівасць, с…месна, нас…перак.

*67. Устаўце* ***е (я)*** *ці* ***і****.*

1) Кліча цябе н…спакойнае шчасце, толькі хутчэй да яго даплыві (С. Грахоўскі). 2) Мяне на зямлі, як малітва, трымае н…абдымнае неба кахання твайго (З. Марозаў). 3) Агонь і слова – гэта адкрыцці, якім н…лёгка роўных падшукаць (А. Зарыцкі). 4) Хай там узлёт ці падзенне, удача ці н..ўдача, – толькі ні дня без падзеі, без радасці і плачу (А. Вярцінскі). 5) Ад кожнай чарговай вясны чагосьці н…бывалага не патрабуем, абы толькі яна была сама сабою (Я. Брыль). 6) Навек астанешся ты песняй н…спетай, мая Беларусь (А. Бачыла). 7) Н…ўжо жыццё на тое нам даецца, каб спапяліць у дробных спрэчках сэрца і ціха ў н…вядомасці спачыць? (З. Марозаў). 8) Адольваючы моцную даўно спакуслівую сэрцу іншароднасць, н…простая, як свет, людская годнасць па рысачцы складаецца адной (Л. Тарасюк). 9) Н…хто чалавека не тыраніць больш, чым ён сам сябе (В. Быкаў). 10) Чалавек па натуры сваёй – шукальнік. Цягне яго н…вядомае і новае, таемнае і н…зведанае (У. Дамашэвіч).

## ☑ Кантрольныя заданні

*68. Прачытайце тэкст. Знайдзіце словы з прыстаўкамі, растлумачце іх правапіс.*

Што гэта за чалавек беларус? Што гэта за народ? Уласна кажучы, адказаць на гэта пытанне дужа цяжка. Гэта задача амаль невырашальная...

Аднак, многа паездзіўшы па рэспубліцы, пераznаёміўшыся з тысячамі людзей, я насмелюся назваць некаторыя досыць тыповыя рысы, уласцівыя народнаму беларускаму характару. Гэта пераважна мой погляд, хаця многія і многія людзі, і не толькі з беларусаў, падзяляюць яго.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тыповага беларуса я досыць лёгка адрозню сярод іншых, хаця б ён яшчэ не сказаў ніводнага слова (калі скажа, тады ўжо, нават калі ён гаворыць на іншай мове і без акцэнта, яго лёгка пазнаць па асаблівай будове сказа, па тым, што, колькі паветра набрана ў лёгкія, столькі і аддадзена, шчодра, да апошняга, нават з лішнімі словамі, каб мелодыя сказа была завершана. Ён не скажа: «Чым гэта скончыцца?», а скажа: «Дык чым, мо ўжо вы мне скажаце, скончыцца гэта – а, мо скажаце вы?»).

Гэта тое, што ў абліччы, амаль няўлоўнае. Пераказаць яго цяжка. Яно ў форме носа, вушэй, у вачніцах і разрэзе саміх вачэй, у манеры рухацца, жэстыкуляваць, гаварыць, дый ці мала яшчэ ў чым. Паўночны беларус ростам пераважна высокі. На поўдні часцей трапляюцца людзі сярэдняга росту, больш прыземістыя (паўтараю яшчэ раз, што гэта не агульны закон, а толькі найбольш распаўсюджаныя рысы), затое больш каржакаватыя.

Рысы аблічча мяккія, склад здаецца, на першы позірк, крыху далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае. Праявы знешняй сілы, якая ўразіць на хвіліну дый звяне, замяняе тут вынослівасць, жылаватасць, цягавітасць. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць. Іначай, у старыя часы, чалавек проста не выжыў бы сярод гэтых дрымучых лясоў і неабсяжных балот, на гэтай скупаватай зямлі. І гарт той застаўся ў яго характары на вякі (Паводле У. Караткевіча).

## Тэст

1. Адзначце, у якіх словах пішацца ***а***:
   1) аб_рваць, 2) ад_піхну, 3) с_тлелы,
   4) с_квецце, 5) аб_перціся.

2. Адзначце, у якіх словах пішацца ***у***:
   1) с_родзіч, 2) с_адносіць, 3) с_трапезнік,
   4) с_рочыць, 5) с_апякунства.

3. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца ***с***:
   1) рас_ол, 2) рас_цяліць, 3) ро_шчына,
   4) ра_шчодрыцца, 5) ра_злавацца.

4. Адзначце словы, у якіх пішацца адна літара ***д***:
   1) на_тачыць, 2) а_сунуць, 3) а_алены,
   4) па_капаць, 5) а_аны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Адзначце словы, у якіх трэба ўставіць літару:
1) сюр…эалізм, 2) ін…авацыя, 3) бес…ардэчны,
4) рас…ольнік, 5) ак…орд.

6. Адзначце словы, у якіх пішацца ***ы***:
1) без_дэйны, 2) з_начыць, 3) контр_дэя,
4) супер_нтэлект, 5) дэз_нтэгратар.

7. Адзначце словы, у якіх пішацца ***і***:
1) суб_нспектар, 2) між_нстытуцкі, 3) транс_ндыйскі,
4) без_ніцыятыўны, 5) дэз_нфекцыя.

8. Адзначце словы, у якіх пішацца ***й***:
1) ня_начай, 2) сы_сціся, 3) пра_гравальнік,
4) з_мправізаваць, 5) аб_лгаць.

9. Адзначце словы, у якіх пішацца ***з***:
1) бя_слаўны, 2) цера_палосіца, 3) ра_ведка,
4) бе_заганны, 5) цера_зерніца.

10. Адзначце словы, у якіх пішацца ***с***:
1) дэ_ынфекцыя, 2) ды_крэдытаваць, 3) ды_гармонія,
4) _ыначыць, 5) дэ_урбанізацыя.

11. Адзначце словы, у якіх прыстаўка пішацца праз злучок:
1) паў_Мінска, 2) экс_чэмпіён, 3) абы_куды,
4) паў_шклянкі, 5) па_дзіцячы.

12. Адзначце словы, у якіх прыстаўка пішацца разам :
1) сюр_рэалізм, 2) паў_горада, 3) паў_Нью-Ёрка,
4) абы_хто, 5) экс_інжынер.

13. Адзначце словы, у якіх пішацца ***я***:
1) аб_сшкодзіць, 2) н_роўны, 3) н_вясёлы,
4) б_з'ядзерны, 5) б_ссаромны.

14. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) дэзынфармацыя, 2) іррэальны, 3) абынтэлігенціцца,
4) панысламізм, 5) спадылба.

15. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) дыз'юнкцыя, 2) расчыніць (дзверы), 3) расчыніць (цеста),
4) бежжурботна, 5) эксімператар.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Правапіс суфіксаў

*69. Спішыце словы, устаўце на месцы пропускаў суфіксы* ***-ец- (-ац-)*** *ці* ***-іц- (-ыц-)****.*

Спадарожн…а, патыл…а, інды…, канькабеж…, розн…а, мсців…а, аднавяскоў…, кірыл…а, вакол…а, запарож…, саслужыв…а, абісін…, стар…, карэ…, мяцел…а, лесв…а.

*70. Утварыце назоўнікі пры дапамозе суфіксаў.*

1) ***-ічк- (-ычк-), -іц- (-ыц-), -ечк- (-ачк-):*** лесвіца, качка, паліца, суніца, дзядзька, лялька, Соня, сястрыца, крыніца, рака, завушніца, бутэлька, галава;

2) ***-ак-, -ік- (-ык-):*** дождж, мяч, сад, месяц, унук, верш, вецер, капялюш, клубок, пясок, сокал, ганак, куток.

*71. Утварыце назоўнікі, якія называюць людзей паводле заняткаў, запішыце іх у табліцу па ўзоры.*

| ***-чык- (-чыц-)*** | ***-шчык- (-шчыц-)*** |
|---|---|
| перапісчык – перапісчыца | нарыхтоўшчык – нарыхтоўшчыца |

Аб'язджаць, наладжваць, скупаць, забудоўваць, прыбіраць, пераплятаць, набіраць, рэзаць, бунтаваць, вазіць, перакладаць, бетон, картатэка, верталёт, бакен.

*72. Спішыце сказы, растлумачце правапіс суфіксаў выдзеленых прыметнікаў.*

1) І на іншых вяршынях суровых (Вера! Роўнасць! Свабода! Край!) ты струменьчык ***матчынай*** мовы, быццам маці, не забывай (У. Караткевіч). 2) Вада з балота можа стаць святой. Растуць спакойна дрэвы на іконы. І пацалунак безграхоўны той, якім цалуем маці й хлеб ***надзённы*** (Р. Барадулін). 3) Спавіты вечаровай цішынёю, сабе здаюся ***кволенькім*** сцяблом (З. Марозаў). 4) Хоць кожная сустрэча, як вяртанне да ***спадчынных*** вытокаў, да высноў, мне гэтак цяжка выказаць прызнанне, бо не стае патрэбных, шчырых слоў (З. Марозаў). 5) Каханне ніколі нідзе не знікае, ***каханы*** каханую скрозь адшукае (С. Грахоўскі). 6) Несці нашчадкам мне ў сэрцы ***даччыным*** матчыну мову, мову Айчыны (Т. Бондар). 7) У вяршыні ***маленькіх*** і ніцых дрэў маланка ніколі не б'е (Н. Гілевіч). 8) У ***маміным*** садзе мне ўсё пахне Мамай (Р. Барадулін). 9) За кожны крок даводзіцца плаціць ***бяссоннымі*** трывогамі і болем (З. Марозаў). 10) Жыву таму, што, як дзіця ў сям'і,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

апекаваны ўсім ***пчаліным*** родам, штодня лячуся беларускім мёдам – лячуся ласкай роднае зямлі (Н. Гілевіч).

*73. Спішыце, замест кропак устаўце **н** або **нн.***

Ако…ае шкло, казарме…ы рэжым, фірме…ы магазін, ячме…ыя крупы, бляша…ая крышка, гліня…ы посуд, Вогне…ая Зямля, племя…ая парода, стру…ы аркестр, алавя…ыя салдацікі, карцін…ы жэст, гарта…ы голас, дывізіё…ы ўрач, летуце…ы юнак, паддо…ая міна, драўля…ая лава, ю…ая прыгажуня, куры…ы булён, цемя…ая косць, цьмя…ы вечар, дабрачы…ы баль, ві…ы воцат, бязві…ы чалавек, няспы…ая плынь.

*74. Ад назоўнікаў пры дапамозе суфіксаў **-н-, -ен-, -ан-, -ян-, -енн- (-энн-)** утварыце і запішыце прыметнікі. Растлумачце правапіс суфіксаў. Складзіце словазлучэнні з гэтымі прыметнікамі.*

Палатно, сані, аварыя, цаліна, цэгла, чыгун, вайна, полымя, люстра, задума, тэлефон, брытва, форма, шкло, страх, насенне, конь, вясна, стрэмя, прасціна, пясок, Айчына, пчала, глыбіня, бульба.

*75. Ад наступных назоўнікаў пры дапамозе суфікса **-ск-** утварыце прыметнікі. Растлумачце іх правапіс.*

Турыст, аўтазавод, настаўнік, інстытут, рыбак, таджык, паляшук, казах, студэнт, беларус, ліпень, дэпутат, калмык, горад, латыш, баск, таварыш, француз, гігант, славак, юнак, Нясвіж, Хойнікі, Пецярбург, Баранавічы, Ямайка, Касабланка, Беласток, Добруш, Ліда, Карэлічы, Цянь-Шань, Вільнюс, Глуск, Плзень, Чашнікі, Палессе, Чэрвень, Каўказ, Адэса, Ташкент, Хатынь, Крупкі.

*76. Прачытайце сказы. Выпішыце словы з суфіксамі **-ск-** і **-ств-**, растлумачце іх правапіс, параўнайце вымаўленне і напісанне гэтых слоў.*

1) Каханне трэба берагчы ад наносаў дробнага самалюбства (К. Кірэенка). 2) У любімай мове, роднай, наскай, ах, якія словы: «Калі ласка!..» Як звіняць яны сардэчнаю струною, праз усё жыццё ідуць са мною (П. Броўка). 3) І ціш і гром, і звон і шорах спляліся ніткаю радства, – калі з грудзей, нямых і чорных, аднойчы мова прарасла (А. Разанаў). 4) Ідзі, хай агорне душу, нальe вастрынёю зрок трываласць твайго народа на першай з людскіх дарог (М. Лужанін). 5) Збіцца ў статак – гэта не адзінства, збегчы ў статак – гэта дэзерцірства (А. Вярцінскі). 6) Ляжыць зямля ад Брэста да Курыл у невыказнай Боскай прыгажосці (З. Марозаў). 7) Пакуль сабе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самому не належу, рамесніцтва баюся як агню (З. Марозаў). 8) З часоў Шэкспіра чалавецтву вядома, якая гэта выдатная справа – непарыўная повязь часоў, і як кепска, калі тая повязь ірвецца. Што тычыцца беларусаў, дык мы гэта пазналі на нашым шматвяковым гістарычным вопыце (В. Быкаў). 9) Толькі чалавек забывае, што быў ён глінаю і што хлеб надзённы здольны браць яго ў рабства (Н. Мацяш). 10) Адступніцтва пачынаецца з выпрацоўкі «высокай» філасофіі, якая апраўдвае здраду (І .Шамякін).

*77. З дапамогай суфіксаў* ***-чын-*** *і* ***-шчын-*** *утварыце назоўнікі, параўнайце вымаўленне і правапіс.*

Казак, партызан, Смаленск, рэкрут, Брэст, Гродна, Глуск, Мінск, Полацк, Слуцк, Гомель, нелегал, вайна, літаратура, Зэльва, Віцебск, Магілёў, эмігрант, Навагрудак, Браслаў.

*78. Перакладзіце дзеясловы з рускай мовы на беларускую, параўнайце правапіс суфіксаў.*

Переписывать, овладевать, разглядывать, демонстрировать, контролировать, отговаривать, завязывать, выполнять, задерживать, предупреждать, комбинировать, формулировать, возвеличивать, выкрикивать, исследовать, реагировать, деградировать, фальсифицировать, ориентировать, прогнозировать, цитировать, культивировать, контактировать, группировать, перефразировать, нервировать, экспортировать, декларировать, катализировать, выскакивать, отстаивать, паразитировать, военизировать, профилировать, финишировать, приватизировать.

*Складзіце алгарытм правапісу суфіксаў дзеясловаў*.

*79. Растлумачце правапіс суфіксаў дзеясловаў.*

Парадзіраваць – парадаваць, візіраваць – візаваць, будзіраваць – будаваць, газіраваць – газаваць, камандзіраваць – камандаваць, пазіраваць – пазаваць, пасіраваць – пасаваць, тушыраваць – тушаваць, парыраваць – параваць, паніраваць – панаваць, фарміраваць – фармаваць, апаніраваць – апанаваць.

*80. Прачытайце сказы. Растлумачце правапіс суфіксаў у выдзеленых словах.*

1) Мы славу ***параўноўваем*** з віном, а забыццё глухое – з палыном. Пакуль не лёг твой цень, твой дзень кароткі з табою ў ложак вечнасці –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

труну, п'ючы шумлівай славы хмель салодкі, не забывай пра горыч палыну (А. Куляшоў). 2) Любоў і лад узвышаюць, вядуць за далягляд. Варожасць і злосць прыніжаюць, ***адкідваюць*** назад (А. Вярцінскі). 3) Сяброўству ***здраджваць*** не магу, пачуцці ў ланцугі не путаю. Сяброўства сэрцам берагу, я з ім жыву, я з ім пакутую (А. Астрэйка). 4) Слоў суровых узводзім муры, слоў калючых ***адточваем*** шпагі, на пяшчотнае ж слова, сябры, не заўжды нам хапае адвагі (Л. Дайнека). 5) Ці плачу я, ці пяю, ці размаўляю з матуляю – песню сваю, мову сваю я да грудзей ***прытульваю*** (П. Панчанка). 6) У нас хапае слоў такіх чысцюткіх, ядраных, як ранне. Яны ***выказваюць*** услых пяшчоту, ласку і каханне (Ю. Свірка). 7) Трэба да драбніцы аддаць людзям апошняе цяпло, каб цераз век на белы свет з'явіцца душой, што ***выпраменьвае*** святло (З. Марозаў). 8) У кожнага з нас ёсць сасуд любові. Калі ён не напоўнены ў дзяцінстве, дык усё жыццё будзеш ***пакутаваць*** ад смагі і неспатоленасці (С. Алексіевіч). 9) Людзі падобныя на запалкі: калі не гарэць – ***утульваюцца*** ў бяспеку, калі гарэць – ***адтульваюцца*** для свабоды (А. Разанаў). 10) Прызванне паэтаў – ***вырошчваць*** рэха (А. Разанаў).

*81. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі, утвараючы ад дзеясловаў дзеепрыметнікі. Растлумачце правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў.*

1) Паэзія – споведзь веку, (прапусціць) праз уласнае сэрца (П. Панчанка). 2) Не ўпершыню (зліхадзеіць) мор так пагражае краю прыкляклых братоў і сясцёр, беларускай дзяржаве (Н. Мацяш). 3) І ў слабавольных, і ў моцных натурай людзей могуць быць такія моманты ў жыцці, калі чалавек можа адчуваць сябе быццам (знішчыць) перад усім светам (К. Чорны). 4) Каб таямніцы ісціны спазнаць, патрэбна ў час (пасеяць) зжаць… (З. Марозаў). 5) Халаднавата сэрцу ў мове чужой, нібыта ў (не асвяціць) храме, што поўніцца неабжытай імжой і (не ўсвядоміць) дарамі (Р. Барадулін). 6) Мне Богам (даць) Радзіма. І я (заручыць) душой з яе азёрнымі вачыма, з яе азёрнай цішынёй (З. Марозаў). 7) Так ужо (наканаваць) небам: маці дзеліцца з дзецьмі душою сваёй, як хлебам (Р. Барадулін). 8) Чаму ж мы хараства не заўважаем? Што продкі назапасілі – губляем. (Пазбавіць) пачуцці нашы крыл… (З. Марозаў). 9) Мы – дзве ракі, (напоўніць) шчасцем, мы – дзве рукі, што мкнуцца ў вышыню (М. Федзюковіч). 10) У кожнага паэта свой аблог, дзе ён шчыруе, мараю (натхніць) (З. Марозаў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## *Кантрольныя заданні*

*82. Спішыце, устаўце прапушчаныя літары.*

1) Песня і праўда – бясцэ…ыя зліткі! (Я. Янішчыц). 2) У кожным слове ёсць маста…а, жыве па прынцыпу адным: з мален…а ўступіш у свая…а – не назавеш навек чужым (Р. Баравікова). 3) Бег часу не адчуць у мітусні, у зладжа…ай зададзе…асці быту… (С. Законнікаў). 4) Пакуль дыхаю родным дымам, мне пад небам маім нязмрочна, як за пазухай у радзімы, як народжа…аму ў сарочцы (А. Пісьмянкоў). 5) Калі ўсе згубле…ы ключы, калі ні шанцу, анічога – усё ж ідзі, любі, крычы і пасягай на перамогу (А. Разанаў). 6) А паэты старэюць раней, чым астатняе ўсё чалаве…а (С. Законнікаў). 7) Гэта страшна – адчуць сябе сярод мно…ва людзей чужым, адзінокім (Я. Брыль). 8) Няма таго зелля, што хоць на міг ад тугі па Айчыне вылеч…е (Г. Бураўкін). 9) Мы ўсе жывём за кулісамі, а паказ…ем сябе на сцэне і нават гаворым заўсёды аб сцэне (К. Чорны).

*Растлумачце сэнс аднаго з афарызмаў.*

*83. Устаўце* ***н*** *ці* ***нн****.*

Дзё…ік, бляша…ы, гасці…асць, доме…ы, канапля…ы, клее…ы, клятве…ы, імяні…ік, ко…іца, кухо…ы, ле…асць, марожа…ае, дзя…іца, мільё…ы, абра…іца, сасо…ік, раслі…аводчы, сало…ы, саламя…ы, сві…ы, выгна…ік, спанта…ы, сцюдзё…ы, танкастру…ы, упэўне…ы, ся..ік.

## Тэст

1. Адзначце, у якіх дзеясловах незаконачанага трывання пішацца суфікс ***-іва-(-ыва-)****:*

   1) адрозн_ць, 2) перапіс_ць, 3) абнадзей_ць,
   4) падкрэсл_ць, 5) расказ_ць.

2. Адзначце дзеясловы незаконачанага трывання, у якіх пішацца суфікс ***-ва-****:*

   1) пакут_ць, 2) загад_ць, 3) звяз_ць,
   4) дасслед_ць, 5) здзек_цца.

3. Адзначце, у якіх дзеясловах пішацца ***е***:

   1) саром_цца, 2) разгледз_ла, 3) знясіл_ць (ворага),
   4) дагледз_ць, 5) саром_ць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Адзначце правільна напісаныя дзеясловы:
1) буксіраваць, 2) гарманіраваць, 3) ігнараваць,
4) фінансіраваць, 5) кваліфіцыраваць.

5. Адзначце дзеясловы, якія пішуцца толькі з суфіксам ***-ірава- (-ырава-)***:
1) сервіраваць, 2) фарміраваць, 3) газіраваць,
4) апаніраваць, 5) лавіраваць.

6. Адзначце дзеясловы, у якіх пішацца суфікс ***-ава-***:
1) прагназ_ць, 2) лак_ць, 3) шак_ць,
4) каталіз_ць, 5) дэбют_ць.

7. Адзначце правільна напісаныя дзеепрыметнікі:
1) высушанная, 2) абсаджаны, 3) заклеяны,
4) засеены, 5) засцелены.

8. Адзначце назоўнікі, у суфіксах якіх пішацца ***е***:
1) вяргін_чка, 2) у садз_ку, 3) я_чка,
4) расольн_к, 5) карэ_ц.

9. Адзначце назоўнікі, у якіх пішацца суфікс ***-ств-***:
1) чалаве_а, 2) мно_а, 3) прыго_а,
4) выдаве_а, 5) студэн_а.

10. Адзначце словы, у якіх пішацца суфікс ***-шчын-***:
1) Мін_а, 2) Навагруд_а, 3) Зэльвен_а,
4) Брэст_а, 5) партызан_а.

11. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) Асіповічскі, 2) фашыстскі, 3) таварышскі,
4) Гаагскі, 5) прускі.

12. Якія прыметнікі, утвораныя ад прапанаваных назоўнікаў, пішуцца з суфіксам ***-ск-***:
1) мастак , 2) Нью-Ёрк, 3) універсітэт,
4) грамада, 5) баск.

13. Адзначце назоўнікі, у якіх пішацца ***нн***:
1) зван_іца, 2) стаўле_ік, 3) зве_явы,
4) гасці_асць, 5) ю_ат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца адна літара ***н***:

1) саламя_ы, 2) іме_ы, 3) сві_ы,
4) сезо_ы, 5) упэўне_ы.

15. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца ***ь***:

1) студзен_скі, 2) чань-чун_скі, 3) Чэрвен_скі,
4) любан_скі, 5) кон_скі.

## Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок (дэфіс)

*84. Растлумачце правапіс слоў.*

Псеўданародны, паўметра, постпазіцыя, антыгуманны, ультрафіялетавы, паў-Мінска, Анты-Дзюрынг; гарвыканкам, педсавет, аўтатрактарны, агітпункт, пяцідзёнка, васьмідзесяціпяціметровы, паўтарагадовы, стакрат, пяцісотгоддзе, 40-годдзе, 100-кіламетровы, 5-працэнтны; даўным-даўно, каму-нікаму, паіць-карміць, сяк-так, глядзіць-выглядае, раз-пораз, шыварат-навыварат, рада-радзюсенька; дуб дубам, ні туды ні сюды, цюцелька ў цюцельку.

*85. Размяркуйце словы па трох групах: 1) пішуцца разам; 2) пішуцца асобна; 3) пішуцца праз злучок.*

Калі(нікалі), сямі(колерныя), трохсот(дваццаціпяці)метровы, адна(леткі), трасецца(калоціцца), аб'ектыўна(заканамерны), аб'ектна(суб'ектны), абы(калі), авія(завод), авіяцыйна(касмічны), агульна(навуковы), з(моладу), з(наскоку), значна(меншы), інжынер(механік), між(волі), час(ад)часу, чатырох(павярховы), педагагічна(правільны), паў(цень), радыё(сувязь), цап(царап), хлеба(пякарня), танц(майстар), супер(сучасны), сумесна(выпрацаваны), на(жаль), план(заказ), на(чыста), на(прыклад), не(у)прыклад, ні(адкуль), агульна(славянскі), ісці на(сустрач).

*86. Спішыце сказы, раскрыўшы дужкі. Правапіс слоў растлумачце.*

1) У свеце больш дабра і яно ў (рэшце)рэшт перамагае (А. Асіпенка). 2) Гордасць – так(сама) жаночае хараство (Я. Скрыган). 3) Усё(такі) за родную хату жыццё даражэйшае (Л. Рублеўская). 4) Дзеці ў нас, у людзей, (на)дзіва патрабавальныя і няўдзячныя (І. Мележ). 5) Гультай заўсёды відзён па колькасці праца(дзён) (Прыказка). 6) Усе сыны ўсіх народаў (на)памяць помняць родны верш і ганарацца песняй роднай, з якой з калыскі ты жывеш (П. Панчанка). 7) Паглядзець – круглае, укусіць – моцнае,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(кінуць)рынуць нельга (Загадка, яйка). 8) Па моры ідзе(ідзе), а да берага дойдзе – тут і прападзе (Загадка, хваля). 9) Кожны па(свойму) богу моліцца (Прыказка). 10) Сокалу ў(высь) ляцець, а вераб'ю пад страхой сядзець (Прыказка). 11) Чужых судоў баяцца людзі з(роду), а ёсць яшчэ суд над самім сабой (З. Дудук).

## Правапіс складаных назоўнікаў

*87. Напішыце разам, асобна ці праз злучок. Правапіс растлумачце.*

(Дзярж)тэлерадыё, (нова)будоўля, (макра)малекула, (прэм’ер)міністр, (Ван)Гог, (экс)чэмпіён, (дзед)мароз, (грос)майстар, (сарві)галава, (пакаці)гаро-шак, (жар)птушка, (контр)удар, (контр)адмірал, (Гусь)Хрустальны, (Стара)Кан-станцінаў, (Нова)Лукомль, (кілават)гадзіна, (Санта)Барбара, (Сан)Францыска, (Дон)Кіхот, (сацыял)дэмакрат, (норд)ост, (гідра)цэнтраль, (вела)трэк, (аэра)вакзал, (віцэ)канцлер, (Улан)Удэ, (паў)пракоса, (паў)Каўказа, (паў)сця-ны, (маланка)бліскаўка, (папараць)кветка, (неа)дарвінізм, (Кірава)град, (дон)Базіліа, Бадуэн(дэ)Куртэнэ, Леанарда(да)Вінчы, (Астрашыцкі)Гарадок, (Нью-Ёрк)таймс, (красуня)дзяўчына, (кветка)папараць, (камень)валун, (спец)машына, (пед)вучылішча, (адзіна)ўладдзе.

*88. Растлумачце правапіс прозвішчаў вядомых беларускіх дзеячаў літаратуры і мастацтва.*

Эдзі Агняцвет, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Марыя Андрайковіч-Бутаўт, Вітольд Бялыніцкі-Біруля, Міхаіл Без-Карніловіч, Сяргей Гудак-Арцямоўскі, Таццяна Белавусава-Пятроўская, Данута Бічэль-Загнетава, Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч.

*Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з гэтых людзей.*

## Правапіс складаных прыметнікаў

*89. Размяркуйце словы па трох групах: 1) пішуцца разам; 2 ) пішуцца праз злучок; 3) пішуцца асобна.*

(Узаемна)абумоўлены, (дабра)бытны, (часткова)асветлены, (залаціста) жоўты, (мала)дасведчаны, (цяжка)паранены, (туга)завязаны, (нава)грудскі, (глыбока)даследаваны, (добра)арганізаваны, (агульна)народны, (леў)талстоў-скі, (беларуска)моўны, (беларуска)рускі, (чыста)беларускі, (чарна)морскі, (права)бярэжны, (паўднёва)заходні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*90. Запішыце разам ці праз злучок. Правапіс растлумачце.*

(Бліскуча)залацісты арэол, (розна)галосы спеў, (цёмна)шэрая паверхня, (паўночна)заходні вецер, (чарна)бровая дзяўчына, (бела)грывыя коні, (цёмна)русыя косы, (снежна)белая сукенка, (празрыста)сіняе неба, (ваенна) палітычны савет, (чырвоны)чырвоны закат, (Маскоўска)Брэсцкая чыгунка, (высока)адукаваная асоба.

*91. Утварыце і запішыце складаныя прыметнікі. Правапіс растлумачце.*

Дваццаць пяць метраў, сельская гаспадарка, Мар'іна Горка, Паўночны Каўказ, добрая якасць, многа струн, мастацтва і публіцыстыка, высокая кваліфікацыя, дзевяць паверхаў, звыш плана, розныя колеры, любіць свабоду, залаты верх, ветлівы і афіцыйны, Пуэрта-Рыка, дызель-матор, глыбокая павага, вечная зелень, высокая тэмпература, чыстая шэрсць.

*92. Знайдзіце чацвёртае лішняе.*

1) (вода)праводны, (доўга)трывалы, (інда)еўрапейскі, (прынцыпова)новы;

2) (вада)лазны, (інша)моўны, (узаема)абумоўлены, (добра)арганізаваны;

3) (літаратурна)мастацкі, (народна)дэмакратычны, (мала)прыкметны, (горка)салёны;

4) (паравоза)вагонарамонтны, (доўга)чаканы, (блакітна)шэры, (коне) гадоўчы.

## Правапіс складаных лічэбнікаў

*93. Запішыце разам ці праз злучок. Правапіс растлумачце.*

(Васьмю)стамі, (шасці)сот, (трыццаці)пяці(мільённы), (635)мільённы, 8(мы), 3(ці), 10(му), 5(7)гадоў, два(чатыры) месяцы, (сямю)стамі, (183)тысячны, (ста)васьмі(дзесяці), трох(тысячны), (трыццаць)першы, (восем)сот шэсцьдзясят (чатыры), (тысяча)дзевяцьсот (пяцьдзясят)шосты, ГАЗ(24).

*94. Ад колькасных лічэбнікаў утварыце парадкавыя і запішыце іх словамі разам або праз злучок. Правапіс растлумачце.*

700, 28, 40 мільёнаў, 4 мільярды, 232, 20, 468 тысяч, 96, 356 мільёнаў.

*95. Запішыце тэкст. Лічбы замяніце словамі. Правапіс растлумачце.*

Мінскі замак – умацаваны цэнтр старажытнага Мінска, на аснове якога ўзнік горад і вакол якога ён рос і развіваўся. У старажытнарускіх летапісах



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вядомы пад назвай град, у актах XV–XVII стст. – замак, пазней – Стары горад, Старое месца, Стары замак, Замкавая гара, Замчышча. Дзядзінец пабудаваны ў 2-й палове XI ст. пры ўпадзенні ракі Няміга ў раку Свіслач. Абнесены земляным валам вышынёй каля 8 м, на грэбені якога пастаўлены драўляныя сцены, з паўднёвага боку была брама, аснову якой складалі 8 зрубаў-клецей, памерам 17,4 на 7,1 м, вышынёй 12 м, шырынёй праёма 3,9 м. Замак меў форму няправільнага авала (даўжыня ад ракі Свіслач да процілеглага заходняга краю 300 м, шырыня 120–150 м, плошча 3 га) (Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва).

## *Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў*

*96. Размяркуйце словы па трох групах: 1) пішуцца разам; 2) пішуцца праз злучок; 3) пішуцца асобна.*

(Па)летняму, (калі)нікалі, (з)боку, (на)супраць, (с)пад(цішка), (у)пустую, (у)вечары, (на)прад(весні), (да)дому, (да)хаты, (на)ляту, (туды)сюды, (на)перад, (на)уцёкі, (на)вока, (на)жаль, (на)заўтра, (па)дзіцячы, (на)продаж, (на)абмен, (на)шчасце, (у)глыб, (у)гару, (па)красавіцку, (на)працягу года.

*97. Запішыце разам, асобна ці праз злучок. Правапіс растлумачце.*

(На)зусім, (да)цямна, у(трая), (па)двое, у(адно), (да)бяла, (па)доўгу, (па)просту, (у)рассыпную, (у)адкрытую, (у)пустую, (ва)ўсю, (ні)за(што), (на)пагатове, (на)паказ, (на)смерць, (з)ранку, (з)боку, (з)боку (лесу), (так)сама, (што)дзень, (на)векі, (на)векі(вечныя), (па)крысе, (у)брод, (на)пракат, (без)разбору, (на)хаду, (з)разбегу, (усё)роўна, (на)дзіва, (па)сваяцку, (раз)пораз, (па)пятае, (па)людску, (сам)насам, (на)гара, (па)чалавечы.

*98. Утварыце прыслоўі або спалучэнні слоў і запішыце іх. Правапіс растлумачце.*

| | |
|---|---|
| **у** | + лічэбнік |
| | + прыслоўе |
| | + прыметнік |
| | + назоўнік |

| | |
|---|---|
| **без** | + назоўнік |
| **да** | |
| **на** | |
| **з** | |



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

## *Правапіс складаных прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў*

*99. Запішыце разам ці праз злучок. Правапіс растлумачце.*

(За)мест, (на)конт, (на)кшталт, (за)тое, (аль)бо, (ні)бы, (таму)што, (так)што, (хіба)што, (перш)чым, на(папярэдадні), (па)колькі, (а)ні, (а)ніяк, які(сьці), дзе(сьці), (з)за, (з)пад, (па)над, (з)па(над), (па)за, што(колечы), (абы)адкуль, (ха)ха, (а)я(яй), ён(то), (абы)хто, (абы)ў(каго), усё(такі), так(такі), прыйшоў(такі), прайшоў(бы), (такі)прыдумаў, чаму(ж), (як)(жа)ж, быў(жа), (абы)як, (пакуль)што, (як)раз.

*100. Прыдумайце і запішыце сказы, каб у адным выпадку словы пісаліся разам, а у другім – асобна. Правапіс растлумачце.*

(За)тым, (на)што, (за)адно, (не)гледзячы на, (на)столькі, (з)усім.

## ☑ *Кантрольныя заданні*

*101. Спішыце, раскрыўшы дужкі. Растлумачце правапіс слоў разам, асобна, праз злучок.*

1) Рабіць усё трэба не(абы)як, а з толкам, ведаць час, пару (Б. Сачанка). 2) Гэтай повязі кроўнай, якой мы прывязаны да бацькоўскай зямлі, не парвуць, не растурзаюць (ані)якія буры(вятры) (Н. Гілевіч). 3) Добра жыць усё(такі) на свеце: век прайшоў, а дзень яшчэ ідзе (П. Панчанка). 4) Звяліся з(усім) (дон)кіхоты, знікаюць старыя млыны (П. Панчанка). 5) Колькі птушка ні лятае, усё(роўна) сядзе (Прыказка). 6) Кіраваць(то) ты кіруй, ды не вельмі тузай (К. Крапіва). 7) Пад адным каўпаком сем(сот) казакоў (Загадка, макаўка). 8) Ёсць і зямное (ганебна)нізкае, змяіна(паўзучае) (В. Казько). 9) Беражы адзенне з(нову), а чэсць з(моладу) (Прыказка). 10) На(бок) грыбок: баравік ідзе (Прыказка). 11) Дружба(дружбай), а служба(службай) (Прыказка).

*102. Раскрыйце дужкі і запішыце словы ў табліцу. Правапіс растлумачце.*

| Разам | Асобна | Праз злучок |
|---|---|---|
| | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Студэнт)завочнік, (на)заўсёды, (старажытна)беларускі, (па)трошку, (з)за, усё(такі), (на)памяць, (адна)вокі, (духоўна)багаты, (сама)бытнасць, ён(жа), (на)гара, (як)раз, (трыццаці)метровы, (у)ранні, (рок)музыка, (між)волі, (на)дзіва, (у)глыб лесу, быць на(па)гатове, (трава)крапіва, (электра)зварка, (што)дзень, (гарнітур)тройка, (у)нізе, (проці)запаленчы, ні(за)што, (сама)трэніроўка, (цуда)юда, (экс)чэмпіён, (у)адзіночку, на(векі)вечныя.

## Тэст

1. Адзначце словы, якія пішуцца ***разам***:
   1) што(дзень), 2) адрас(каляндар), 3) раз(пораз),
   4) абы(калі), 5) авія(білет).

2. Адзначце словы, якія пішуцца праз ***злучок:***
   1) па(троху), 2) па(трое), 3) малочна(белы),
   4) па(людску), 5) у(адкрытую).

3. Адзначце словы, якія пішуцца ***асобна***:
   1) унтэр(афіцэр), 2) дыяметральна(процілеглы), 3) свое(асаблівы),
   4) у(абдымку), 5) на(згон) зімы.

4. Адзначце лічэбнікі, якія пішуцца ***разам***:
   1) трыццаць(першы), 2) шасцісот(васьмідзесяці)двух(мільённы),
   3) васьмі(соты), 4) сямю(стамі), 5) трыста(дваццаць)трэці.

5. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца ***праз злучок:***
   1) туга(завязаны), 2) тэарэтычна(лінгвістычны),
   3) кісла(салодкі), 4) шырока(распаўсюджаны),
   5) (форма)ўтваральны.

6. Адзначце прыслоўі, якія пішуцца ***разам***:
   1) у(адно), 2) за(адно), 3) на(відавоку),
   4) ні(за)што не скажу, 5) дзякаваць ні(за)што.

7. Адзначце словы з часціцамі, якія пішуцца ***асобна***:
   1) ён(то), 2) (абы)якавы, 3) прыйшоў(такі),
   4) прыйшоў(жа), 5) (абы)да каго.

8. Адзначце правільна напісаныя словы:
   1) пакацігарошак, 2) контр-удар, 3) урассыпную,
   4) на перакор, 5) ўсё такі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) абсалютна правільны, 2) на прыклад, 3) на памяць,
4) леў-талстоўскі, 5) агульна абавязковы.

10. Адзначце няправільна напісаныя словы:
1) прагрэсіўна-дэмакратычны, 2) усё-адно, 3) дэ-юрэ,
4) па першае, 5) на жаль.

## Правапіс часціц не, ні з рознымі часцінамі мовы

*103. Дапоўніце прыкладамі схему ўжывання часціц **не, ні,** выкарыстоўваючы прапанаваныя сказы.*




1) Але якія б высі ні ўздымалі, і зноў вяртацца трэба на зямлю (П. Макаль). 2) Жыцця ніколі не бывае многа, так, як і праўды, – колькі ні жыві (С. Законнікаў). 3) І кожнага ў свеце дарога вядзе да апошняй вярсты, таму не шкадуй ні для кога сваёй дабраты (С. Грахоўскі). 4) І ніколі не ўзыдзе зерне, што ўпала ў бясплодны пясок (В. Вітка). 5) І як не шанаваць прыроды годнасць, калі бясконца ёй у вечнасць плыць, каб праз смяротнасць зведаць несмяротнасць, і ў несмяротнасці – смяротнай быць (А. Грачанікаў). 6) Быць чалавекам свайго часу трэба, дакладней кажучы – нельга не быць. Але ж як гэта важна быць яшчэ і над часам, быць тым, хто бачыць далей наперад, вышэй – у агульначалавечае (Я. Брыль). 7) Ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ісціны да ісціны: хады – на век жыцця… ні кроку болей (В. Аколава). 8) Былі ж, і ёсць, і будуць такія, што не быць паэтамі не могуць (Я. Брыль). 9) А каму ж гэта з нас у жыцці не хочацца быць хоць за што, а пахваленым… (А. Бачыла). 10) У жыцця няма нічога вечнага, бо і жыццё самое да пары (Л. Геніюш).

*104. Прачытайце тэкст. У двух-трох сказах сфармулюйце, чым трэба кіравацца пры размежаванні правапісу зваротаў* ***не хто іншы як, не што іншае як*** *і* ***ніхто іншы, нішто іншае.***

Прыкладам аслабленага ўчастка марфалагічных нормаў выступае ўжыванне, а заадно і правапіс зваротаў ***не хто іншы як, не што іншае як і ніхто іншы, нішто іншае.***

Першыя два спалучэнні заўсёды выступаюць са значэннем часціц *іменна, менавіта, толькі.* Гэта іх сінанімічнасць дазваляе ва ўсіх выпадках замяняць звароты ***не хто іншы як, не што іншае як*** часціцамі *іменна* ці *толькі.* Магчымасць такой замены – дадатковы і вельмі эфектыўны прыём пры адрозненні спалучэнняў. Параўн.: *Цяпер я пазнаў чалавека – гэта быў* ***не хто іншы як*** (=менавіта, толькі) *Гуртавенка* (Б. Сачанка). Больш за тое, гэтыя выразы можна зусім апускаць без істотнай страты для зместу выказвання: *Яны ўсе, у тым ліку і вартавыя, схільны былі думаць, што прычынай пажару з'яўляецца* ***(не што іншае як)*** *удар маланкі* (М. Лынькоў).

У стылістычных адносінах згаданыя спалучэнні з'яўляюцца прыналежнасцю пісьмовай мовы, найчасцей выкарыстоўваюцца ў публіцыстычным, навуковым, афіцыйна-справавым стылях.

Што датычыцца спалучэнняў ***ніхто іншы, нішто іншае***, то гэта звычайныя словазлучэнні, у якіх кожнае слова захоўвае сваё лексічнае значэнне. Якога-небудзь новага, цэласнага сэнсу ад спалучэння адмоўнага займенніка з азначальным не ўтвараецца. Семантычная дастатковасць кожнага кампанента і здольнасць іх выступаць паасобку, без другога кампанента, асабліва відаць у тых выпадках, калі гэтыя словазлучэнні абмяжоўваюцца зваротамі з прыназоўнікам ***апрача***. Напрыклад, аднолькава мажлівыя тры розныя варыянты: ***Нічым іншым,*** *апрача матэматыкі, ён не цікавіўся;* ***Нічым, апрача*** *матэматыкі, ён не цікавіўся;* ***Іншым, апрача*** *матэматыкі, ён не цікавіўся.* Кожны кампанент словазлучэння з'яўляецца самастойным членам сказа: *ніхто, нішто* – дзейнікам або дапаўненнем, *іншы, іншае* – азначэннем.

У адрозненне ад выразаў *не хто іншы як, не што іншае як,* што заўсёды ўжываюцца ў **сцвярджальных** сказах, словазлучэнні *ніхто іншы,*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*нішто іншае* выкарыстоўваюцца толькі ў **адмоўных** сказах, дзе ўжо ёсць адмоўе, і ўзмацняюць гэта адмоўе: *Хоць бы зберагчы сілы на тое, каб павесці паравоз. Бо* ***ніхто іншы*** *яго не павядзе* (І. Шамякін). Кампаненты могуць выкарыстоўвацца і ва ўскосных склонах: ***Нічым іншым*** *чалавек, які вёў нас у грыбы, не вызначаўся* (І. Шамякін). Зразумела, што *ні* павінна пісацца асобна, калі часціцу аддзяляе ад астатняй часткі займенніка прыназоўнік: *ні перад кім іншым, ні з кім іншым.* Абодва спалучэнні па сваіх экспрэсіўна-стылістычных якасцях належаць да нейтральных сродкаў і ўжываюцца ва ўсіх стылях мовы.

Як бачым, правільнае ўжыванне і напісанне пералічаных спалучэнняў звязана з разуменнем іх семантыкі, з уменнем лагічна аналізаваць сказы, у якіх ёсць гэтыя звароты (С. Саракач).

*105. Устаўце* ***е*** *ці* ***і****.*

Н… нашым н… вашым; далёка н… просты чалавек, н… на міг; н… дому н… лому; н… адзін выпадак; ішлі ледзь н… гадзіну; прачытаў н… без карысці; н… слова больш; спявай н… спявай; н… адзін н… дапамог.

*106. Запоўніце табліцу.*

| | Часціца ***не*** пішацца | |
|---|---|---|
| | разам | асобна |
| назоўнік | | |
| прыметнік | | |
| дзеяслоў | | |
| дзеепрыметнік | | |
| займеннік | | |
| прыслоўе | | |

*107. Растлумачце напісанне слоў.*

Гаварыў не па-нашаму, далёка не поўны адказ, зусім неабдуманы план, не горш за іншых, не дапісаў ліст сябру, недасаліць суп, нягледзячы на перашкоды, не гледзячы па баках, нельга не зрабіць, не раз сустракаўся, ні разу не адмовіў, не хто іншы, як маці, ніхто іншы не зробіць, нешта не тое,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нешырокая, але глыбокая рака, сувеніры не куплены, надта непрыемна, нікому не цікавае паведамленне, не светла-сіні, не маладзейшы за сястру.

*108. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс часціцы **не** з назоўнікамі.*

1) Заспявай ты мне песню такую, каб душу мне паліла яна, каб у ёй ты *(не)*долю людскую і ўсё вычарпаў гора да дна (Я. Колас). 2) Хай песня будзе, як песня. Ганаровы ў песні ўдзел: яна *(не)*напітак прэсны, а самы моцны хмель (Л. Геніюш). 3) Ды радасцю *(не)*годы не спатоліць, і цішынёю зваблівай ніколі трывогі свету нам не заглушыць (Я. Сіпакоў). 4) Так патрабуе ўжо ў калысцы дагляду мудрага дзіця, каб у жыцці аратым выйсці, а *(не)*нахлебнікам жыцця (Н. Гілевіч). 5) Ад праўды раз адкруцішся – *(не)*праўдаю атруцішся (П. Панчанка). 6) Ды на зямлі ўсё ж ёсць адна істота, ад якой усе *(не)*памыслоты: сам на сябе палюе чалавек… (Я. Сіпакоў). 7) Каму ж верыць, як *(не)*чалавеку? (К. Чорны). 8) Адказна ставіць *(не)*псеўданім – прозвішча (Д. Бічэль). 9) Вершы, у якіх карані напаказ, могуць стаць вершамі-цытаваннямі, але *(не)*вершамі-адкрыццямі (А. Разанаў). 10) Натхненне – кропелька, а *(не)*струмень. І гэтай кропляй смагі не спатоліш (Т. Сівец).

*109. Растлумачце правапіс часціцы **не** з прыметнікамі.*

1) Калі не забыў сваёй мовы і колер блакіту вясновы… Дык ты на чужыне гаротнай яшчэ не самотны (М. Танк). 2) Не ад куль – часцей мы падаем ад слоў, кулі словамі апрануты, як плаццем, невыноснаю цаной людскіх галоў за маўчанне палахлівае мы плацім (П. Макаль). 3) Хоць мова наша не царская, ды гаспадарская (В. Дашкевіч). 4) Жыццё – неаплатны і спадчынны доўг (М. Танк). 5) Жыццё – невымоўная драма (В. Жуковіч). 6) Мы не бязродныя на свеце і не бяздомныя ў жыцці. Чым дагараць у пустацвеце – лепш не ўзысці і не цвісці (Н. Гілевіч). 7) А непадсудны хіба толькі робат: яму нішто людское не баліць (Н. Мацяш). 8) Калі ўсё добра – то патрэбна шмат, калі ўсё кепска – то нішто не міла (Е. Лось). 9) Вершы нараджаюцца не з уладнага «хачу», а з безабароннага «хочацца» (А. Разанаў). 10) Патрабуе чыстае сумленне быць неабходным хоць малым звяном паміж сваім і новым пакаленнем (С. Грахоўскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*110. Растлумачце, у якіх сказах **не** з займеннікамі пішацца разам, у якіх асобна.*

1) Быць чалавекам – цяжкае прызванне, *(не)*ўсім, *(не)*кожнаму ўтрымаць яго (Т. Бондар). 2) Заўсёды дурні лічаць дурнямі другіх, ды толькі *(не)*сябе (П. Панчанка). 3) Быць жа *(не)*хта павінен, хто цябе правядзе, аднаго не пакіне ў расстайнай бядзе (М. Шабовіч). 4) Дараваць – *(не)*для кожнага гонар (В. Аколава). 5) Гледзячы на *(не)*каторыя няшчасці, неяк сорамна быць шчаслівым (Ж. Лабруер).

*111. Растлумачце правапіс часціцы **не** з дзеясловамі і дзеепрыслоўямі.*

1) Жыву, не трацячы надзей, бо веру ў дабро людзей (С. Грахоўскі). 2) Мы нярэдка губім маладосць, не падтрымаўшы першае каханне і першы спеў, калі ў ім нешта ёсць (Е. Лось). 3) Не вынішчаецца любоў… (У. Някляеў). 4) Не мяняйце сяброў жывых, а тым болей – сяброў памёрлых (Г. Бураўкін). 5) Ці ёсць апраўданне такому каханню, якое катуе, якое нявечыць? (З. Дудзюк). 6) Таму, хто век сяброў не меў, хто шчыра пакахаць не змог дзяўчыну, хто не гарэў, а толькі цьмеў, не палюбіць ніколі і Айчыну (А. Зарыцкі). 7) Чым мацней мы кахаем жанчыну, тым больш схільныя ненавідзець яе (Ф. Ларошфуко). 8) Шчаслівы той, хто не зайздросціць поспеху іншага, а дапамагае яму (Г. Марчук).

*112. Спішыце, раскрываючы дужкі.*

Адзнака *(не)*выпраўлена, вельмі *(не)*зайздросны лёс, вельмі *(не)*прадуманае рашэнне, канчаткова *(не)*афармленая думка, ліст *(не)*дапісаны, *(не)*даацаніўшы якасці, *(не)*дараваўшы за хлусню, *(не)*даўшы нічога, *(не)*дачакаўшыся, *(не)*даючы спакою, *(не)*зацярушаныя снегам мясціны, *(не)*зжаты ячмень, *(не)*пабеленая гаспадаром печ, *(не)*трацячы надзеі, *(не)*ходжаная сцежка, нікім *(не)*заўважаны чалавек, ніколі *(не)*бачаны горад, усё *(не)*прыбрана, яшчэ *(не)*прачытанае апавяданне, выключна *(не)*абдуманы ўчынак.

*113. Запішыце нумары сказаў, у якіх: 1) часціца **не** з прыслоўямі пішацца асобна; 2) часціца **не** пішацца разам.*

1) Вывучай жыццё *(не)*зверху, а з сярэдзіны (Я. Брыль). 2) Жыццё *(не)*трэба смерцю страшыць, за хуткаплыннасць дакараць, бо на такой зямлі, як наша, (*не*)боязна і паміраць (С. Законнікаў). 3) *(Не)*важна, хто ты – хлебароб, паэт, адно на ўсіх людзей зямное шчасце. Галоўнае, які пакінеш



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

след, – па ім ступаць далей твайму нашчадку (С. Законнікаў). 4) А над Сусветам, над тваім быццём звон часу б'е *(не)*ўмольна і адчайна (С. Законнікаў). 5) Вучышся з пагардай на сэнс жыцця глядзець – *(не)*ўцям, што жыць адно тады і варта, калі рабіць дабро людзям (Н. Гілевіч). 6) Каб адысці – пагаснуць *(не)*абходна (А. Разанаў). 7) Мёртвым лягчэй, і *(не)*сцерпна жывым, што мёртвых у сэрцы нясуць (У. Караткевіч). 8) Там, дзе пачынаецца абыякавасць, так *(не)*далёка гібель (К. Чорны). 9) І падлогі мыццё нам аддзячыць, калі мыем мы – *(не)*напаказ (Н. Мацяш). 10) *(Не)*часта даецца, каб чужое слова кранулася дна душы (Я. Скрыган).

*114. Запішыце разам ці асобна.*

*(Ні)*з кім, *(ні)*кому, *(ні)*бы, *(ні)*водны, *(ні)*колі, *(ні)*жывы *(ні)*мёртвы, *(ні)*разу, *(ні)*шчымны, *(ні)*пра што.

*115. Спішыце тэкст, устаўляючы патрэбныя часціцы і раскрываючы дужкі.*

Мы *(н…)*колі *(н…)*жывём цяперашнім: альбо ўгадваем будучыню і ўсё чакаем яе, быццам можам яе прыспешыць, альбо згадваем мінулае і намагаемся вярнуць яго ва ўяўленнях, быццам яно пайшло ад нас залішне рана. Мы такія *(н…)*разумныя, што марна блукаем у часе, які нам яшчэ *(н…)*належыць або *(н…)*зваротна знік, забываючыся зусім пра адзіную дадзеную нам сапраўднасць – яву, у якой мы існуем. А справа ў тым, што час цяперашні амаль заўсёды перажываецца намі пакутліва. Калі сённяшняя рэальнасць засмучае нас, мы стараемся закрыць на яе вочы, калі радуе – бядуем, усведамляючы, што век яе кароткі. Мы марна прагнем захаваць яе *(н…)*зменнай і ў будучыні, спрабуем прадоўжыць плыні нам *(н…)*падуладныя – і гэта пры тым, што няма *(н…)*якае ўпэўненасці: а ці ж дацягнем мы да гэтае будучыні?..

Прасачыце ўсе свае думкі, і вы знойдзеце ў іх толькі мінулае і будучае. Пра дзень сённяшні мы амаль *(н…)*думаем, а калі і думае, дык у надзеі, што ён падкажа нам, як уладкаваць дзень заўтрашні. Мы *(н…)*колі *(н…)*разглядаем як мэту дзень сённяшні, ён, як і ўсё, што мінула, – таксама сродак, а наша адзіная мэта – будучыня. Вось і выходзіць, што мы *(н…)*колі *(н…)*жывём, а толькі збіраемся жыць і, спадзеючыся на шчасце, так *(н…)*колі яго і *(н…)*маем (Б. Паскаль).

## Тэст

1. Адзначце сказы, у якіх ужываецца ***ні***:

1) Што н_ кажы, а жыццё ўжо само па сабе ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар (Я. Колас).

2) Слоў не крышыць н_ век, н_ тапор (Я. Купала).

3) Быць людзьмі. Н_ толькі імі звацца (Л. Геніюш).

4) Страшна н_ жыць у знябытасці, а паміраць (Н. Гілевіч).

5) Яшчэ нам н_ раз давядзецца згадзіцца з высноваў такой, што той з нашай мовы смяецца, хто мовы не мае сваёй (Л. Дранько-Майсюк).

2. Адзначце сказы, у якіх ужываецца ***не***:

1) Хто н_ спытаў хоць раз трывогі, жыццю н_ ведае цаны (А. Звонак).

2) Калі паміраюць паэты, што н_ перад кім не гнуцца, – у чалавецтва прасветы на ўсе вякі застаюцца (А. Грачанікаў).

3) Хто н_ любіць роднай мовы, той любіць толькі сам сябе (С. Грахоўскі).

4) А самых лепшых – час н_ беражэ (Я. Янішчыц).

5) Мастак не ўласнасць: ён не належыць н_ сабе, н_ каму-небудзь іншаму (А. Разанаў).

3. Адзначце спалучэнні, у якіх ужываецца часціца ***ні***:

1) (н_)хто не адазваўся, 2) не расце (н_)дзе,
3) (н_)хта сказаў, 4) (н_)дзе пачуўся голас,
5) (н_) ў каго няма.

4. Адзначце сказы, у якіх ***не*** пішацца разам:

1) З *(не)*праўдай у вяках вядуць паэты свой паядынак, свой няроўны бой (П. Макаль).

2) Ёсць у паэта свой аблог цалінны, *(не)*кранутых прастор для баразён, дзе ён працуе з першае хвіліны і да апошніх вечаровых дзён (А. Куляшоў).

3) *(Не)*падуладна толькі слова халоднай пэўнасці акоў (В. Зуёнак).

4) Мне верш, што *(не)*напісаны, патрэбны, каб веру ў сябе не патушыць (У. Марук).

5) Глухому салаўю *(не)*трэба нотаў вельміх (Я. Янішчыц).

5. Адзначце сказы, у якіх ***не*** пішацца асобна:

1) Мінулае наша гэтак жа *(не)*аддзельнае ад нас, як і будучае (М. Стральцоў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) Жыцця *(не)*ўзаранае поле чакае свайго плугара (С. Законнікаў).

3) У маладосці душа і думкі *(не)*абцяжараны развагаю аб мэтазгоднасці (К. Чорны).

4) Дум *(не)*скуеш ланцугамі (Я. Купала).

5) Верш значны *(не)*гукам, які чуваць, пакуль верш чытаецца, а сваім рэхам, якое ён утварае, калі адгучыць (А. Разанаў).

6. Адзначце рады, у якіх абодва словы пішуцца з ***не*** разам:

1) (не)даўшы нічога, (не)дапоўніць адказ;
2) (не)дагледзець дзіця, (не)дааценіць небяспекі;
3) выключна (не)просты выпадак, нікольні (не)складаная задача;
4) чакаць з (не)цярплівасцю, (не)ходжаная сцежка;
5) (не)зважаючы на абставіны, (не)ўзаранае трактарам поле.

7. Адзначце рады, у якіх абодва словы пішуцца з ***не*** асобна:

1) дакументы (не)аформлены, нікому (не)выказаныя думкі;
2) (не)варта маўчаць, (не)доўгі шлях;
3) (не)злавіўшы рыбы, (не)давыканаўшы плана;
4) (не)даказаць тэарэмы, (не)дапісаўшы пісьмо;
5) (не)цяжка даведацца, (не)ўзабаве адпачылі.

8. Адзначце, на месцы якіх пропускаў пішацца ***ні***:

Калі ты ад клапот жыццёвых стараніўся, н_[1] хлебам, н_[2] вадой з сябрамі н_[3] дзяліўся, н_[4]кога н_[5] сагрэў н_[6] словам, н_[7] спагадай і ніву н_[8] прыкрыў грудзьмі ад градападу, заўсёды за другіх хаваўся ў ліхалецце – лічы, што н_[9] было цябе на гэтым свеце (М. Танк).

9. Адзначце, на якіх правілах заснаваны правапіс слоў з ***не***:

І ў тым, каб доляй роднай даражыць, не выглядаючы[а] выгодаў лепшых… Перад няўмольнасцю[б] зямлёю легчы – ёсць толькі права чалавекам быць (Л. Тарасюк).

1) слова без ***не*** не ўжываецца,
2) ёсць супрацьпастаўленне,
3) ***не*** з дзеясловамі і дзеепрыслоўямі,
4) з кароткімі дзеепрыметнікамі,
5) пры нязменных словах у ролі выказніка.

10. Знайдзіце сказы, у якіх часціцы напісаны правільна:

1) Ні болей, ні меней: жывое слова, слова інакшым не можа быць. Іначай што яно можа зрабіць? Іначай не зерне яго, а палова (А. Вярцінскі).

2) Дбаючы разам з векам аб электронным цудзе, памятай – чалавекам нехта за цябе не будзе (П. Макаль).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

3) Мы слухаем маўклівае міжзор'е, а блізкіх нам неможам зразумець (Г. Бураўкін).

4) Не шукай на свеце нейкую падкову, што прыносіць шчасце і знішчае злосць. Не чакай ад неба цудаў і спакою, ведай: на Зямлі ты – гаспадар, не госць (П. Пруднікаў).

5) Немінучы паэт неўміручы: ён – не рэха, ён – голас і зрок! (В. Жуковіч).

## Правапіс вялікай і малой літар

*116. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, ***Іаган Себасцьян Бах***, быў донжуанам, Эскулап, ***Кірыла Тураўскі***, ***Вольфганг Амадэй Моцарт***, форд, Нестар Летапісец, кацюша, Форд, ***Ханс Крысціян Андэрсен***, такі донкіхот, ***Жак Іў Кусто***, эскулап, Вікенцій Дунін-Марцінкевіч, браты Гарэцкія, Ом, рэнтген, род Радзівілаў, гарлахвацкія, Ібн Сіна, дызель, Сен-Жуст, махновец, ом, ***О'Генры***, Д'Артаньян, сабака Мухтар.

*Падрыхтуйце вусныя паведамленні пра асоб, імёны якіх выдзелены (на выбар).*

*117. Спішыце, раскрываючы дужкі, растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

(Л,л)еанарда (Д,д)а (В,в)інчы, (Г,г)егельянец, (М,м)агаметанін, (Л,л)юдвіг (В,в)ан (Б,б)етховен, (Т,т)улягі, (А,а)мпер, (М,м)аўзер, (Д,д)он (Ф,ф)ердынанд, (О,о)та (Ф,ф)он (Ш,ш)анхаўзен, (Э,э)ль (Г,г)рэка, (У,у)ран, (К,к)упалавец, (П,п)ісулькіны, (П,п)алоній.

*Знайдзіце словы, якія маюць варыянты напісання. Складзіце і запішыце з імі сказы.*

*118. Прачытайце тэкст, перакажыце яго. Як вы разумееце выраз «эзопаўская (эзопава) мова»? Чаму прыметнік* ***эзопаўская (эзопава)*** *пішацца з малой літары?*

Знакаміты байкапісец старажытнай Грэцыі Эзоп быў рабом філосафа Ксанфа. Аднойчы Ксанф захацеў запрасіць гасцей і загадаў Эзопу згатаваць самае лепшае. Эзоп купіў языкі і зрабіў тры стравы. Ксанф спытаў, чаму Эзоп падае толькі языкі. Той адказаў: «Што можа быць лепей! Пры яго дапамозе будуюцца гарады, развіваецца культура, людзі гавораць паміж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сабой, вітаюць, натхняюць на подзвігі, прызнаюцца ў каханні». Такое разважанне прыйшлося даспадобы Ксанфу і яго гасцям.

Іншым разам Ксанф загадаў, каб Эзоп набыў да абеду самае горшае. Эзоп зноў набыў языкі. Усе здзівіліся гэтаму. Тады Эзоп пачаў тлумачыць: «А што на свеце ёсць горшага? Пры дапамозе языка людзі расчароўваюць адзін аднаго, крывадушнічаюць, ілгуць, падманваюць, сварацца. Язык можа зрабіць людзей ворагамі, можа выклікаць войны, загадвае знішчаць гарады і нават цэлыя дзяржавы, можа прынесці гора, зло, нянавісць, здраду, ганьбу. Ці можа што-небудзь быць горай за гэтае?!» Паданне гаворыць, што не ўсім гасцям было прыемна чуць гэты адказ Эзопа.

*119. Прачытайце тэксты. Растлумачце, у якіх выпадках выдзеленыя словы пішуцца з малой літары, у якіх – з вялікай.*

I. Слова ***(Б,б)атыст*** паходзіць ад імя французскага ткача ***(Б,б)атыста*** з Камбрэ (XIII ст.). Мае значэнне ‘тонкае палатно (ільняное, баваўнянае)’.

II. Два тысячагоддзі таму ў Індыі ўжо гулялі ў мяч з пер’яў. Гэту гульню ведалі і інкі. У Еўропе «пер’евым мячом» у сярэднія вякі забаўляліся высакародныя пані. Але пачаткам еўрапейскага ***(Б,б)адмінтона*** лічаць 1873 год, калі індыйская гульня была прадэманстравана публічна ў горадзе ***(Б,б)адмінтоне*** – курорце Паўднёвай Англіі. Адсюль і пайшла назва гэтай гульні.

III. У 1870 г. туляк-саматужнік М. Белабародаў вынайшаў новы дасканалы інструмент – першы ў свеце храматычны гармонік. Ён меў у клавіятуры правай рукі 12 гукаў сучаснай музычнай сістэмы. Вядомы гарманіст Я. Арланскі-Цітарэнка пазней назваў гэты новы рускі інструмент у гонар старажытнарускага песняра ***(Б,б)аяна*** – ***(Б,б)аянам***.

IV. Слова ***(С,с)андвіч*** вядзе радаслоўную ад англійскага лорда ***(С,с)андвіча***. Ён быў заўзятым іграком і, не жадаючы адрывацца ад картаў у час вячэры, прыдумаў новы, зручны від бутэрброда: лустачка цяляціны, вяндліны або сыру паміж дзвюма лустачкамі хлеба, каб не пэцкаць рук.

V. У XVII ст. каля Лондана на беразе Тэмзы дзейнічаў парк, а непадалёк знаходзіўся шынок, які належаў удаве па прозвішчы ***(В,в)аксхал***. Гэтым словам хутка сталі называць і сад. Такія ж з’явіліся і ў іншых гарадах Еўропы, у тым ліку і ў г. Паўлаўску (паблізу імператарскага палаца). Сад па прыкладзе лонданскага сталі называць ***(В,в)акзалам***. Калі ж пабудавалі чыгунку з Пецярбурга да Паўлаўска, канцавы прыпынак таксама назвалі ***(В,в)акзалам***. А потым так сталі называць усе пабудовы станцый.

*120. Аб'яднайце словы ў групы: 1) прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад асабовых імён; 2) адносныя прыметнікі, утвораныя ад імён, прозвішчаў і псеўданімаў; 3) прыметнікі, утвораныя ад асабовых назваў, у складзе ўстойлівых словазлучэнняў. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

(С,с)карынавы выданні, (П,п)іфагорава тэарэма, ***(Д,д)амоклаў меч,*** (К,к)упалаўская прэмія, (К,к)оласаўская стыпендыя, (В,в)арфаламееўская ноч, ***(П,п)ірава перамога***, (В,в)ользін клопат, (А,а)хілесава пята, (Г,г)арэцкія чытанні, (Б,б)альзакаўскі ўзрост, (Б,б)роўнаўскі рух, ***(С,с)ізіфава праца,*** (Г,г)егелеўская дыялектыка, (Б,б)рылёў зборнік, (К,к)упалаўскі верш, ***(А,а)рыядніна ніць,*** (Н,н)апалеонаўскія планы, (К,к)упалавы рукапісы, (Р,р)энтгенаўскі здымак, (Н,н)обелеўская прэмія, (С,с)ідарава каза.

*Растлумачце значэнне выдзеленых фразеалагізмаў.*

*121. Прачытайце сказы. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар у выдзеленых словах.*

1) Вазьмі у звычай, сын герояў і ***багоў***, не пагарджаць святым сваім мінулым, а заслужыць яшчэ, і вартым быць яго (Н. Гілевіч). 2) Думкі пра ***Бога***, маці, дзіця, радзіму заўсёды надаюць сілу (Г. Марчук). 3) А быў жа ён – час, калі мне здаваліся: рачулка – ракой, пагорачкі – горамі, дзедава слова – ***Божым*** (Н. Гілевіч). 4) Мацней за смерць, за ўсё, каханне зямлі, дзе ад дзіцяці ўзрос... Устань жа, устань, ускрэсні сёння, мой Край, як уваскрос ***Хрыстос***! (М. Дукса). 5) Дзівак! Пільней прыгледзься: ***Дух Святы*** і ў лісціку, і ў кветцы праступае (М. Дукса). 6) Кветак дзявочых краса! ***Прачыстая Дзева Марыя***! Просьбу маю падтрымай ***Боскай*** малітвай сваёй (М. Гусоўскі). 7) Жыровічы – святы для нас куточак, дзе цэрквы ў неба вежы узнялі. На дрэве ***Маці Божай*** абразочак – благаслаўленне для маёй зямлі (Л. Геніюш). 8) Бо няма на свеце злыдні больш нягоднай, чыну, вартага праклёну і суда, чымся ***юдам*** стацца для свайго народа, чым братоў ці здрадзіць, ці прадаць (Н. Арсеннева). 9) Ах, абрывак светлай мары, лёсу выбрык нечаканы. Растварыўся ў шэрай хмары мой ***Пегас*** незацугляны (Л. Мялешка). 10) Як зайграе ў лесе ***хохлік***, замірае песень воклік, у цёмным яры скачуць чары, чахне кветка на папары (Я. Купала).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*122. Складзіце і запішыце сказы з прапанаванымі парамі слоў. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

Баба Яга – баба-яга, Буцэфал – буцэфал, Атлант – атлант, Фурыя – фурыя, Пярун – пярун, Тытан – тытан.

*123. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс вялікай і малой літар у геаграфічных і астранамічных назвах.*

1) На мосце млечным, што ляцеў праз (Л,л)ету ў тумане нятленным, нашы душы вянчала вечнасць...(Т. Лапцёнак). 2) Свяці, не гасні, (З,з)орка (М,м)ілавіца, табе не дасць зняверыцца, згубіцца святая праўда – бацькава зямля (З. Марозаў). 3) Нас на (З,з)ямлі за ўсё мацней трымае смутак развітання (Р. Барадулін). 4) Святла баяцца цёмныя краты. Арлы да (С,с)онца ведаюць дарогу (Р. Барадулін). 5) Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, каб звонка звінела, была як агонь. І сёлаў імёны, як гукі цымбалаў, – (Б,б)лонь, (С,с)трунь, (З,з)вонь! (П. Броўка). 6) Сцяблінка штосьці ветрыку пяе – мо ў ёй гучыць паэзія (С,с)усвету? (З. Марозаў). 7) Не бядней мы за славутыя (Е,е)ўропы, – проста надта заклапочаны народ… Нам баляць усе патравы і патопы, і шкадуем мы сябе на ўсякі зброд (Е. Лось). 8) Праз цяжкае (Ч,ч)арнобыля дыханне я чую часу іншага хаду (З. Марозаў). 9) У кожнага (А,а)лімп свой і (П,п)арнас (З. Марозаў). 10) Знікнуць людзі і рэкі, салавей адспявае, і, магчыма, з (Г,г)алактык убачаць здаля, як павольна плыве ў (С,с)усвеце нямая, у адвечнай жалобе пустая (З,з)ямля (С. Грахоўскі).

*124. Растлумачце правапіс наступных слоў.*

Антарктыда, Кардыльеры, Фудзіяма, Адрыятыка, Ла-Манш, Лос-Анджэлес, Давыд-Гарадок, Мінск-Мазавецкі, Ціхі акіян, Паўночны полюс, Мінскае мора, Берынгаў праліў, Белае возера, Лысая гара, Бярэзінскі біясферны запаведнік, Палярная зорка, Рэспубліка Беларусь, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Злучаныя Штаты Амерыкі, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Блізкі Усход, Франкфурт-на-Майне.

*125. Растлумачце, як павінны пісацца назвы дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.*

(С,с)авет (М,м)іністраў Рэспублікі Беларусь, (М,м)іністэрства (Э,э)канomікі Рэспублікі Беларусь ((М,м)інэканомікі), (Н,н)ацыянальная (А,а)кадэмія (Н,н)авук Беларусі, (Б,б)еларускі (Д,д)зяржаўны (У,ў)ніверсітэт, (Н,н)ацыянальны (А,а)кадэмічны (Т,т)эатр імя Янкі Купалы, (Б,б)еларускі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Д,д)зяржаўны (М,м)узей (Г,г)історыі (В,в)ялікай (А,а)йчыннай вайны, (Н,н)ацыянальная (Д,д)зяржаўная (Т,т)элерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь ((Б,б)елтэлерадыёкампанія), (Н,н)ацыянальны (А,а)лімпійскі (К,к)амітэт Рэспублікі Беларусь, (Е,е)ўрапейскі (С,с)аюз ((Е,е)ўрасаюз), (А,а)рганізацыя (П,п)аўночнаатлантычнага (Д,д)агавору (НАТА), (М,м)інскі (А,а)бласны (С,с)авет (Д,д)эпутатаў, (С,с)ельсавет, (Д,д)ом (К,к)ультуры, (П,п)алац (М,м)астацтваў, (Д,д)ом (А,а)дпачынку, (К,к)афедра (Б,б)еларускай (М,м)овы.

*126. Расшыфруйце абрэвіятуры, растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

БДУ, ВНУ, ЗША, УА, ЖЭС, СНД, НАН Беларусі, СМІ, МАЗ, ЦУМ, ААН, ЮНЕСКА, ТЮГ, РІВШ, інтэрпал, БРСМ, НАТА.

*127. Прачытайце назвы, растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, лаўрэат, кандыдат педагагічных навук, Папа Рымскі, Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі, Далай-Лама, візіт прэзідэнта, выступленне старшыні, прыём у караля, загад імператара, Герой Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер ордэна Ганаровага Легіёна.

*128. Спішыце сказы, растлумачце правапіс вялікай і малой літар.*

1) Каб вясне прабіць дарогу, каб калісь вярнуўся рай, – слова праўды, слова Бога мусіш слухаць, родны Край (У. Караткевіч). 2) Жаданае толькі адно ярмо – ярмо Айчыны… (Р. Барадулін). 3) О радзіма, мой светач цудоўны, адзіны, явар мой, мой агністы снягір на сасне… (У. Караткевіч). 4) Я ў крузе, дзе слова шукае Слова, а чалавек Чалавека (А. Разанаў). 5) Пакінь адну пасаду – быць Чалавекам на зямлі (С. Грахоўскі). 6) Няма сумлення – няма і чалавека (Л. Геніюш). 7) Слова гневу і помсты, пяшчоты і жалю – любай маці-Радзімы вячыстае слова! (Н. Гілевіч). 8) Няма вышэйшага чыну – няма і не было, – чым бараніць Айчыну, калі ёй робяць зло (А. Вярцінскі). 9) Родныя гукі... З гукаў – родныя словы... Са словаў – песні, казкі, паэмы, драмы, Жыццё, Радзіма, Народ (Н. Гілевіч). 10) Без радзімы народа няма, без народа няма Радзімы (Р. Барадулін).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*129. Спішыце словы, раскрыўшы дужкі.*

(К,к)урган (С,с)лавы, (В,в)остраў (С,с)лёз, (М,м)едаль «(З,з)алатая (З,з)орка» Героя Савецкага Саюза, (О,о)рдэн Айчыны I (С,с)тупені, (К,к)урган (Б,б)ессмяротнасці, (Г,г)еоргіеўскі (К,к)рыж, (О,о)рдэн (Д,д)ружбы (Н,н)народаў, (Д,д)зяржаўны (С,с)цяг Рэспублікі Беларусь, (Д,д)зяржаўны (Г,г)ерб Рэспублікі Беларусь, (Д,д)зяржаўная (П,п)рэмія Рэспублікі Беларусь, (П,п)омнік (П,п)ерамогі, (О,о)рдэн Францыска Скарыны, (Г,г)анаровая (Г,г)рамата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, (М,м)іжнародная (П,п)рэмія (М,м)іру, (Н,н)обелеўская (П,п)рэмія, (О,о)рдэн (М,м)аці, (К,к)убак свету, (К,к)аралеўскі (К,к)убак.

*Апішыце герб і сцяг Рэспублікі Беларусь*.

*130. Растлумачце правапіс назваў дакументаў, мастацкіх твораў і стыляў.*

***Біблія***, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, барока, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі», ***Каран***, готыка, Першы канцэрт П.І. Чайкоўскага, Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, ракако, ***Статут Вялікага Княства Літоўскага***, Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, ***Талмуд***, ампір, ***Літоўская метрыка***, пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Алмазны фонд, ***Стары Запавет***, мадэрн.

*Падрыхтуйце вусныя паведамленні пра выдзеленыя творы*.

*131. Раскрыйце дужкі, растлумачце правапіс назваў знамянальных дат і падзей.*

(Д,д)абравешчанне, (А,а)драджэнне, (П,п)ершая (С,с)усветная (В,в)айна, (К,к)айназойская (Э,э)ра, (В,в)ялікдзень, (Н,н)еаліт, (К,к)аляды, (Д,д)зень (Н,н)езалежнасці Рэспублікі Беларусь ((Д,д)зень (Р,р)эспублікі)), (Н,н)овы (Г,г)од, (С,с)анітарны (Д,д)зень, (Н,н)араджэнне (Х,х)рыстова, (У,у)васкрэсенне (Х,х)рыстова, (Л,л)ядовае (П,п)абоішча, (І,і)мперыялістычная (В,в)айна, (Р,р)адаўніца, (К,к)упалле, (Р,р)эфармацыя, (Р,р)амадан, (П,п)аўстанне Тадэвуша Касцюшкі, (Э,э)поха (Ф,ф)еадалізму, (В,в)ысакосны (Г,г)од, (Д,д)зень (А,а)дчыненых (Д,д)зверэй, (Д,д)зень (П,п)ерамогі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*132. Выразна прачытайце верш Р. Барадуліна. Растлумачце правапіс вялікай літары.*

«Пад мачтай»
пількаўскай гонкай сасны
Плылі Вы ў свет на агледзіны.
А «Нарач»
крушыла зімовыя сны.
Радок, як курок,
быў узведзены.
Нідзе «На этапах»
суровых гадоў
Не збочылі
ў заціш здрадную.
«Здарова, таварышы!» –
родных братоў
Віталі па-танкаўску,
з радасцю.
Не шкадавалі ў змаганні сіл,
«Вастрыце зброю!» –
да волі клікалі.
Прайшлі
«Праз вогненны небасхіл»
Шляхамі,
праўдай вялікімі.
Блакіт
«Нарачанскія сосны» ўзнялі,
Вянчаныя
вечназялёнай пашанаю,
Вы горда
«Прайсці праз вернасць»
змаглі.
Дарогай,
жытам закалыханаю.
Ваш кожны радок,
як «Глыток вады»,
Паэзіі роднай Волаце!
І Вашаму слову
жыць назаўжды
«На камні, жалезе і золаце»!

*Каму прысвечаны гэты твор?*

## Кантрольныя заданні

*133. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі.*

1) Маміна слова мяне пераксціла, благаславіла (К,к)упалава слова (Р. Барадулін). 2) Мне б слова, каб усхвалявала кроў, каб чуўся ў ім планеты пульс адвечны, а ў ім жыла (Б,б)агіня – (Ч,ч)алавечнасць, а з ёю – (П,п)раўда, (В,в)ера і (Л,л)юбоў (М. Рудкоўскі). 3) Як жыла і жывеш, будзеш жыць, (Б,б)еларушчына! Зразумеў і ўспомніў цябе твой мільённы народ (Я. Купала). 4) О, мова! Усе, як (М,м)агеланы, к табе мы вернемся наўпрост (Л. Галубовіч). 5) Мама – мая небадарная (Б,б)іблія, якая мяне да жыцця прыручала (Р. Барадулін). 6) Жыві, шукай, усё рабі як след, каб на (Р,р)адзіме твой свяціўся след (С. Грахоўскі). 7) (Б,б)еларусь утрымалася вераю (Р. Барадулін). 8) Калі мне пішацца, тады – такі багаты, што ўсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Р,р)акфелеры і (Ф,ф)орды не раўня (А. Бачыла). 9) Даць ахвярнае цела на нясцерпную смерць, пад нажы, каб у ладанах (В,в)ербнай (Н,н)ядзелі серабра́най вярбою аджыць (Н. Арсеннева). 10) А на вуснах краініных неўміручыя словы першадрукаў (С,с)карынавых і паэм (К,к)уляшова (М. Лужанін).

*134. Прачытайце тэкст. Чаму аўтар адно і тое ж слова піша з малой, а потым з вялікай літары? Запішыце свае разважанні.*

Прызнавацца радзіме ў сваёй любові да яе трэба ціхім, сціплым і нават крыху сарамлівым голасам – такім, якім прызнаюцца ў сваіх самых цнатлівых і непапраўных пачуццях. Інакш нельга. Інакш яна, Радзіма, падумае, што ты і сам у такое не верыш і крычыш так толькі таму, каб пераканаць у гэтым усіх, а заадно і самога сябе (Я. Сіпакоў).

*135. Выберыце вялікую ці малую літару.*

(П,п)алац (М,м)оладзі, (П,п)ушкініст, паў-(Л,л)агойска, (Д,д)зень (Д,д)руку, (Л,л)юбанскі (Р,р)аён, (А,а)сіповіцкае (В,в)адасховішча, (М,м)інска-(М,м)аладзечанскае ўзвышша, (А,а)сіповіцкія вуліцы, (М,м)іністэрства (Ю,ю)стыцыі (Р,р)эспублікі (Б,б)еларусь ((М,м)інюст), (Н,н)ацыянальны (А,а)кадэмічны (В,в)ялікі (Т,т)эатр (Б,б)алета (Р,р)эспублікі (Б,б)еларусь, (У,у)станова (А,а)дукацыі «(Б,б)еларускі (Д,д)зяржаўны (П,п)едагагічны (У,ў)ніверсітэт імя (М,м)аксіма (Т,т)анка», (Г,г)арызонт, тэлевізар «(Г,г)арызонт», (Д,д)ругая (С,с)усветная (В,в)айна, (М,м)едаль «(З,з)алатая (З,з)орка».

## Тэст

1. Адзначце, у якіх словах пішацца вялікая літара:
   1) (Г,г)арлахвацкія, 2) (Л,л)андэр, 3) (Р,р)адзівілы,
   4) (Б,б)ефстроганаў, 5) (Д,д)онкіхоты.

2. Адзначце, у якіх словах пішацца малая літара:
   1) (Д,д)он (К,к)іхот, 2) (Ш,ш)агал, 3) (Ш,ш)авіёт,
   4) (М,м)інчанін, 5) (К,к)азімір (Ч,ч)ацвёрты (Я,я)гелончык.

3. Адзначце словы, у якіх усе часткі пішуцца з вялікай літары:
   1) (В,в)ан (Г,г)ог, 2) (С,с)улейман-(П,п)аша, 3) (Л,л)е (К,к)арбюзье,
   4) (Л,л)опэ (Д,д)э (В,в)ега, 5) (Р,р)ычард (І,і)львінае (С,с)эрца.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Адзначце словы, якія могуць пісацца як з малой, так і з вялікай літары:
1) (Т,т)алстовец, 2) (А,а)ндэрсен, 3) (В,в)ольт,
4) (Я,я)гайла, 5) (Б,б)раўнінг.

5. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца малая літара:
1) (Б,б)еларускі правапіс, 2) (Б,б)ерталетава соль,
3) (А,а)ўгіевы стайні, 4) (К,к)упалавы вершы,
5) (К,к)оласаўскія мясціны.

6. Адзначце прыметнікі, у якіх пішацца вялікая літара:
1) (К,к)оласаўскі стыль, 2) (С,с)карынаўская чытанні,
3) (Г,г)ордзіеў вузел, 4) (Т,т)анкаўская стыпендыя,
5) (Э,э)зопава мова.

7. Адзначце словы, у якіх пішацца малая літара:
1) (А,а)нёл, 2) (Д,д)зед (М,м)ароз, 3) (Ю,ю)да (здраднік),
4) (З,з)еўс, 5) (Ц,ц)арыца (Н,н)ябесная.

8. Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара:
1) (М,м)есія, 2) (Х,х)охлік, 3) (Б,б)уда,
4) (Д,д)зед-(М,м)ароз, 5) (Б,б)оская міласць.

9. Адзначце назвы, у якіх усе словы пішуцца з вялікай літары:
1) (П,п)алескае (Б,б)алота, 2) (В,в)огненная (З,з)ямля,
3) (Б,б)еламорска-(Б,б)алтыйскі (К,к)анал,
4) (П,п)ланета (М,м)арс, 5) (З,з)ямля (Ф,ф)ранца-(І,і)осіфа.

10. Адзначце правільна напісаныя назвы:
1) Вялікае княства Літоўскае, 2) Давыд-гарадок, 3) Забужжа,
4) плошча Бангалор, 5) Случчына.

11. Адзначце назвы, у якіх не ўсе словы пішуцца з вялікай літары:
1) (А,а)рганізацыя (А,а)б'яднаных (Н,н)ацый,
2) (С,с)авет (М,м)іністраў Рэспублікі Беларусь,
3) (Н,н)ацыянальны (С,с)ход Рэспублікі Беларусь,
4) (С,с)ельскі (С,с)авет (Д,д)эпутатаў,
5) (Т,т)аварыства (Ч,ч)ырвонага (К,к)рыжа.

12. Адзначце правільна напісаныя назвы:
1) Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі,
2) Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,
4) мінскі абласны выканаўчы камітэт,
5) Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі.

13. Адзначце назвы, у якіх усе словы пішуцца з вялікай літары:
1) (М,м)ітрапаліт (М,м)інскі і (С,с)луцкі, (П,п)атрыяршы (Э,э)кзарх (У,у)сяе (Б,б)еларусі,
2) (С,с)таршыня (К,к)анстытуцыйнага (С,с)уда,
3) (П,п)апа (Р,р)ымскі,
4) (Г,г)ерой (Б,б)еларусі,
5) (Г,г)енеральны (П,п)ракурор.

14. Адзначце правільна напісаныя назвы:
1) Георгіеўскі крыж, 2) Ганаровая грамата,
3) крыж Ефрасінні Полацкай, 4) біблія, 5) готыка.

15. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) Дзяды, 2) крыжовыя паходы, 3) Дзень жанчын,
4) Залаты век, 5) лютаўская рэвалюцыя.

## Правілы пераносу

*136. Праілюструйце прыведзеныя палажэнні і правілы, выкарыстоўваючы прапанаваныя словы і скарачэнні.*

| | |
|---|---|
| 1. З аднаго радка на другі словы пераносяцца па складах | |
| 2. Нельга пакідаць у канцы радка або пераносіць на наступны радок частку слова, якая не ўтварае склад | |
| 3. Не пакідаецца на радку і не пераносіцца адна літара, нават калі яна ўтварае склад | |
| 4. На наступны радок пераносіцца як ўсё спалучэнне зычных, якое знаходзіцца ў сярэдзіне слова паміж галосных, так і любая яго частка | |
| 5. Нельга раздзяляць літары **дз** і **дж**, якія абазначаюць адзін гук | |
| 6. Літары **й, ў, ь** і **апостраф** нельга аддзяляць ад папярэдняй літары | |
| 7. Кожная частка складанага слова пераносіцца згодна з правіламі пераносу асобных слоў | |
| 8. Не падзяляюцца для пераносу абрэвіятуры, якія пішуцца вялікімі літарамі або складаюцца з літар і лічбаў | |
| 9. Нельга адрываць скарочаныя назвы адзінак вымярэння ад лічбаў, да якіх яны адносяцца | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 10. Не адрываюцца пры пераносе ад лічбаў далучаныя да іх злучком канчаткі або часткі канчаткаў | |
| 11. Нельга пры пераносе разбіваць умоўныя графічныя скарачэнні | |
| 12. Нельга адрываць ад прозвішчаў ініцыялы | |
| 13. Не пераносіцца на наступны радок злучок (дэфіс), які супадае са знакам пераносу | |

ААН, А-78, аб'ява, большы, бяскрыўдна, вастракрылы, дваццаць, ідэя, кніга, маскі, медзь, насенне, надзейны, падземны, па-мойму, праўда, словаўтварэнне, ураджай, фае, хата, Я.Ф. Карскі, 15 км, 50 кг, 80 м, а 16-й (гадзіне), 9-е.

*137. Выпішыце: а) словы і спалучэнні, якія нельга пераносіць; б) словы, якія дапускаюць варыянты пераносу (пакажыце іх).*

Авёс, аддаць, алея, байка, БДПУ, востраў, галлё, г. д., дажджы, дзеепрыслоўе, зайсці, заўтра, зіма, Іван, 25 км, мыцца, надзея, падзея, падыход, подпіс, поўны, праўнук, раз’езд, раскрыць, рэйка, 8-га (сакавіка), сваё, слоўнік, XIX ст., стст., трыццаць, ТУ-144, ТЭЦ-4, унія, хадзіць, 10 ц, Я. Брыль, яліна.

*138. Запішыце тэкст, падзяляючы кожнае слова для пераносу.*

**Узор**: бе-ла-ру-ская вус-ная на-род-ная твор-часць.

Пра нашы казкі, песні, прымаўкі, наогул, фальклор сказана і напісана нямала самых хвалебных слоў. І справядліва сказана і напісана! Бо ў нашым фальклоры ёсць усё – шматвяковы вопыт, мудрасць, вера ў лепшую будучыню, мары і спадзяванні. І, вядома ж, тое, што гадамі будзе набываць яшчэ больш вагі і вартасці – слова наша, мова – золата, якое ніхто ў нас не адніме ні пры якіх акалічнасцях, яно будзе з намі, пакуль жывём, саграваe нас, даказвае ўсім, што мы не бязроднае племя, а народ, маем такое багацце, якое ніхто не меў і мець не будзе. Яно было і будзе наша! (Б. Сачанка).

*Назавіце лексемы, якія нельга падзяліць для пераносу.*

*Пакажыце магчымыя варыянты пераносу слоў са спалучэннем зычных у сярэдзіне.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэст

Адзначце няправільныя варыянты пераносу слоў:

| | А | Б | В |
|---|---|---|---|
| 1 | аб-гледзець | абглед-зець | абгле-дзець |
| 2 | ад-звінець | адз-вінець | адзві-нець |
| 3 | адзі-наццаць | адзіна-ццаць | адзінац-цаць |
| 4 | без-апеляцыйна | бе-запеляцыйна | безапеляцы-йна |
| 5 | да-жджамер | даж-джамер | дажд-жамер |
| 6 | за-ўтра | заў-тра | заўт-ра |
| 7 | за-цішша | заці-шша | заціш-ша |
| 8 | на-сенне | насе-нне | насен-не |
| 9 | пад’-язджаць | пад’яз-джаць | пад’язд-жаць |
| 10 | па-джаць | пад-жаць | паджа-ць |
| 11 | пад-земны | падзе-мны | падзем-ны |
| 12 | перай-сці | пера-йсці | перайс-ці |
| 13 | раз-‘юшаны | раз’-юшаны | раз’юша-ны |
| 14 | ра-ссякаць | рас-сякаць | расся-каць |
| 15 | са-джанец | сад-жанец | саджа-нец |
| 16 | сенаў-борка | сена-ўборка | сенаўбо-рка |
| 17 | су-ддзя | суд-дзя | судд-зя |
| 18 | уз-ысці | узы-сці | узыс-ці |
| 19 | Я-понія | Япо-нія | Японі-я |
| 20 | я-снасць | яс-насць | ясна-сць |

# Правапіс скарачэнняў

*139. Запішыце скарачэнні наступных слоў.*

Адзіночны лік, беларуская мова, востраў, выбухны гук, выклічнік, гарадскі пасёлак, гэта значыць, давальны склон, дыялектная лексіка, жаночы род, займеннік, заслужаны работнік вышэйшай школы, кніжны стыль, лічэбнік, напрыклад, народна-паэтычнае слова, памяншальна-ласкальнае слова, пераноснае значэнне, складаназлучаны сказ, спецыяльны тэрмін, уласна беларускае слова, загадчык, сантыметр, выконваючы абавязкі, інфінітыў, злучнік, спецыяльны.

*140. Расшыфруйце ўмоўныя скарачэнні.*

К. ф. н., га, км, кг, т, А, В, камен. вугаль, зб., з-д, с.-г., ст., т-ва, гіст., вобл., ст.-сл., ін-т.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАВІЛЫ ПУНКТУАЦЫІ

## Знакі прыпынку ў канцы сказа

*141. Адкажыце, які знак прыпынку трэба паставіць у канцы сказа, калі гэта: 1) апавядальны сказ; 2) пабуджальны сказ; 3) сказ з клічнай інтанацыяй; 4) пытанне; 5) незакончанае выказванне; 6) загаловак; 7) зваротак; 8) назоўны тэмы; 9) абрыў пералічэння; 10) ускоснае пытанне.*

*142. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказаў у тэксце. Вызначце віды сказаў паводле мэты выказвання.*

Лёсе мой жорсткі! Калі ж ты дазволіш мне зноў убачыць першыя мэндлі на ўзгорку за роднаю вёскай, адчуць іржаную духмянасць, пачуць сардэчную музыку жніўнай песні?..

Слоў там як быццам і няма. Жыве яна, песня, тугой і верай, жыве невымоўным, да слёз хвалюючым сумам спрадвечнай і неўміручай паэзіі, проста сама для сябе… Як куст шыпшыны, пяшчотна-ружовыя кветкі якое цвітуць пры пясчанай, журботнай дарозе, пакрытыя пылам… Як песня аўсянкі – не аднастайны, не, а невычэрпна тужлівы, салодкі, наіўны напеў над аціхлым пад вечар калоссем на ўзлеску…

Чую яе, тую песню, лаўлю душою ў свеце маёй памяці. І зноў здзіўляюся, якія дзіўныя, незразумелыя шляхі ў нашых думак і пачуццяў (Я. Брыль).

*143. Спішыце тэкст, устаўце прапушчаныя літары, пастаўце ў канцы сказа неабходныя знакі прыпынку.*

…осень Пара з…латая і тужлівая, разам з тым мудрая, як само жыц…ё С…ляне, закончыўшы працу ў пол…, абмалочвалі на таках збож…а, м…лі па …осецях лён, трапалі каноплі У канцы в…расня і пачатку кастрычніка наступала кароткае бабіна лета – дні для жанчын светла(сумныя), як іх жыц…ёвы лёс

…осен…скія пес…ні – гэта пес…ні смутку і тугі А колькі ў іх п…тычна аздобленай мудрас…ці С…пяваліся яны звычайна дзяўчатамі і сталымі кабетамі на супрадках – до…гімі і тужлівымі …асен…імі вечарамі

А найбольш у …осен…скіх пес…нях падаваліся пачуц…і маладой дзяўчыны, што жыла ў трапяткім чакан…і блі…кага вясел…я і ў тр…вожным пра…чуван…і хуткага ра…вітан…я з домам, з бац…камі

Якім яно будзе, жыц…ё жанчыны замужам

Таму такія …чымлівыя гэтыя …осен…скія пес…ні, кранаюць яны душу сумнымі сваімі матывамі (А. Бруцкі).

*144. Падзяліце тэкст на сказы. Спішыце, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку, растлумачце іх.*

Слова ***карова*** чаму яно пішацца па-руску праз ***о***, а па-беларуску праз ***а*** граматыка тлумачыць проста: у беларускай мове дзейнічае закон акання, калі ***о*** не пад націскам пераходзіць у ***а*** але адкуль узялося гэтае ***о*** куды цікавей, мабыць, ведаць, што слова ***карова*** прыйшло ў славянскія мовы з лацінскай, а там утворана ад слова ***корну*** – рог у рускай мове, каб пазначыць рагатую жывёлу, узялі корань ***кор-*** і праз суфікс ***-в-*** далучылі канчатак ***-а*** атрымалася стараруская ***корва***, з якога пазней узнікла ***корова*** лацінскае слова ***корну*** робіць больш даступным і сугучнае з ***каровай*** слова ***карона*** (галаўны ўбор носьбіта ўлады – караля, цара), бо ў ім той самы корань – ***корну***, што значыць рагаты вянец з калючкамі – карона (Паводле У. Юрэвіча).

# Правілы пастаноўкі працяжніка

## *Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам*

*145. Прачытайце прыказкі. Вызначце, чым выражаны дзейнік і выказнік. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.*

1) На сваім сметніку і певень – гаспадар. 2) Зямля як талерка: што пакладзеш, тое і возьмеш. 3) Гусь свінні не сяброўка. 4) Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць. 5) Ты гамоніш, а ён – шмыг. 6) Лянівы і санлівы – два браткі. 7) На бязлюддзі і мы людзі. 8) Пажар горшы за злодзея. 9) Век звекаваць – усяго спазнаць. 10) Першы блін комам.

*146. Падбярыце ці складзіце сказы ў адпаведнасці са схемамі:*

Назоўнік – інфінітыў.

Лічэбнік – лічэбнік.

Назоўнік – выклічнік (гукапераймальнае слова).

Назоўнік – фразеалагізм.

Назоўнік назоўнік.

*Растлумачце, як размежаваць дзейнік і выказнік, выражаныя назоўнікамі?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*147. Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку і раскрываючы дужкі. Падкрэсліце дзейнік і выказнік, вызначце, чым выражаны галоўныя члены сказа.*

1) Лашчыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе, але найлепшая згода для чалавека згода (з,с) самім сабою, (з,с,са) сваім сумле(н,нн)ем (М. Старальцоў). 2) Жыццё заўжды іспыт на мужнасць. Яе ж не воз(ь)меш(ь) напракат…(Н. Мацяш). 3) Шчырасць гэта праз мудрасць дарога (В. Аколава). 4) Ды лепшая памяць аб мёртвых ваша любоў да жывых (А. Вярцінскі). 5) Жыццё бы той гас(ь)цінец, па якім праходзім в(е,я)рсту за в(е,я)рстою (С. Яновіч). 6) Жыццё і жыта вечная радня (С. Законнікаў). 7) Дараваць не для кожнага гонар… (В. Аколава). 8) Жыццё то ўзвы(ш,шш)а, то правал (Р. Баравікова). 9) Запасіць толькі чужое, (не)развіваючы свайго … гэта значыць глуміць народную душу (М. Багдановіч). 10) Жыць кідаць зерне ў ворыва спорна, садзіць маладыя лясы і сады. Дотыкам ног цалаваць тое поле, дзе ця(ш,ж)ка ступалі бац(ь)кі і дзяды (Л. Геніюш). 11) Капацца ў мінулым варушыць набліжаць будучае (Я. Сіпакоў). 12) Мы насенне жыцця. Мы вырастаем людзьмі. Аднак бесперастанку шукаем і час, і месца, каб вырасці цэлым светам (А. Разанаў). 13) Цудоўная рэч(ь) жыццё (І. Шамякін).

*Назавіце сказы, у якіх у адпаведнасці з правілам працяжнік не ставіцца. У якіх з іх, на вашу думку, можна выкарыстаць працяжнік з мэтай сэнсава-інтанацыйнага вылучэння выказніка?*

*148. Выпішыце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам трэба паставіць працяжнік. Расстаўце знакі прыпынку.*

Зборы прыказак гэта не шкатулка з калье бранзалетамі завушніцамі на туалетным століку прыгажуні. Збор народных прыказак створаных дасціпнымі і мудрымі людзьмі гэта матэрыялізаваная ў сціслым і зіхоткім слове народная душа філасофія жыцця апраўданне чалавечай прысутнасці на зямлі абгрунтаванне сэнсу індывідуальнага асабістага і грамадскага гістарычнага існавання духоўная хартыя народа яго пашпарт на нацыянальную творчасць і несмяротнасць у свеце. Менавіта агульначалавечае ў прыказках розных народаў зблiжае братае людзей памнажае давер паміж імі вядзе да дружбы і гуманістычнай супольнасці.

Нацыянальная прыказка скарбонка духоўнай сілы народа яго здольнасці арыентавацца ў складаным супярэчлівым і многа дзе неспазнаным

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

свеце. Вось гэтая неспазнанасць і знешняга і ўнутранага чалавечага свету здаўна надавала прыказцы арэол таямнічай празорлівасці запаветнай святасці. Людзі бачылі ў прыказцы бляск Божай мудрасці празорлівасць волі (У. Калеснік).

## Працяжнік у простым сказе

*149. Прачытайце вершасказы і пункціры Алеся Разанава. Вызначце, якую функцыю выконвае працяжнік: 1) сэнсава-інтанацыйна выдзяляе прыдатак; 2) сэнсава-інтанацыйна выдзяляе выказнік; 3) пастаўлены на месцы прапушчанага члена сказа; 4) пастаўлены паміж аднароднымі членамі сказа ці перад абагульняльным словам.*

**1**
Стаяць на балоце
стагі
з аснежанымі вярхамі –
тутэйшыя горы.

**2**
На непарушным снезе
лёгкі заечы след
і чалавечы –
цяжкі.

**3**
Ходзіць паважны грак
між квітнеючых сліў
па двары –
гаспадар,
што вярнуўся з замежжа.

**4**
Зіхоткая поўня –
акно,
з якога
глядзіць у душу нябыт.

**5**
Ускрай маладога жыта
сінія васількі –
сінія буквіцы
ў кнізе лета.

**6**
Світае.
З глыбінь чалавечага сну
ўваскрасаюць сонца
і – чалавек.

**7**
У лесе пахмурым
бярозы –
белыя паланянкі.

**8**
Развітваемся:
прастора
ўбірае словы,
словы – прастору.

**9**
Канчаецца лета:
лісце
туліцца да галіны,
галіна –да дрэва,
дрэва – да каранёў.

**10**
Адчыняю паштовую скрынку:
газета, часопіс, ліст… –
усё, што было і раней шмат разоў.
А кожны раз
чакаецца незвычайнае – вестка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**11**
Людзі
глядзяць у будучыню,
мінулае –
на людзей.

**12**
Пачатак вясны –
сустрэча
усіх пораў года.
Хто яшчэ ходзіць у шапках зімовых,
хто – ужо ў летніх,
а хто – наогул без шапак.

**13**
Кружацца ўвышыні буслы –
неўзабаве вырай.
Пазіраем на іх –
і паглядам адлюстраваным
бачым сябе.

**14**
Адной палавінаю жыцця набываю,
другой – трачу:
раскрыжаваны ў самім сабе.

**15**
Мы абышлі ўсю зямлю –
і вярнуліся на ранейшае месца:
жаўцее лісце на дрэвах,
да неба ўздымаюцца птушкі,
і невядомай дарогаю час ідзе,
не сыходзячы з месца.

**16**
На адну шалю вагаў
паклаў я хлеб,
на другую – камень,
але калі яны ўраўнаважыліся,
не змог
паверыць, што важыць хлеб
гэтулькі ж,
колькі камень.

*150. Прачытайце разважанні Я. Сіпакова. Вызначце, наколькі абаснавана пастаноўка працяжніка ў тэкстах. Запішыце выказванні, у якіх на месцы працяжніка можа быць пастаўлены іншы, варыянтны, знак прыпынку або знак прыпынку можна не ставіць.*

Пісьменніку, які добра ведае чалавека, часам дастаткова бывае якой-небудзь адной дэталі, адной рыскі ў ім, каб узяўшыся за яе, як за нітку, разматаць увесь клубок – яго жыццё.

Народная творчасць. У ёй ёсць усё – філасофія і геаграфія, раман і аповесць, характары людзей і багацце сюжэтных ліній, едкая сатыра і самая смелая фантазія… З яе вырасла ўся творчасць. Яна – Адам і Ева кожнай літаратуры.

Усё створана для любові, усё падпарадкавана яе мудрым законам, і таму нам – і ў жыцці, і ў літаратуры – не трэба парушаць гэтай задуманай гармоніі.

Пісьменнік павінен шчыра, аднолькава перажываць за ўсіх сваіх герояў – і за станоўчых, і за адмоўных.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Іхнія беды – яго беды, іхнія радасці – яго радасці.

Таленавіты творца вучыцца сам, няздатны – вучыць іншых.

*151. Спішыце сказы, ставячы на месцы пропуску, дзе трэба, працяжнік. Патлумачце, у якіх выпадках: 1) трэба паставіць толькі працяжнік; 2) можна паставіць іншы знак прыпынку; 3) знак прыпынку можна не ставіць.*

1) Пустазелле губіць поле, а няслава _ усё людскае (В. Аколава). 2) Акадэмікі і хірургі, паэты і маршалы _ усе былі вучнямі, іх талент разбудзіў просты вясковы настаўнік (С. Грахоўскі). 3) Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы _ час _ мае вечнага свайго спадарожніка _ працу (К. Чорны). 4) Хай там нейкім пракорам, празорцам, святым _ свет ніколі без іх не бывае _ ясна загадзя усё, але толькі не тым, хто нялёгкіх адказаў шукае (А. Бачыла). 5) Няхай жыве ў душы былое _ не дробнае і не малое!.. (Е. Лось) 6) Пакінь адну пасаду _ быць Чалавекам на зямлі (С. Грахоўскі). 7) Паэтаў акрыляе страта _ і загартоўвае _ яна (Я. Янішчыц). 8) Паэтаў вабіць Хараство, як матылькоў _ святло Венеры (Э. Акулін). 9) Палын і чарнобыль _ браты з даўніны… Яны _ пагарэльцы і сведкі вайны _ па свеце вандруюць спрадвеку (Р. Барадулін). 10) Беражыце ў жыцці не гадзіннік _ гадзіны (К. Цыбульскі).

## Тэст

1. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам звычайна не ставіцца:

1) калі дзейнік стаіць пасля выказніка, выражанага назоўнікам;

2) калі абодва галоўныя члены сказа выражаны лічэбнікам у назоўным склоне;

3) калі паміж галоўнымі членамі сказа стаіць прыслоўе або часціца;

4) калі абодва галоўныя члены сказа ці адзін з іх выражаны інфінітывам;

5) калі дзейнік выражаны назоўнікам, а выказнік – прыметнікам.

2. Назавіце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам неабходна паставіць працяжнік:

1) Самае складанае ганчарства гэта ляпіць чалавека (А. Бадак).

2) Здольнасць да абнаўлення прымета сапраўднага таленту (М. Стральцоў).

3) Паэт у жыцця не нахлебнік, ён сейбіт, змагар і прарок (С. Законнікаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Прызванне паэтаў вырошчваць рэха (А. Разанаў).

5) Сутнасць верша не «ядро арэха», а ўвесь арэх (А. Разанаў).

3. Назавіце сказы, у якіх паміж дзейнікам і выказнікам працяжнік не ставіцца:

1) Хлеб над панамі пан.

2) Музыка-дудар невялікі гаспадар.

3) Бяда ды мука тая ж навука.

4) У пазыку браць не кнігу чытаць.

5) У хвацкага атамана і я не паганы.

4. Колькі працяжнікаў неабходна паставіць у радках:

Гаварыць з незнаёмым чалавекам, які разумее цябе, асалода. Маўчаць з блізкім чалавекам, які таксама разумее цябе, яшчэ большая асалода.

5. Працяжнік ставіцца:

1) пасля абагульняльнага слова перад аднароднымі членамі;

2) паміж аднароднымі членамі сказа на месцы прапушчанага супраціўнага злучніка;

3) калі выказнік выражаны ўсечанай формай дзеяслова;

4) перад развітым прыдаткам, які стаіць у канцы сказа;

5) паміж дзейнікам і выказнікам, калі адзін з іх выражаны займеннікам.

6. Адзначце сказы, у якіх працяжнік стаіць на месцы прапушчанага члена сказа:

1) Галоўнае для чалавека – паверыць у сваё паўтарэнне! (С. Законнікаў).

2) Я ў крузе, дзе слова шукае слова, а чалавек – Чалавека (А. Разанаў).

3) Не з чаркі – з сэрца роднага народа, пяюння-мова, п'ю цябе да дна (Л. Геніюш).

4) Якой жа моваю, скажы мне, мы будзем гутарыць з табой. Я – не валодаю чужымі, ты, бог, – не ведаеш маёй (Н. Гілевіч).

5) Тварыць дабро патрэбен талент, прыносіць гора – толькі злосць (С. Грахоўскі).

7. Адзначце, якое сцвярджэнне пра сказ правільнае:

Праходзілі вякі, адыходзілі ў нябыт пакаленні, знікалі і развальваліся магутныя імперыі, а кніга – вялікі цуд, створаны чалавечым розумам, – жыла, хвалявала сэрца, абуджала думку, клікала да сацыяльных перамен (С. Александровіч).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) працяжнікі выдзяляюць адасобленыя азначэнні;

2) працяжнікі выдзяляюць прыдатак, які стаіць у сярэдзіне сказа пасля азначаемага назоўніка;

3) працяжнікі выдзяляюць устаўную канструкцыю.

8. Вызначце, якую функцыю выконваюць працяжнікі ў сказе:

*Зіма для скульптара –[а] гэта магчымасць засяродзіцца, асэнсаваць новыя ідэі, папрацаваць з цудоўным пластычным матэрыялам –[б] глінай, такой паслухмянай рукам. А летам –[в] камень, самы цяжкі, але ўдзячны скульптурны матэрыял (У. Мароз).*

1) працяжнік выдзяляе ўстаўную канструкцыю;

2) працяжнік выдзяляе прыдатак;

3) працяжнік стаіць паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў назоўным склоне;

4) працяжнік стаіць на месцы прапушчанага члена сказа;

5) працяжнік стаіць паміж аднароднымі членамі сказа.

9. Адзначце сказы, у якіх працяжнікі могуць быць заменены іншымі знакамі прыпынку:

1) Гісторыя – агромная спіраль, што абвіла сусветныя абшары (А. Ставер).

2) Праз колькі стагоддзяў мы будзем удзячны ім – Францыску Скарыне, Сымону Буднаму, Васілю Цяпінскаму – за тое, што яны першымі на Беларусі пачалі друкаваць кнігі (В. Вольскі).

3) Змрок – густы, халодны, непрывычны – нерухома аблягаў зямлю (Я. Колас).

4) Адзіна правільны шлях – будаваць на камені духоўнасці, веры, а не на пяску нашай змучанай пакутамі веку душы (У. Мароз).

5) Каля ручая, што ўпадае ў раку – яна завецца таксама Старыца, – у маладым бярэзніку стаяла невялікая драўляная царква (Т. Хадкевіч).

10. Адзначце, на месцы якіх пропускаў трэба паставіць працяжнік:

Жыццё зямное_[1] непаўторны дар_[2] дзе кожны дзень_[3] і творчасць_[4] і натхненне. Над ім не ты _[5] народ твой гаспадар! (А. Звонак).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Знакі прыпынку
# ў простым ускладненым сказе

## *Аднародныя члены сказа*

*152. Прачытайце і адгадайце загадкі. Якімі членамі сказа з'яўляюцца аднародныя члены і як яны звязаны паміж сабой? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.*

1) Свеціць і грэе, весяліць іззяе, усю зямлю ажыўляе. 2) Па моры імчыцца, пад ветрам гуляе, да берага дойдзе – адразу знікае. 3) Ні рук, ні ног не мае, а яблыкі страсае. 4) Без страху, без гора пралятае рэкі і мора. 5) Сядзіць Рыгор паміж гор, мячом падпёршыся, плашчом накрыўшыся. 6) У траве, як аганькі, ружавеюць вугалькі, іх вадою не зальеш, рук і ног не апячэш. Дзень і ноч гараць, палаюць, смак яны мядовы маюць. 7) Конь сталёвы арэ, жне і косіць і есці не просіць. 8) Сарока-белабока да хаты прыляцела, у парозе села, з-за мяжы і з усёй краіны прынесла навіны. 9) Сам весіць грам, а ловіць рыбу з кілаграм. 10) Каціліся біруліцы па вуліцы, ускаціліся на двор, надуліся, як мех, белы сталі, як снег.

**Адгадкі**: вецер, газета, гарбуз, гусі, кручок, птушка, сонца, суніцы, трактар, хваля.

*У якіх выпадках паміж аднароднымі членамі можна паставіць працяжнік?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*153. Дапоўніце схему.*




*154. Суаднясіце схемы і сказы. Запішыце сказы, расставіўшы знакі прыпынку, аднародныя члены сказа падкрэсліце ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй.*

| | |
|---|---|
| О, О, О | О і О, О, але О |
| О і О | О і О, О, О |
| і О, і О | О, а О |
| О, і О, і О | О, О, а О |
| О і О, О і О | не толькі О, але і О |

1) Песня і казка ходзяць у пары сеюць па свеце дзівы і чары (Я. Купала). 2) Урач не толькі ратуе ад смерці але і выклікае веру ў жыццё (А. Пальчэўскі). 3) За кожны позірк свой і рух за думку ў кожнай фразе за чысціню душы і рук я прад людзьмі ў адказе (М. Федзюковіч). 4) Важны і галоўны і самы светлы талент – дабрата (С. Грахоўскі). 5) У будучыню дзверы не ў часе а ў душы (А. Разанаў). 6) Вечны свет а я – жыхар часовы… Ды вучуся ў зерня і раллі радавацца і душой і словам усяму жывому на зямлі (С. Законнікаў). 7) Ёсць імгненне жыцця і імгненне смерці і імгненне веры ў вечнасць жыцця (У. Караткевіч). 8) Шляхі праўды як і ў гісторыі так і ў жыцці чалавека заўсёды цяжкія (У. Мароз). 9) Навошта ж на зямлі сваркі і звадкі боль і горыч калі ўсе мы разам ляцім да зор? (М. Багдановіч). 10) Калі шчасця трэба дабівацца – гэта ўжо не шчасце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шчасце прыходзіць натуральна і непрыкметна часцяком нечакана але заўсёды заслужана за турботы шчырыя і справы духоўныя (Г. Марчук). 11) Каханне грошы славы сверб – мана: няўмольны час завабіць імі сэрца памучае а потым насмяецца, – не здраджвае Радзіма нам адна (А. Мінкін). 12) Любоў і лад узвышаюць вядуць за далягляд. Варожасць і злосць прыніжаюць адкідваюць назад (А. Вярцінскі).

*Назавіце сказы, у якіх: 1) аднародныя члены з'яўляюцца сінонімамі; 2) выкарыстаны словы-антонімы; 3) некалькі радоў аднародных членаў; 4) злучнік* ***а*** *звязвае часткі складаназлучанага сказа.*

*155. Складзіце і запішыце сказы ў адпаведнасці са схемамі.*

| | |
|---|---|
| О, О, і О, і О, і О, і О | О або О |
| хоць і О, але О | О, ды О |
| як О, так О | О ды О |
| ці О, ці О, ці О | О, затое О |

*156. Запішыце выказванні Я. Сіпакова, устаўляючы замест кропак словы, якія з'яўляюцца аднароднымі ў адносінах да выдзеленых.*

І. Люблю, калі фраза **не існуе** а … ў сказе. Бо можа быць сказ сам па сабе, які не выспеў у фразу. Люблю калі яны яднаюцца – і **сказ** і…, – і **паўнакроўна** …, як спрамленая рака, а як рака жывая, з усімі **паваротамі**… нясуць **не голую** а напоўненую **рухам** і … думку.

ІІ. Розніца паміж вугалем і … вызначаецца адно толькі размяшчэннем атамаў.

Розніца паміж сапраўдным творам і … таксама вызначаецца той жа самаю дробяззю – усяго толькі размяшчэннем літар, … .

**Словы для даведак:** алмазам, гармоніяй, жыве, не прамалінейна, падробкаю, парадкам слоў у сказе, петлямі і вірамі, фраза.

*157. Запоўніце табліцу, праілюструйце кожнае палажэнне прыкладам.*

| Азначэнні | |
|---|---|
| з'яўляюцца **аднароднымі,** калі: | з'яўляюцца **неаднароднымі**, калі: |
| | |

1) характарызуюць розныя прадметы або адзін прадмет паводле адной прыметы (колер, матэрыял, форма, памер, якасць і г. д.), як правіла, гэта прыметнікі аднаго лексіка-граматычнага разраду;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) характарызуюць прадметы з розных бакоў, яны выражаюцца звычайна прыметнікамі розных разрадаў, не могуць звязвацца злучнікамі;

3) адно з іх – эпітэт (вобразнае азначэнне);

4) выражаны прыметнікам і займеннікам, прыметнікам і лічэбнікам;

5) першае з іх адзіночнае, а другое развітае (выражана дзеепрыметнікавым або прыметнікавым словазлучэннем);

6) развітае азначэнне размешчана перад адзіночным;

7) дапасаваныя азначэнні ўжываюцца разам з недапасаванымі;

8) дапасаваныя азначэнні стаяць пасля паяснёнага слова;

9) гэта недапасаваныя азначэнні.

*158. Прачытайце тэкст, выбіраючы з азначэнняў, запісаных у дужках, тое, што падыходзіць па сэнсе. Знайдзіце аднародныя і неаднародныя азначэнні.*

Валачобнікі

Валачобнікі – гэта нешта надзвычай прыгожае урачыстае прыстойнае цырымоннае. Збіраліся на Вялікдзень самыя (рухавыя, рухлівыя) вясёлыя (няўрымслівыя, няўцямлівыя) аднавяскоўцы і разам з гарманістам хадзілі ад хаты да хаты, прыгожа спяваючы. Святочна (апранутыя, надзетыя) знешне (шчаслівыя, ашчасліўленыя) чыста (вымытыя, памытыя) яны зусім не нагадвалі (зрабаваных, разрабаваных) (абяздоленых, беспраглядных, трагічных) задушаных працай людзей. Сапраўды Бог спускаецца на зямлю ў гэты дзень.

У кожнай хаце ўжо чакалі (святых, святочных) пасланцоў і нават пакрыўдзіліся б, каб яны абмінулі кагосьці.

Падыходзілі валачобнікі да акна і спявалі…

Спевы былі (ненаглядныя, пекныя, прыгожыя), (квяцістыя, маляўнічыя, мілагучныя) (аптымістычныя, прыўзнятыя, узнёслыя), як і душы тых пакрыўджаных лёсам людзей. Калі не памыляюся, валачобніцкія песні называліся васоламі.

Калі спевы толькі пачыналіся, шчаслівая гаспадыня адчыняла акенца і з пашанай слухала іх, а потым праз акно падавала валачобнікам ад свайго стала ўсё, чым была багата гэтая хата. Падарункі складвалі ў (аграмадны, буйны, вялізны) плецены кош, які нехта з валачобнікаў насіў на рэмені цераз плячо, – і гэтак ад хаты да хаты. Такое святкаванне аб’ядноўвала людзей, збліжала іх.

Калі хаты былі «абпетыя», збіраліся ўсе аднавяскоўцы на сонейку і, паслаўшы посцілкі на траву, працягвалі свята за агульным (велічным, свя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

точным, урачыстым) «сталом».

Сёння нашыя дзверы і вокны шчыльна зачынены… (Паводле С. Давідовіча).

*Якія яшчэ народныя святы вы ведаеце? Падрыхтуйце паведамленне і раскажыце пра адно з іх.*

*159. На месцы пропускаў пры неабходнасці ўстаўце злучнікі (**і**, **ці**) і афарміце сказ так, каб у ім трэба было паставіць: 1) тры коскі; 2) дзве коскі; 3) адну коску; 4) ніводнага знака прыпынку.*

На наступным тыдні чакай ад мяне … пісьмо … тэлеграму … адразу ж выязджай цягніком … на аўтамабілі.

*160. Дапоўніце схему, праілюструйце яе ўласнымі прыкладамі.*




*161. Спішыце тэкст, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены сказа і абагульняльныя словы ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй. Складзіце схемы аднародных членаў сказа і растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.*

Назвы ўзнікаюць паўсюдна, дзе жыве чалавек. Адны з іх вядомыя больш-менш шырока, бо з'яўляюцца абазначэннямі дастаткова буйных геаграфічных аб'ектаў гарадоў вёсак рэк азёр. Гэта афіцыйныя, абавязковыя назвы, якія трапляюць на карты і ў геаграфічныя апісанні

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

і слоўнікі. Але ўнутры амаль кожнага населенага пункта заўсёды ёсць неафіцыйныя найменні частак пасялення асобных кварталаў канцоў вуліц перавулкаў прагонаў садоў могілак. У наваколлі вёскі сваё найменне мае ўсё ручаі калодзежы і крыніцы багны віры і броды месца вадапою жывёлы. Мясцовае насельніцтва не абыходзіцца без імёнаў бліжэйшых узвышшаў узгоркаў і курганоў яроў далін і пячор. Лясныя ўгоддзі невялікія месцы ў лесе гаі лясныя палянкі прасекі і высекі балоты лугі і паплавы а таксама палі сады ягаднікі пасекі выганы торфараспрацоўкі кар'еры ўсё, як правіла, мае асобную назву.

Гэта і ёсць мікратапонімы. Спецыялісты лічаць, што ў наваколлі адной вёскі можна сабраць каля 150–200 падобных назваў.

Напэўна, будзе мала проста сказаць, што імёны невялікіх геаграфічных аб'ектаў з'яўляюцца каштоўнымі фактамі жывымі прыкладамі моўнай творчасці народа сапраўднымі гістарычнымі помнікамі. Каб зразумець гэта трэба сутыкнуцца не з адной ці з дзвюма назвамі неабходна пазнаць і зразумець усю сістэму найменняў, напрыклад, адной якой-небудзь вёскі. І толькі ва ўзаемасувязі мікраназвы па-сапраўднаму загучаць і раскажуць і пра гісторыю асваення адпаведных мясцін і пра першых пасяленцаў і пра розныя здарэнні і падзеі і пра мясцовую расліннасць і пра жывёльны свет а яшчэ па гэтых назвах можна пазнаць і асаблівасці рэльефу і якасць глебы ў розных месцах і тое, дзе, як і калі лепш касіць траву сеяць хлеб збіраць ягады і грыбы (Паводле А.Ф. Рогалева).

*У сказах з абагульняльнымі словамі памяняйце месцамі абагульняльныя словы і рады аднародных членаў. Як зменіцца пастаноўка знакаў прыпынку ў гэтых сказах?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Адасобленыя азначэнні, прыдаткі, акалічнасці, дапаўненні

*162. Прачытайце тэкст, назавіце адасобленыя члены сказа, вызначце іх сінтаксічную ролю і спосабы выражэння, растлумачце ўмовы адасаблення.*

Злое дрэва

Ля абочыны гарадской вуліцы добры чалавек пасадзіў вясной дрэва. Тоненькае, з ізумруднымі лісцямі, яно ласкава шалясцела пры кожным павеву ветру. Каб нікому не перашкаджаць сваім веццем, яно з усіх сіл

цягнулася ўгору, штогод адкладваючы кольца ў сваёй сарцавіне. Яму цяжка было расці на непрыгоднай глебе, дзе каменне перамешана з іржавым жалезам. Ды, каб жыць, трэба было ўтрымацца, і дрэва ўсім карэннем прабівалася ўглыб, з вялікай цяжкасцю здабываючы сабе спажыўныя сокі.

Доўга ніхто не звяртаў увагі на адзінокае дрэўца – расце сабе і расце. І гэта была самая шчаслівая пара ў жыцці маладой таполі. Толькі сонца і цёплыя дажджы не забывалі свайго выхаванца і ў цяжкую хвіліну заўсёды прыходзілі на дапамогу.

Але вось і людзі пачалі звяртаць увагу на прыкметна падужэлую таполю. Нейкі час хлапчукі зрывалі зялёнае лісце і спрабавалі сагнуць гібкі ствол, але дрэўца спружыніла і заўсёды выпрамлялася, з дакорам пахістваючы кронай.

Суседскі хлапчук, які ў сваім жыцці не пасадзіў ніводнага дрэўца, выпальваў штогодна на ствале таполі сваё імя, ды час, раўнадушны да зла і дабра і абыякавы да славалюбства, няўмольна сціраў гэтыя літары. Яны зараслі карой, пакідаючы на ствале шурпатыя сляды. А калі вазок будканторы воссю калёс садраў цэлы аскепак драўніны, час зарубцаваў рану толькі па краях, а ўсярэдзіне засталося дупло. Цяпер былыя саюзнікі дрэва, сонца і вецер, сталі яго непрыяцелямі і зусім несвядома падточвалі сілы дрэва.

Таполя не паддавалася часу і натужна рыпела, калі вельмі налягаў вецер, ды ніхто не прыслухоўваўся да голасу дрэва, людзі раўнадушна праходзілі міма.

Аднойчы ў буру дрэва пахіснулася і ўжо не змагло выпраміцца, марудна, з шумам, яно падала на тратуар, як толькі магло, папярэджвала прахожых аб небяспецы. Але і тут чалавек застаўся верны сабе: «Падумаеш, дрэва». І нават не паглядзеў угору. Гэта была апошняя памылка чалавека, ды выправіць яе было ўжо немагчыма. Чалавек і дрэва загінулі адначасна. Каля іх таўкліся людзі, і хтосьці сярдзіта сказаў: «Якое злое дрэва!»

Чалавека павезлі на машыне, а дрэва стары вазак і вартаўнік парэзалі на дровы. Неўзабаве і пілавінне размяло ветрам.

Гісторыя гэта ўжо даўно забылася, нават пень выкарчавалі людзі. Стары вазак спаліў сухія дровы, успамінаючы злое дрэва. А дрэва ярка гарэла ў печы, абаграваючы людзей сваім цяплом. Нават згараючы, яно заставалася добрым (І. Васілеўскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*163. Расстаўце знакі прыпынку ў сказах. Сказы запішыце, падкрэсліце азначэнні. Складзіце алгарытм пастаноўкі знакаў прыпынку пры адасобленых азначэннях.*

1) Бог – чалавек! І чалавек вялікі сваёй вялікай募 вераю ў людзей! (Т. Бондар). 2) Чалавек жа нават і акамянелы не бывае без сэрца (К. Чорны). 3) У нашым жыцці, як у палітры мастака, ёсць толькі адзін колер здольны даць сэнс жыццю і мастацтву. Колер кахання (М. Шагал). 4) Сапраўдны паэт у пэўнай ступені – прарок заклiканы ісці хоць на адзін крок наперадзе падзей (С. Грахоўскі). 5) Калі б ды кожны з маленства думаў, з першых лет, які ці светлы, ці прыгожы пакіне ў памяці ён след (Н. Гілевіч). 6) Народжаная тут у нашым краі спрыяе людзям прыказка старая, за век свой не сагнулася ў дугу (М. Маляўка). 7) Ніводзін гадзіннік сярэбраны ці залаты не можа зраўняцца з гадзіннікам сонечным гэтым, бо ён адзначае і час нараджэння, і час развітання з зямлёй (М. Танк).

8) Пасля розных паэм і вершаў
Мудрагелістых і наймаднейшых
Пра якія з усіх званіцаў
Вечна звон з фіміямам дыміцца;
Пасля заплеснявелых цытатаў,
Дапатопных кантычак, трактатаў –
Так прыемна чытаць на прыволлі,
На заснежаным іскрыстым полі
Верш адціснуты лапай куніцы,
Шарака, гарнастая, лісіцы
Ці напісаны каля стайні
Кіпцюрамі вароны звычайнай (М. Танк).

*164. Прачытайце тэкст, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Выпішыце азначэнні і словы, да якіх яны адносяцца, азначэнні ахарактарызуйце (дапасаванае ці недапасаванае, развітае ці адзіночнае, прыдатак).*

Мне ж здаецца, што мы павінны пакланяцца і сёння – і закінутай некуды на гарышча старэнькай сяўні, якая беражліва рассявала па свежай раллі буйныя зярняты жыта ці ячменю – акурат як сялянскія слёзы;

і забытаму, пачарнеламу, з’едзенаму шашалем цэпу, які адзін настойліва і паспяхова замяняў і складаную малатарню, і цэлы завод на полі – камбайн, увішна расказваючы ўсім пра свае «тры цапы»;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і патрэсканым ступе і жорнам, якія як маглі дапамагалі людзям у цяжкія часіны сабраць гаршчэчак груцы ці спячы шорсткі блін;

і дзяжы, якая і ў дні голаду (хоць і моцна закрыўшыся бічайкаю) берагла макулінку рошчыны і заўсёды заставалася ў хаце, як нейкі выклік, нейкая пагроза любому голаду: маўляў, голад усё роўна мінецца і ў хаце зноў запахне хлебам;

і печы, гэтай нястомнай працаўніцы, якая чарнела адна на папялішчы ў грозныя часіны пажараў і войнаў і ўсё роўна спраўна рабіла сваю звыклую работу – нібыта яна стаіць у хаце, а не пад адкрытым небам;

і калаўротам, і кроснам, якія панапралі, панаткалі ў свой час столькі перабіранак і ручнікоў, андаракоў і сарочак, без якіх былі б больш цьмяныя, цішэйшыя на колеры і на радасць вяселлі, радзіны ды іншыя гаваркія застоллі (Я. Сіпакоў).

*Складзіце і запішыце сказы, каб выпісаныя вамі азначэнні адасабляліся. Назавіце ўмовы адасаблення азначэнняў. Якія азначэнні (адасобленыя ці неадасобленыя), на вашу думку, больш ярка падкрэсліваюць прымету прадмета?*

*165. Складзіце схему «Адасабленне прыдаткаў», падбярыце адпаведныя прыклады-ілюстрацыі.*

*166. Абапіраючыся на складзеную схему, расстаўце знакі прыпынку ў наступных сказах.*

1) Свой век шчаслівую радоўку трэба не адбыць мне, а пражыць (С. Законнікаў). 2) Якая гэта ні з чым не параўнаная краса душы чалавечая сціпласць (Я. Скрыган). 3) Пакліканых шмат – сейбітаў мала. Але толькі імі абранымі не рвецца конча праз ліхалецці, недароды і падман крэўная повязь (У. Мароз). 4) Якія ж яны мудрыя і высокаадукаваныя нашы любыя непісьменныя матулі! (Я. Сіпакоў). 5) Асіліць не магу на тройку з мінусам адзін прадмет жыццё (М. Танк). 6) Хвалюе ўзнёслая, урачыстая “Зорка Венера” наш, беларускі гімн чыстаму каханню. Колькі ў ёй нявянучай прыгажосці… (Я. Брыль). 7) Літаратура не стварае звыклых матэрыяльных каштоўнасцей, яна не вырошчвае хлеб, не будуе заводы, не робіць машын. Яна вырошчвае, будуе, робіць, стварае самую высокую і самую галоўную матэрыяльную каштоўнасць на зямлі Чалавека (Я. Сіпакоў). 8) У кожнага зара сваіх надзей, радасці свае, свае турботы. Таму не можа звонкі салавей

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пяюн вясны спяваць па воўчых нотах! (Л. Геніюш). 9) Толькі дзве славутыя постаці Францыск Скарына і Кастусь Каліноўскі і гэтага ўжо, здаецца дастаткова, каб беларускаму народу адчуць, зразумець, усвядоміць, спасцігнуць сябе народам (Я. Сіпакоў).

*167. Выпішыце нумары сказаў, у якіх працяжнік ставіцца пры адасобленых прыдатках.*

1) Павага – самае святое, бо людзей з нас лепіць на зямлі (Н. Мацяш). 2) Дзівакі, вандроўнікі, паэты – гэта водар жыцця і яго яснацвет (У. Караткевіч). 3) Цяжка, як без паветра, людзям жыць без паэта з ненацягнутым імем – прарок (В. Жуковіч). 4) Колькі ні давядзецца хадзіць пад сонцам, не пакіну хваліць, не стамлюся дзівіцца з незраўнанага цуду – кніга! (Я. Брыль). 5) Усё золата, якое толькі ёсць на свеце, – нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём (К. Чорны). 6) Дзеці – радасць і прыгажосць усіх народаў (Я. Брыль). 7) Жанчына дае жыццё, жанчына аберагае жыццё, жанчына і жыццё – сінонімы (С. Алексіевіч). 8) Нават найпершыя людзі – Адам і Ева – не былі адзінокія ў свеце (Н. Мацяш). 9) На карце міру хто паставіць кропку – пакорлівы палітык ці паэт? (Я. Янішчыц). 10) Купала, Колас і Багдановіч – гэта паэтычны трохкутнік, кожная з вяршынь якога паказвае ў будучыню і кідае праекцыю на яе… Вось чаму мы заўсёды будзем вяртацца да іх, трох выдатных песняроў, – вяртацца, каб ісці наперад (М. Стральцоў).

*168. Запішыце загадкі і іх адгадкі, раскрываючы дужкі і ўтвараючы ад дзеясловаў дзеепрыметнікі або дзеепрыслоўі. Расстаўце знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і акалічнасцях.*

1) Паміж гор сядзіць Рыгор капелюшом (накрыць). 2) Стаяў Рыгор між гор плашчом (накрыцца) слязьмі (абліцца). 3) Дзядок-барадач лыкам (падпаясаць) па падлозе ўпрысядкі скача. 4) Дваццаць без пятнаццаці, трох (не далажыць) двух (не далічыць). Колькі будзе? 5) Ні свет ні зара (сагнуцца) пайшоў са двара. 6) (Скруціць, звярцець) па хаце скача. 7) (Не піць, не есці) крычыць (ашалець). 8) Бягуць у лясок (задраць) насок. 9) (Не стукацца) праз шыбы заходзіць у хаты і сялібы (У. Карызна). 10) Ён прысмакаў з'еў нямала, а калі харчоў не стала лапу (смактаць) заснуў, ледзьве не праспаў вясну (В. Жуковіч).

**Адгадкі**: авёс, венік, грыб, званок, каромысел, нікольні, мядзведзь, сані, святло.

*169. Запішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя члены сказа ў адпаведнасці з іх сінтаксічнай функцыяй. Укажыце магчымыя пунктуацыйныя варыянты.*

1) Любоў нараджае не толькі дзяцей любоў нараджае не толькі надзеі любоў апрача людзей і надзей прыносіць сумненні й падзенні (А. Вярцінскі). 2) Жыццёвыя вартасці існуюць і жыццядзейнічаюць на пэўнай «адлегласці» ад чалавека адкрываючыся адно толькі звычайнаму зроку. Набліжаючы іх трацім іх: ні каханую, ні маці ў мікраскоп убачыць нельга (А. Разанаў). 3) Жыццё ідзе кругам вяртаючыся да пачатку смерць – нацянькі (А. Разанаў). 4) І як бы ні была вялікая дарога назад а азірнуўшыся чалавек на ёй убачыць самога сябе, бо праходзячы праз жыццё ён заўсёды аставаўся ў ім. А сходкі, якімі ён падымаўся ўгору праходзячы сваю дарогу – завуцца яго біяграфіяй (Я. Скрыган). 5) Бацька і маці і родная мова ўзнятая к славе амаль з небыцця паэтаў натхнёным і велічным словам для беларусаў – пытанне жыцця (Л. Геніюш). 6) Няшчасце яднае людзей абуджаючы ў душах тыя пачуцці і думкі, якія даюць надзею на святлейшую будучыню чалавецтва (Я. Брыль). 7) О, як лёгка існі адчуваючы матчыны рукі адчуваючы крылы юнацтва адчуваючы плечы каханай! І як цяжка цягнуцца ў далонях трымаючы толькі кульбаку ўспамінаў (М. Танк). 8) Няўмольным лёсам пакараны строга ты дабрыдзеш да роднага парога пабелены гадамі пілігрым… (П. Макаль). 9) У адрозненне ад торбы і скрыні абрус нічога не ўтойвае, нічога не пакідае на чорны дзень, ён адлюстроўвае і «правобразіць» той белы і русы дзень, тое вялікае свята, калі ўся зямля засцелецца абрусам прыязнасці і сяброўства і ўсе людзі Петрусі, Габрусі, Карусі і Марусі адхінуўшы брустверы і землятрусы, хаўрусы і бурсы нанава сустрэнуцца і пазнаёмяцца паміж сабой (А. Разанаў).

10) Не раз уладары
Шчаслівыя і закаханыя
Спынялі час.
І ў мяне не раз
З'яўлялася спакуса
Спрабаваць зрабіць
Нешта падобнае.
Але адчуўшы
Як пад нагамі
Прабіваецца свежая трава
Убачыўшы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як апяраюцца маладыя птушаняты
І пачуўшы як нараджаюцца
Новыя песні, –
Я свае рукі ўзнятыя
каб сонца затрымаць,
Зноў апусціў
На плуг (М. Танк).

## Параўнальныя звароты

*170. Прачытайце сказы, знайдзіце параўнальныя звароты. Спішыце, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.*

1) Людскую славу погалас хістае нібыта пёрка на капелюшы (У. Скарынкін). 2) Мудрасць крылатая яна як насенне дуба ляціць і ўкараняецца ўжо на вечнасць (Л. Геніюш). 3) Патрэбна як хлеб людзям слова… (С. Законнікаў). 4) Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы як стрэмкі (П. Панчанка). 5) Верны будзь слову якое ўпала з матчыных вуснаў як з неба у душу (Л. Геніюш). 6) І толькі слова толькі песні жывучыя як мой народ (С. Законнікаў). 7) Павагу і добрае слова ў нашыя мірныя дні давайце вучыцца нанова як хлеб у блакаду цаніць! (С. Законнікаў). 8) Дзень і жыццё ёсць у іх падабенства. Раніца звонкая нібы маленства поўдзень гарачы і дужы як сталасць вечар задумлівы ціхі як старасць (С. Законнікаў). 9) О мова! Усе як магеланы к табе мы вернемся наўпрост, каб ты знайсці дапамагла нам і ДОМ, і МАЦІ, і ПАГОСТ (Л. Галубовіч). 10) Нада мною – неба, сонца. А перада мною – далеч. Я іду за роднай песняй як вандроўнік за кульбакай як агонь – за сухавеем як рака – за крыкам чаек цень – за воблакам лятучым рэха – за раскатам грому (М. Танк).

## Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі

*171. Прачытайце тэкст, знайдзіце пабочныя словы і ўстаўныя канструкцыі, вызначце іх ролю ў сказах. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.*

Жорсткасць сярод моладзі, здаецца, набывае ўсё больш і больш пагрозлівыя памеры. Магчыма, гэта ўжо вынік рок-музыкі, пап-мастацтва, мас-культуры, якія нібыта сілаю насаджваюцца, укараняюцца сёння і ў нашай краіне: маўляў, калі нехта супраць гэтага, значыць, ён адсталы, несучасны чалавек.

Дык вось, бачачы, як бязлітаснасць, бяздушнасць, бесспагадлівасць (і не толькі сярод моладзі!) становіцца ці не галоўнаю модаю і адзнакаю сучаснасці, з журбою думаеш, што менавіта жорсткасць, таксама як непавага, нянавісць, злосць, ніколі не была стваральнаю.

Жорсткасць заўсёды разбуральная.

Стваральная якраз дабрата (Я. Сіпакоў).

*Паспрабуйце замяніць пабочныя словы блізкімі па сэнсе. Запішыце свой варыянт.*

*172. Запішыце па два сказы са словамі* ***праўда, здаецца, гавораць****, каб у адным са сказаў гэтыя словы былі пабочнымі, а ў другім – членам сказа.*

*173. Складзіце некалькі сказаў, уключыўшы ў іх пабочныя словы, якія: 1) выражаюць перакананасць у рэальнасці таго, пра што паведамляецца ў сказе; 2) паказваюць на ступень звычайнасці таго, пра што паведамляецца ў сказе; 3) паказваюць на крыніцу выказвання; 4) выражаюць эмацыянальную ацэнку выказвання.*

*174. Запішыце спачатку сказы з пабочнымі словамі, а потым – з устаўнымі канструкцыямі. Якія з выдзеленых слоў не з'яўляюцца ні пабочнымі, ні ўстаўнымі? Расстаўце знакі прыпынку. Адзначце магчымыя пунктуацыйныя варыянты.*

1) А *можа* і трэба гарэць нам дашчэнту? А *можа* і трэба жыць нам ахвярна? (А. Вярцінскі). 2) Жыццё *сапраўды* як казка: ідзеш ад бяды да бяды (Н. Мацяш). 3) Творы, якія абапіраюцца толькі на вопыт аднаго пакалення *маецца на ўвазе не толькі фактаграфічны вопыт, а духоўны – як набытак,* якія выражаюць толькі вопыт аднаго пакалення, часцей за ўсё недаўгавечныя. Сапраўдны пісьменнік вопыт свайго пакалення ўзбагачае вопытам мінулых і ўзнімае да вопыту наступных (Я. Сіпакоў). 4) *Пэўна* неабходна для паэта *нават* і ў касмічныя вякі, каб звінела птушкамі паветра і цвілі ля сцежак васількі (Г. Бураўкін). 5) Чалавек *маўляў* дзеля таго і прыходзіць на свет, каб жыць, а жыць – *значыць* працай сваёй рабіць добрае (А. Марціновіч). 6) Толькі асоба, якая да самазабыцця любіць сваю зямлю, якая шырока і глыбока глядзіць на свет і жыццё, *можа* спадзявацца на сапраўднае прызнанне і на такую вялікую радасць – павагу свайго і *не толькі свайго!* народа (Я. Сіпакоў). 7) Нядоля людская. *На жаль* яна

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

заўсёды з чалавекам. Але з ім жа заўжды і прыгажосць зямлі (У. Мароз). 8) Чалавек *кажуць* гэта суцэльнае сэрца. Уяўляеце, якое сэрца павінен мець пісьменнік, каб у ім змясціліся ўсе нягоды і радасці і сваёй зямлі, і цэлага свету? (Я. Сіпакоў). 9) Паэт цалкам залежыць ад любові. Паэт жыве *творча!* толькі да таго часу, пакуль любіць. Знікае любоў – знікае і сам паэт (Я. Сіпакоў).

## Звароткі

*175. Спішыце сказы, падкрэсліце звароткі, вызначце спосаб іх выражэння, расстаўце знакі прыпынку.*

1) Жыццё Ты – кульмінацыя скразная ад самага пачатку да канца (С. Законнікаў). 2) Цяпер зайздрошчу я табе пясняр: ты і жывеш і будзеш жыць крылата! (А. Зарыцкі). 3) О боязь за другога чалавека Адна ты робіш чалавека з нас (Н. Мацяш). 4) Мовай чужынскай і воляй варожай не пакарай мяне праведны Божа! (А. Хатэнка). 5) Слова ты гучы! І хай маўчаць гарматы і мячы! (А. Вярцінскі). 6) Як выказаць цябе маё маўчанне? (А. Разанаў). 7) Ах прага юнацтва калі б ты ўмела, ах старасці смага калі б ты магла! (А. Звонак). 8) Замкі і палацы помнікі і храмы як жа вас нягуста на маёй зямлі!.. (Н. Гальпяровіч). 9) Ах, якая ты жорсткая ўсё-ткі мудрасць людская (Н. Гілевіч). 10) Лябедзіку застанься недасяжным, высока шыю белую нясі, не распускайся птахам нехлямяжым і мяккай булкі з рук ты не прасі! (Е. Лось).

*176. Прачытайце верш. Знайдзіце ў тэксце звароткі, ахарактарызуйце спосаб іх выражэння. Складзіце і запішыце сказы, у якіх ў ролі звароткаў былі б ужыты выдзеленыя словы.*

Родная мова

Як ты дарага мне, мая родная **мова**!
Мілагучнае, звонкае, спеўнае **слова**!
Ты калісьці мяне падымала
І вучыла ў **бацькоў** на руках гаварыць.
У **жыцці** маім слова найпершае «**мама**»
І цяпер для мяне сама міла гучыць.
Я па літарах родных вучыўся чытаць,
І буквар для мяне быў жыцця палавінай.
Быў шчаслівы я роднаю мовай сказаць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першы раз: «**Беларусь**, мая сонца-краіна!»
І цяпер для мяне ты з усіх прыгажэй,
Хоць я ведаю, моваў на свеце нямала,
І з усіх песняроў мне мілей і бліжэй
Роднай мовы пясняр – неўміручы Купала,
А задумае вораг з далёкага краю
Апляваць, адабраць, знішчыць мову маю –
Не дазволю.
Не дам.
Не прадам.
Не змяняю.
І да смерці за волю тваю пастаю! (Н. Гілевіч)

*177. З твораў мастацкай літаратуры падбярыце прыклады таго, як пры дапамозе зваротказ аўтары падкрэсліваюць адносіны аднаго персанажа да другога: 1) ласку; 2) раздражненне; 3) пагарду; 4) фамільярнасць.*

## ☑ Кантрольныя заданні

*178. Складзіце і запішыце просты сказ, ускладнены: 1) адасобленымі акалічнасцямі і аднароднымі выказнікамі; 2) пабочнымі словамі і адасобленымі азначэннямі; 3) устаўной канструкцыяй і адасобленай акалічнасцю; 4) зваротка м і аднароднымі азначэннямі; 5) параўнальным зваротам і пабочным словам.*

*179. Запішыце тэкст, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце сваё меркаванне.*

Тастамент

Адпісаў бы табе зямлі. Але ў мяне селяніна адабралі яе і знявечыўшы засеялі чарнабыльнікам.

Адпісаў бы табе грошы. Але я існаваў з працы рук сваіх не сабраў за жыццё і капейчыны.

Адпісаў бы табе храм. Але яго няма, а на руінах святыняў яшчэ правіць шабаш антыхрыст.

І таму адзінае, што адпісваю табе, гэта Любоў да краю роднага. Зберажы яе і перадай дзецям сваім. А дзеці няхай перададуць сваім дзецям. А тыя сваім...

Тады мо ўсё і вернецца на кругі свая (Я. Пархута).

*180. Зрабіце пунктуацыйны аналіз тэксту.*

Загадкі таксама як прыказкі і прымаўкі казкі і песні вякамі складаліся народам. Яны належаць да аднаго з самых старажытных жанраў фальклору які ўзнік тады калі чалавек быў яшчэ поўнасцю ва ўладзе прыроднай стыхіі і з'явы прыроды для яго былі незразумелай страшнай таямніцай. Старажытны чалавек думаў што ўсюды на вадзе і ў лесе у будынку і ў полі яго падпільноўваюць варожыя сілы пасылаючы бяду і няўдачы а птушкі і звяры разумныя істоты якія ведаюць чалавечую мову. Варожыя таямнічыя сілы трэба было перахітрыць а ад звяроў і птушак утаіць свае дзеянні. Таму людзі сталі ўжываць умоўныя назвы прылад лоўлі і палявання назвы звяроў і птушак.

Загадка гэта іншасказальнае вобразнае апісанне якога-небудзь прадмета або з'явы на аснове падабенства паміж утоеным прадметам які трэба адгадаць і тым які замяняе яго ў загадцы. Яна ж уяўляе сабой мудрагелістае пытанне выражанае пераважна з дапамогай метафары.

Загадкі вызначаюцца трапнасцю выразаў афарыстычнасцю і сцісласцю формы. З аднаго боку у загадках як у прыказках і прымаўках адлюстраваўся багаты гаспадарчы і жыццёвы вопыт працоўнага народа. З другога у іх знайшлі выражэнне творчая фантазія кемлівасць дасціпны гумар народа яго паэтычныя здольнасці.

Тэматыкай загадак з'яўляецца шматгранны свет прадметаў і з'яў навакольнай рэчаіснасці з'явы прыроды чалавек яго працоўная дзейнасць і матэрыяльны быт сацыяльныя адносіны жывёльны і раслінны свет.

Загадкі аб прыродзе найбольш старажытныя і распаўсюджаныя. Неба сонца зоркі зямля вада дзень ноч холад цяпло ўсё ператвараецца ў вобразы падказаныя працай і бытам селяніна.

Загадкі пра людзей ствараюцца на канкрэтных прадметных параўнаннях з рэчамі гаспадарчага і хатняга ўжытку.

Жывёльны і раслінны свет і самі з'явы прыроды падобны да прылад працы прадметаў побыту і хатняга ўжытку да паводзін людзей.

Праца селяніна ворыва сяўба касьба жніво малацьба і г. д. сельскагаспадарчыя прылады прадметы звязаныя з жывёлагадоўляй рыбалоўствам ткацтвам кавальствам прыгатаваннем ежы ўсё гэта таксама станавілася зместам загадак.

Іншасказальная вобразная форма выражэння асаблівая ўласцівасць загадкі ўспрымаць усё новае выклікае да яе нязменную цікавасць і робіць загадку адным з любімых жанраў вуснай народнай творчасці (Паводле А. Гурскага).

*Падбярыце загадкі, якія могуць праілюстраваць асноўныя палажэнні тэксту.*

## Тэст

1. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:
   1) Няпраўдай свет пройдзеш_ ды назад не вернешся (Прыказка).
   2) Чуваць ці то птушыны шчэбет-перасвіст_ ці то веснавое бульканне ручая (П. Броўка).
   3) Шмат якія птушкі гняздзяцца ў полі_ альбо ў лесе (В. Вольскі).
   4) Душу сціскае болем_ не то смутак, не то жаль (Я. Колас).
   5) Я сам люблю прыход вясны, малочнае цвіценне вішань_ і спеў драздоў, і шум лясны (П. Панчанка).

2. Адзначце сказы, у якіх коску трэба паставіць на месцы ўсіх пропускаў:
   1) Касцы ідуць то грамадою_ то шнурам цягнуць_ чарадою_ то паасобку_ то па пары (Я. Колас).
   2) Сустрэчны вецер_ то дыхаў прыемнай цеплынёй у твары_ то лашчыўся ў валасах_ то імкнуўся сарваць з плеч хусцінкі (Т. Хадкевіч).
   3) Мы любім родную краіну_ істужкі рэк_ і сінь азёр_ і звонкі гоман баравіны_ і ззянне месяца_ і зор (А. Астрэйка).
   4) Пад гэты гром _ пад дождж упарты то там _ то тут пачуеш жарты (Я. Колас).
   5) У балоцістых зарасніках_ у поймах рэчак з нізкімі і топкімі берагамі _ з высокай травой можна сустрэцца неспадзявана з ласём (В. Вольскі).

3. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны і двукроп’е, і працяжнік:
   1) Вечарам Люба пачала прыбіраць у хаце мясці, мыць, чысціць, выносіць і прыносіць (К. Чорны).
   2) Усё і двор, і дарога, і лес было занесена снегам, ад якога балела ў вачах (І. Пташнікаў).
   3) Ад спёкі застыла ўсё і далёкі сіні лес, і поле, і хаты, і самі людзі (П. Галавач).
   4) Чакаюць вестак аграном, пілот, вадзіцель за рулём, у белым кіцелі марак, вучоны, школьнік і рыбак (М. Лужанін).
   5) Шырокія і вузкія, глыбокія і мелкаводныя рэкі Прыпяць, Піна, Жалонь, Славечна і Убрань, Піна і Стыр, Гарынь і Случ плывуць праз балоты Палескай нізіны (В. Вольскі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Адзначце сказы, у якіх дапасаванае азначэнне трэба адасобіць:

1) Бярозкі *ахутаныя маладым лісцем* стаялі пры самай дарозе (А. Чарнышэвіч).

2) *Пафарбаваныя марозам, абмытыя дажджом* заснулі ціхія бярозы ўночы пад акном (А. Астрэйка).

3) Праз навісь галін відаць *густа засеянае зоркамі* неба (І. Навуменка).

4) Весялей зірнулі на свет *вызваленыя ад холаду* дрэвы, радасна адгукнуліся густым шумам на павевы цёплага ветру (Я. Колас).

5) Надвячоркам пайшоў дождж *па-майску цёплы, дробны, але спорны* (І. Шамякін).

5. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку:

1) Ён пачаў расказваць нешта *вясёлае, смешнае* (М. Зарэцкі).

2) На палях нерухома ляжала восень *шэрая, аднастайная* (І. Шамякін).

3) Вось прыйшоў салдат у *доўгім шынялі*, за ім – рухавы чырвонаармеец (М. Лынькоў).

4) Быў у замку дзед Даніла *родам дзесь з-пад Мазыра* (Я. Колас).

5) На нашых вачах узнік горад з *каменю, з цэглы і шкла, з кветак і маладых прысад* (М. Хведаровіч).

6. Адзначце сказы, у якіх не трэба адасабляць азначэнне:

1) Васіліна акінула позіркам поле і глыбока ўдыхнула чыстае, насычанае веснавой парнасцю паветра (Т. Хадкевіч).

2) З усходу дзьмуў халодны вецер і развяваў на пустых і шырокіх палях нудную мелодыю зыкаў бурнай ночы (К. Чорны).

3) Нацэленыя Жуль Вернам вандраваць па ўсім свеце адкрываць неадкрытае мы пакуль што ажыццяўлялі Адысею па блізкіх ваколіцах (І. Навуменка).

4) У ціхай, зарослай асакой і чаротам затоцы стаяў човен (М. Гамолка).

5) Акаймаваны вясёлкавым кругам з-за высокіх кудзелістых хмурынак паглядаў месяц (У. Карпаў).

7. Адзначце сказы, у якіх прыдатак трэба адасобіць:

1) І была яна гэтая сасна самай прыгожай і высокай з усіх сваіх сясцёр (І. Шамякін).

2) Касцы ваякі мірнай працы выходзяць з косамі на пляцы (Я. Колас).

3) Дырэктар дома адпачынку Сяргей Антонавіч сустрэў Іларыка не вельмі прыхільна (А. Якімовіч).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Яшчэ ніхто і ніколі не жадаў нікому такой шчаслівай удачы, як яе жадаў Грышку Гарысвету калгасны кладаўшчык Фама Красачка (М. Паслядовіч).

5) Месяц вышчарблены нажом гарбуз хаваўся ў лісці маладога дуба ля вуліцы (І. Пташнікаў).

8. Адзначце сказы, у якіх акалічнасць трэба адасобіць:

1) Бацька не то спаў, не то так ляжаў на печы не разуваючыся (К. Крапіва).

2) За сцяной уціхаючы падвывае вецер (Э. Самуйлёнак).

3) Пайшоў Амелька нос павесіўшы (М. Лынькоў).

4) Стаялі ў глыбокай задуме лясы аздабляючы цёмнай зелянінай пагоркі (Т. Хадкевіч).

5) Я не магу рукі склаўшы сядзець (К. Чорны).

9. Адзначце сказы, у якіх трэба адасобіць удакладняльную акалічнасць:

1) Дзесьці там каля вёскі чуліся галасы людзей (М. Лынькоў).

2) Заззяла ў травах пад гарой іскрынкамі раса (А. Бачыла).

3) Спыніліся на ўзлессі на гары пад каржакаватымі хвоямі (І. Шамякін).

4) Безліч зор міргала над намі высока ў небе (М. Лупсякоў).

5) Дзесьці высока-высока за самымі хмарамі курлыкалі жураві (М. Лынькоў).

10. Адзначце сказы, у якіх адасабляецца дапаўненне:

1) Усё іншае у тым ліку прозвішча і імя ён высвятляў пасля, калі сам пачынаў аглядаць хворага (І. Шамякін).

2) Апрача аднастайнага шуму сосен у лесе нічога не чуваць (Я. Маўр).

3) Акрамя кучаравых бярозак на ўзгорку расла высокая сухаверхая хвоя (З. Бядуля).

4) Хтосьці пабываў каля рэчкі і апрача нас (Б. Мікуліч).

5) Сябры з сабою хлопца клічуць у цэх гарачы працаваць (М. Гамолка).

11. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:

1) У верхавінах лесу журботна шумеў вецер, расцярушваючы між галін_ і на галінах дрэў бялюсенькую снежную сецьz (Я. Колас).

2) Асірацелыя старыя дубы ў чорных шапках бусліных гнёздаў спакойна стаялі, не варушачы ніводным лістам_ і купалі ў сонцы свае адвечныя лапы (Я. Колас).

3) Хлопцы астанавіліся, узняўшыся на невялікі ўзгорак_ і ўбачылі перад сабой вёску (Ц. Гартны).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Атрэсла раструшчаную крэйду, выцерла насоўкаю запэцканую далонь і_ падхапіўшы сумачку і не азірнуўшыся на акно, пайшла з пакоя (Т. Бондар).

5) На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі, звесіўшы над вадою махрыстыя галіны і_ аплёўшы пясчаны бераг цэлаю сеткаю смаляных каранёў (Я. Колас).

12. Адзначце, якія члены сказа трэба адасобіць:

*Маё вялікае і даўняе жаданне ва ўсім будзённым бачыць урачыстасць і радавацца ўжо нават аднаму таму што мы людзі сварачыся і мірачыся лаючыся і сябруючы усё ж жывём на гэтай цудоўнай зямлі (Я. Сіпакоў).*

1) дапасаванае развітае азначэнне;
2) недапасаванае азначэнне;
3) прыдатак;
4) дапаўненне;
5) акалічнасць.

13. Вызначце, дзе на месцы пропуску трэба паставіць коскі:

*Не даходзячы да лукі_[1] выгнуўшыся яшчэ раз_[2] каля лесу_[3] вельмі прыгожай дугою_[4] Нёман забіраў управа_[5] пралёгшы blішчастаю стужкаю паміж лугамі і полем (Я. Колас).*

14. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку:

1) Бяроза апускае косы над маёй сцежкай і нібы дзяўчына дорыць мне ўсмешку (А. Русак).

2) Уздоўж палеткаў, абочын сцяжын пасталі быццам дзеці з блакітнымі вачанятамі васількі (Я. Пархута).

3) Васька сядзеў як на іголках.

4) Сядзім у цяньку, пад разгалістымі вольхамі, што густа пасталі на берагах канала і ўтварылі над ім як бы зялёнае скляпенне (Я. Пархута).

5) На зямлі святлей не будзе чым у гэты добры час (С. Законнікаў).

15. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы не трэба адасабляць:

1) Асеннія сады *як вогнішчы* пылаюць (П. Панчанка).

2) Сон *як рукой* зняло (А. Якімовіч).

3) А ранак *бы твар немаўляткі* ружовы і чысты такі (С. Законнікаў).

4) Сустракаемся мы цяпер *як добрыя знаёмыя* і гутарым проста, пасяброўску (І. Шамякін).

5) У народнай культуры хлеб успрымаецца *як вялікі Боскі дар*, які патрабуе паважлівага стаўлення і пашаны (Я. Крук).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

16. Адзначце сказы, у якіх выдзеленае слова з'яўляецца пабочным:

1) Велічэзная бяроза ўзнімалася і над дарогай, і *здавалася* над усім лесам (К. Чорны).

2) У летнюю спёку ручай *можа* перасохнуць (К. Чорны).

3) На возеры нікога не было *відаць* і толькі шумелі і набягалі на бераг хвалі (С. Грахоўскі).

4) У дзеда Талаша *прызнацца* стрэльба ёсць, і схавана яна якраз у лесе (Я. Колас).

5) Смеласць *кажуць* заўсёды бярэ гарады! (А. Звонак).

17. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць коскі:

1) І ўраджай кажуць хоць на выстаўку вязі (М. Паслядовіч).

2) Аднак сонца да ненатуральнасці абстрактна-жоўтае пякло зямлю па-ранейшаму (І. Шамякін).

3) Праз нейкі час сапраўды пачуўся стрэл (Я. Маўр).

4) Сплеценыя і пераплеценыя, скручаныя і перакручаныя «карані» сапраўды звісалі долу (Я. Пархута)

5) Стары я знаю верыць мне і сам гаворыць аб вясне (М. Танк).

18. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя канструкцыі з’яўляюцца ўстаўнымі і выдзяляюцца працяжнікамі або дужкамі:

1) Мінулай вясной на Лебядзінае возера *так назвалі жыхары рукатворнае азярцо* птушкі прыляцелі раней звычайнага (Я. Пархута).

2) *Сказаць па праўдзе* ён і значэння не прыдаваў гэтай сутычцы (Я. Колас).

3) Тут у вас *мне толькі што казалі* рэчка блізка? (Я. Скрыган).

4) Стаялі прыгожыя дні *як заўсёды ў Вільні ў канцы лета, у пачатку восені* калі ў светлым чыстым блакіце разліта спакойная сонечная яснасць (М. Гарэцкі).

5) Прабеглі машыны *на гэты раз іх было небагата* а чырвоны сігнал яшчэ трымае пешаходаў, «аддзяжурвае» свае секунды (Ф. Янкоўскі).

19. Адзначце сказы, у якіх прапушчаны знакі прыпынку:

1) Не сумуй па госцю мой зялёны, мой птушыны горад Рагачоў (А. Жаўрук).

2) О, каб жа марудней мой час ішоў ты! (М. Кусянкоў).

3) Прымі ж паклон мой шчыры, нізкі, сагрэты чыстым пачуццём, мой родны край, мая калыска, маё бяссмертнае жыццё! (П. Глебка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) Гані мяне доля ад перакатных радасцей капрызнай славы да зямнога, ціхага шчасця вялікай патрэбнай працы! (Я. Брыль).

5) Зор вам ніяк не злічыць астраномы (А. Куляшоў).

20. Вызначце, якімі канструкцыямі ўскладнена выказванне:

*Паэзія, аднойчы нарадзіўшыся і выйшаўшы са свайго канкрэтнага часу, становіцца пазачасавай, сваёю, прыдатнаю для кожнага стагоддзя і для кожнага, без абмежавання, народа – як і паветра, якім можа вольна дыхаць кожны чалавек на зямлі (Я. Сіпакоў).*

1) аднароднымі членамі сказа; 2) пабочным словам;
3) параўнальным зваротам; 4) адасобленай акалічнасцю;
5) адасобленым прыдаткам.

# Знакі прыпынку ў складаным сказе

## Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе

*181. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназлучаных сказаў. Назавіце злучнікі, якія звязваюць часткі сказа, вызначце іх разрад.*

1) І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты, і ў спёку пекане цябе зіма (П. Панчанка). 2) У моўнай палітры многіх беларускіх паэтаў і празаікаў складаныя словы сталі важным вобразна-выяўленчым сродкам, але разам з тым, імклівы рост колькасці складаных слоў выклікае і пэўныя цяжкасці ў іх правапісе, абцяжарвае кантэкст (М. Прыгодзіч). 3) Чорнае крыло Чарнобыля вісіць над усёй зямлёю… Узмах таго крыла – і вунь колькі жыццяў на валасінцы. Узмах таго крыла – і вунь колькі песень не спета. Узмах таго крыла – і вунь колькі кветак не бачаць сонца… (Я. Пархута). 4) Трывучы мой народ, а песняю – параніш (Я. Янішчыц). 5) Вечарэе і пахне кветкамі (М. Лынькоў). 6) У хвойных лясах густа рос верас і зелянеў ягаднік (К. Чорны). 7) Ёсць ворагі і ёсць сябры (А. Куляшоў). 8) Адзін кароткі міг – і рыжая вавёрка маланкай знікла ў вяршаліне кашлатай хвоі (У. Краўчанка). 9) Пагода слаўная і сонца прыпякае (Я. Якімовіч). 10) А як жа ты, мая зямля-радзіма, і дзе твае ставекавыя замкі? (Е. Лось).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*182. Дапішыце сказы.*

Коскай аддзяляюцца часткі складаназлучанага сказа, якія звязаны злучнікамі…

Перад злучнікамі *і, ды, або, ці* коска не ставіцца, калі…

Коскай аддзяляюцца часткі складаназлучанага сказа, якія звязаны злучнікамі *і*, калі…

Працяжнік у складаназалежным сказе можа ставіцца, калі…

*183. Спішыце сказы, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучаных сказаў.*

1) Мешчанін разумее толькі «жыццё» але ніколі не спасцігне ягонай меры часу (М. Стральцоў). 2) Жыве тады лес пярэста-звонкім жыццём і ў тым жыцці – у зялёным, у сонечным – чуваць гармонія шчасця, гармонія светлае радасці (М. Зарэцкі). 3) Зару нельга спыніць а за шчасце можна змагацца (І. Дуброўскі). 4) Эх, скошан луг і зніклі краскі (Я. Колас). 5) Куды ж ісці і што рабіць? (М. Багдановіч). 6) Прэсна запахла першай зімовай свежасцю і дыхалася неяк асабліва бадзёра і лёгка (М. Машара). 7) Якая ж у цябе мэта і што ты збіраешся рабіць? (Б. Сачанка). 8) Дзень асенні і навокал – ні душы (І. Шамякін). 9) Потым зусім выбліснула сонца і паўабручом выгнулася праз усё неба вясёлка (Б. Сачанка). 10) На высокіх таполях і бярозах паркаў віднеюцца вялікія грачыныя калоніі, сотні гнёздаў і ўсе яны разнастайныя (Л. Кацкевіч).

## Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе

*184. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў. Складзіце схемы сказаў.*

1) А цяпер падумайце, як бы гэта было добра, каб кожны чалавек, што жыве на свеце, пасадзіў бы за сваё жыццё адно дрэўца дзе-небудзь пры сваёй хаце, пры дарозе, ля ракі! (Э. Самуйлёнак). 2) Люблю я пазіраць туды, дзе шумяць каласамі шырокія нівы або рассцілаюцца бясконцыя зялёныя лугі (Я. Колас). 3) Старажытнае кірыліцкае пісьмо. Колькі ні ўглядайся ў гэтыя літары, як ні складвай з іх словы і сказы, яны застануцца нямымі, пакуль не спазнаеш повязь часоў і падзей, лёсаў людскіх, трывог свету (У. Мароз). 4) Я люблю часіну навальніцы, калі б’е пярун па ўсіх ладах і злуюцца ў хмарах бліскавіцы, кроплі асыпаючы на дах (П. Панчанка). 5) Бо



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

толькі ведаючы народную аснову мовы, можна ведаць, як правільна і проста выказаць думку, як натуральна, паводле законаў гэтай мовы, пабудаваць фразу, дзе якое сказаць слова, патрэбнае іменна да гэтага месца, дзе зрабіць націск, дзе і як вымавіць галосныя, зычныя, цвёрдыя, мяккія, уласцівыя гучанню гэтай мовы (Я. Скрыган). 6) Сонца ўсходзіць над ракой – хоць вазьмі яго рукой (К. Кірэенка). 7) Няма нічога благога ў тым, калі чалавек ступе на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага находзяць успаміны (М. Стральцоў). 8) Хто ён быў і адкуль, гэты хлопец, ніхто б, напэўна, ніколі не здагадаўся (А. Васілевіч). 9) Май быў такі, што, каб такіх не бывала на зямлі, – яго варта было б выдумаць (У. Караткевіч). 10) Калі ўсе згублены ключы, калі ні шанцу, анічога – усё ж ідзі, любі, крычы і пасягай на перамогу (А. Разанаў).

*185. Запоўніце табліцу. З твораў мастацкай літаратуры да кожнага правіла падбярыце прыклад.*

| Коска ў складаназалежным сказе | |
|---|---|
| ставіцца | не ставіцца |
| | |

1) паміж галоўнай і даданай часткай;

2) калі аднародныя даданыя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў;

3) паміж даданымі часткамі, якія адносяцца да адной і больш галоўных частак;

4) перад даданай часткай, якая складаецца толькі са злучніка ці злучальнага слова;

5) калі паміж галоўнай і даданай часткамі ёсць узмацняльная часціца ***і*** або адмоўная часціца ***не***;

6) перад злучнікамі ***і, ды, або, ці***, што звязваюць дзве галоўныя часткі, да якіх адносіцца агульная даданая частка.

*186. Спішыце сказы, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў.*

1) Толькі тады калі неба згаджаецца ўзяць чалавека зямля згаджаецца яго адпусціць (А. Разанаў). 2) Як у жыцці мы шукаем надзейныя шляхі так і ў руху выбіраем магістраль каб без прыпынкаў напрасткі рухацца да мэты (У. Мароз). 3) Той дзень лічы завянуў пустацветам калі ты пяць хвілін

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашкадаваў каб дзецям паказаць куточак свету і хараство людзей і дрэў і траў (П. Панчанка). 4) Шчасце калі доўга яго чакаеш і калі яно ў нейкі дзень прыходзіць здаецца неспадзяваным (М. Танк). 5) У сутках ёсць пара такая калі зары палоска гасне і змрок спаўзае пад адхон калі становіцца няясным, як летуценне, лёгкі сон (А. Астрэйка). 6) Ледзь вясною ў паветры запахла і ледзь сонца ўзнялося ўгару з першым ветру паўднёвага ўзмахам прыляцеў нецярплівы жаўрук (В. Таўлай). 7) У маленстве мы спазнаём свет каб прынять яго такім які ён ёсць каб ведаць што ён ёсць (У. Рубанаў). 8) Ён быў упэўнены што калі хто не бачыў палескіх паводак то той ніколі прыгожай не знаў панарамы (П. Глебка). 9) Спадчынай валодае той хто мае моц засвоіць яе той жа хто гэтай моцы не мае ў лепшым выпадку з'яўляецца яе захавальнікам (А. Разанаў).

## Знакі прыпынку ў складаным бяззлучнікавым сказе

*187. Растлумачце знакі прыпынку паміж часткамі складаных бяззлучнікавых сказаў. Назавіце адносіны, якія выражаюцца паміж часткамі.*

1) Дружа, не будзь да аблудных бязлітасна строгі: то не віна, а бяда іх; бяду не карай (Н. Гілевіч). 2) Страціў слова – штосьці страціў у душы абавязкова! (Н. Гілевіч). 3) Бойся спазніцца са словам харошым: тонка прадзецца жыццёвая ніць (Н. Мацяш). 4) Бліснула маланка – стала відна як удзень (С. Грахоўскі). 5) Намарозіць радня па крыві – адагрэе радня па долі (Н. Мацяш). 6) Дума неспакойная жыла ў майстра: ён хацеў пакінуць пакаленням след жыцця свайго (М. Танк). 7) Агнявыя валаконцы ткуцца ў шоўк чырвоны – гэта хмаркі ладзяць сонцу і дзяньку кароны (Я. Колас). 8) Цеплынёй вясна дыхнула – засінелі кветкі (З. Бядуля). 9) То не Нарач высока коціць хвалі на травы – то шырока, далёка наша коціцца слова (А. Бялевіч).

*188. Складзіце алгарытм пастаноўкі знакаў прыпынку ў бяззлучнікавым сказе.*

*189. Спішыце сказы, пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку паміж часткамі складаных бяззлучнікавых сказаў.*

1) Філосаф пра простых людзей кажа так яны зведалі ўсё і не спазналі нічога ў гэтым свеце – няшчасныя людзі. Звычайны чалавек адзначыць яны



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

былі, зведалі гора і нястачу, каханне, радасць і сум – шчаслівыя людзі (Г. Марчук). 2) Любоў сама як шыпшына адплаціць яна за дотык бяздушны і грубы, адплаціць заўсёды (А. Зарыцкі). 3) А над верасовым агнём рупна снавалі пчолы бомкалі бухматыя чмелі пырхалі матылі (Я. Пархута). 4) Відаць, у добрую часіну збіраўся дзядзька ў пуцявіну ў Баранавічах налучыўся кандуктар добры ён згадзіўся давесці ў Вільню дзядзьку сходна (Я. Колас). 5) Вучыся нябожа вучэнне паможа змагацца з нядоляй, няволяй (Я. Купала). 6) Мінулае тоіцца ў змроку будучыня – у светлыні (А. Разанаў). 7) Гадуюцца дзеці ў любові ратуецца вечнасць (Л. Рублеўская). 8) Спынішся плынню адгоніць назад (С. Грахоўскі). 9) Не прайшлі мы і сотні метраў ззаду пачуліся раскацістыя выбухі (П. Галавач). 10) Мне бачна Полацк не старэе ён маладзее з кожным днём (П. Прыходзька).

## Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі

*190. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце. Складзіце схемы сказаў з рознымі відамі сувязі.*

Дзе ты, мой непасрэдны свет высокай-высокай травы, далёкага неба і вельмі блізкіх кузюрак?

Там трава настолькі высокая, што ты хаваешся ў ёй з галавою і, каб убачыць, куды адышлася маці, узнімаешся на дыбачкі, а мяцёлкі слёзак і цімафееўкі, таўкачыкі трыпутніку і шчаўлюку, чырвоныя, вялізныя мячыкі канюшыны, нагрэтыя сонцам, прыемна так казычуць твар, пакідаючы надоўга пах пылку, мёду, зяленіва і цеплыні.

Там далёкае неба здаецца куды большым, бо кругагляд у нас яшчэ вельмі малы (толькі тое, што мы можам разгледзець з нейкай паўметровай вышыні), а таму неба займае ў дзяцінстве ўсё наваколле: куды ні зірнеш — толькі неба, неба, неба…

Там вельмі ж ужо блізка мы стаім да кузюрак, і нам не трэба нагінацца, каб убачыць іх жыццё — паспешлівае і хапатлівае, як у людзей: мы стаім побач з імі і можам радавацца кожнай іхняй, нават маленькай, радасці (глядзі ты — такую іглiцу ўдалося падняць мурашцы!) і засмучацца кожнай няўдачай (божая кароўка ўпала з ліста на спіну — трэба ёй дапамагчы перавярнуцца!). Бо тут мы ўсе жыхары аднаго непаўторнага свету, імя якому — дзяцінства.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

І дзе б мы ні былі, якія б краіны нас ні паклікалі, мы ўсё роўна будзем сніць адну-адзіную дарогу, якая вяртае нас у гэты непаўторны свет, якая ласкава так вядзе нас да нашай вёскі, да нашай хаты, да нашай калакалушыны. У свет высокай травы, далёкага неба і блізкіх-блізкіх кузюрак… (Я. Сіпакоў).

*191. Расстаўце знакі прыпынку ў тэксце. Вусна зрабіце поўны сінтаксічны разбор двух-трох сказаў.*

Прыемна глядзець на поле ў пераджніўную пару лета. Ячмень следам за жытам пачынае палавець і палетак у жаўтлявых плямах выглядае стракатым густа сінеюць рослыя аўсы і калі па іх прабягае ветрык здаецца вызоньваюць мяцёлкамі з буйным зернем ільны воддаль набываюць карычняваты колер праз тыдзень-паўтара паспеюць зусім лугавінкі ў лагчынах паміж палеткаў яшчэ не кранутых касьба ідзе перш на прырэчных паплавах але і сюды неўзабаве прыйдуць касцы. Ярка-зялёныя шэра-блакітныя сінявастыя залацістыя фарбы аздаблялі абшары і хто б ні праехаў тут залюбуецца імі ўдыхне на поўныя грудзі слодыч палявых пахаў і задаволена падумае: «О, гэтыя палеткі адплацяць людзям за іх працу!» Але не кожны можа ўявіць што гэта была за праца (Т. Хадкевіч).

## ☑ Кантрольныя заданні

*192. Расстаўце знакі прыпынку ў тэксце.*

Ноч прыйшла да зямлі на спатканне
Захад скончыў агнём палаць
І дубы ў малочным тумане
Веліканамі ціха стаяць.
Бач агеньчыкі вёскі далёкай
Бач на ростані ўзняўся курган.
Явар сумны і адзінокі
Пахіліў задумёны стан.
Кветка тут у начы расцвітае
Водар мяккі пялёсткі льюць…
І яе па роднаму краю
«Кветкай матчынай» людзі завуць.
Я крануў яе ціха рукою
І пялёсткі спеў завялі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І паўсталі вакол чарадою
Ўсе паданні роднай зямлі.
Вось карона ў рацэ заблішчэла
Хтось плыве як туман па вадзе
Па дарозе ад месяца белай
Цар змяіны кудысьці паўзе.
Цені ў лесе бягуць. Цямнее.
І ў чароўнай лясной гушчыні
Праімчаўся кудысь як завея
Ян Прыгожы на белым кані (У. Караткевіч).

## Тэст

1. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску не трэба ставіць коску:

1) Як толькі развіднела_ і чуць узышло сонца, пачалі збірацца вучні (Я. Колас).

2) Я працаваў так старанна, што не заўважыў_ як ляцеў час (І. Шамякін).

3) На падворку парадак_ усё прыбрана, дагледжана (М. Ракітны).

4) Месяц зайшоў у хмары_ і стала цёмна (А. Васілевіч).

5) У чалавека раны зарастуць_ але рубцы навечна застануцца (Ю. Свірка).

2. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў трэба паставіць знакі прыпынку:

1) Світанак расплыўся над Нёманам_ і асенняе трапяткое сонца абагрэла пабляклую ад марозу траву на сенажацях_ дзе яшчэ трымалася павуцінне бабінага лета (Я. Крамко).

2) Калі-нікалі праляціць з піскам кажан_ або пракрычыць сава_ ці прашугаюць чарадою спалоханыя птушкі (І. Гурскі).

3) Вось і зіма прайшла_ і дзень вялікі_ і перазімавалі_ і вясны дачакаліся (К. Чорны).

4) Лянiва шэпчуцца чароты_ ды ледзь калышацца лазняк_ і нейкай ціхаю пяшчотай шуміць задумліва сасняк (М. Машара).

5) На тым месцы валялася толькі бітае каменне_ ды дзе-нідзе тырчалі абсмаленыя, пасечаныя камлі дрэў (І. Мележ).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Адзначце сказы, у якіх перад злучнікам ***і*** коска не ставіцца:

1) Адгэтуль мой бацька выйшаў_ і я сама тут радзілася_ і першае маленства маё прайшло тут (К. Чорны).

2) Шумяць і гамоняць несупынныя хвалі жыцця_ і шырокія прывабныя далечы разгортваюцца перад вачыма (Я. Колас).

3) На дварэ цёпла_ і таму ў хаце ніхто не сядзіць (З. Бядуля).

4) Над вадой ля возера ціха спіць асока_ і лаза зялёная жаліцца-шуміць (М. Багдановіч).

5) У полі – рунь _ і ў небе – рунь (М. Багдановіч).

4. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць двукроп’е:

1) Сінеўся бор, цякла вада_ скрозь пахла мёдам і травою (М. Багдановіч).

2) Глянуў у акно_ поўны месяц асвятліў вёску, халодныя промні блішчалі на лапінах снегу, што прытуліўся ля плота (Я. Крамко).

3) Хто заказвае музыку_ той і правіць баль (В. Праўдзін).

4) Звыклыя гукі напоўнілі лясныя гушчары_ у галлі заварушылася сонная птаха, піскнуў заяц, бязгучна мільгануў кажан (М. Лынькоў).

5) Цеплынёй вясна дыхнула_ засінелі кветкі (З. Бядуля).

5. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць працяжнік:

1) Глуха прагрымеў удалечыні гром_ заблíскала маланка (Р. Ігнаценка).

2) Са свайго языка спусціш_ на чужым не зловіш (Прыказка).

3) Не прайшло і гадзіны_ усе былі на месцы.

4) Гром глуха грукоча пад небам высокім_ прыціхнулі птушкі, схаваўся каршун (Я. Купала).

5) Жураўлі ляцяць высока_ зіма яшчэ далёка.

6. Адзначце пропускі, дзе трэба паставіць кропку з коскай:

*Ужо зацвілі верасы_[1] пышнае ўбранне лісцявых дрэў_[2] асабліва бяроз_[3] сям-там пачынала жаўцець_[4] даспелы ліст_[5] зрываючыся з галінак ад лёгкага подыху_[6] трапятаўся_[7] як матылёк (М. Паслядовіч).*

7. Адзначце тып сказа:

*Мне здаецца, што кожны, хто хоць адзін раз убачыў і перажыў той час, калі зацвітаюць сады, праз усё жыццё не зможа забыць, як гэта бывае (Я. Сіпакоў).*

1) складаназлучаны;

2) складаназалежны з адной даданай;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) складаназалежны з некалькімі дадзенымі;

4) складаны бяззлучнікавы;

5) складаны сказ з рознымі відамі сувязі.

8. Адзначце, колькі знакаў і якіх павінна быць у сказе:

*Мальвіна верыла што Орлік разумее кожнае яе слова калі хваліла і лашчыла ён цёрся аб яе плячо а ўшчувала вінавата згінаў галаву і прыплюшчваў вялікія вочы ступаў павольней баючыся гаспадынінага гневу (С. Грахоўскі).*

1) 6 косак і працяжнік;

2) 6 косак і двукроп'е;

3) 5 косак і два двукроп'і;

4) 5 косак, двукроп'е, працяжнік;

5) 5 косак, два працяжнікі.

9. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:

1) Звіняць пілы, гудуць тапарышчы, стогне дрэва – будуецца дом (П. Глебка).

2) Дзе ён ні быў, і чаго ён не бачыў (К. Чорны).

3) Падоўгу раніца ў туманах сонца носіць, антонаўкаю грукаюць сады, ідуць са свежым збожжам паязды, а павуцінне ўслед, як быццам толькі з кросен, – так неўзаметку падступае восень (М. Лужанін).

4) Узмах вясла, і сонны бераг адразу пачынае жыць (П. Глебка).

5) Між алешын, кустоў, дзе пяе салавей і шуміць, і грыміць срэбразвонны ручай (Я. Колас).

10. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:

1) Кране рукой рабіны куст, звон чуецца рабінавы; кране яна каліны куст, звон чуецца калінавы (М. Танк).

2) То не гул завірухі мяцежнай, то не рокаты ўпартага мора – гэта Нёман разліўся бязмежна на грудзях Беларусі прасторнай (П. Трус).

3) Я так бы раіў: выбраць час і агледзець усё зараз, а там сама пакажа справа ці варта шуму ўся аблава, бо мо ваўкі ўсе пасхадзілі (Я. Колас).

4) Калі б тая радасць і тое шчасце, што часам, хоць і вельмі рэдка, трапляюць да чалавека, маглі б спяваць і звінець сваімі акордамі, то наша вуха чула б найцікавейшую ў свеце музыку (Я. Колас).

5) Дзеці снедалі і маці з імі (З. Бядуля).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Знакі прыпынку
## пры цытатах і простай мове

*193. Растлумачце значэнне тэрмінаў «простая мова», «словы аўтара», «цытата», «дыялог».*

*194. Растлумачце запісаныя схемы. З твораў мастацкай літаратуры падбярыце прыклады да кожнай схемы.*

*А: «П».; А: «П?»; А: «П!»*
*«П», – а; «П!» – а; «П?» – а.*
*«П, – а, – п».; «П, – а. – П».; «П, – а: – П».*
*А: «П», – а.*

*195. У прыведзеных урыўках знайдзіце простую мову. Раскажыце, якой схеме адпавядае пастаноўка знакаў прыпынку пры простай мове.*

I. Здаўна ў розных народаў існуюць нацыянальныя асаблівасці этыкету вітання. «Радуйся!» – гаварылі старажытныя грэкі, а сучасныя жыхары Грэцыі кажуць: «Будзь здароў!» Старажытныя егіпцяне пыталіся: «Як вы пацееце?» У Манголіі да сённяшняга часу, незалежна ад роду дзейнасці, суразмоўцы пры сустрэчы цікавяцца: «Як зімуеце? Як качуеце? Як ваша жывёла?»

«Мір вам!» – жадаюць яўрэі пры вітанні, «Будзь вясёлы!» – зычаць персы, «Я цябе бачу!» – канстатуюць зулусы. «Мір з табой», – гавораць арабы, а індзейцы наваха: «Усё добра!» «Здравствуйте! – жадаюць здароўя пры сустрэчы рускія або пытаюцца: – Как здоровье?» Палякі жадаюць добрага дня ці вечара: «Dzień dobry! Dobry wieczór!» (Паводле С. Важніка).

II. Старажытныя людзі лічылі імя найважнейшай часткай чалавечай асобы і звычайна захоўвалі яго ў сакрэце, каб вядзьмак не «ўзяў» імя і не выкарыстаў яго для нанясення шкоды чалавеку. Таму ў архаічную эпоху імя чалавека ведалі толькі яго бацькі. Усе астатнія называлі яго імем роду ці па нейкай апісальнай мянушцы.

Чалавек ніколі не казаў: «Маё імя такое і такое», – бо ён не мог быць да канца ўпэўнены, што яго новы знаёмы заслугоўвае поўнага даверу, што ён увогуле чалавек, а не злы дух. Напачатку, знаёмячыся, чалавек гаварыў няпэўна: «Мяне называюць так і так» – гэта магла быць вулічная мянушка. А яшчэ лепей не самому называцца, а каб нехта цябе назваў. Паводле законаў добрага тону, у арыстакратычных салонах і сёння прадстаўляе

чалавека чалавеку нехта трэці. Вось з якой даўніны прыйшлі правілы этыкету. Назваць каму-небудзь сваё сапраўднае імя – значыць праявіць максімальны давер, нібыта аддаць у рукі чужынцу сваё жыццё і душу (Т. Шамякіна).

*196. Знайдзіце ў тэксце простую мову, афарміце яе ў адпаведнасці з нормамі беларускай пунктуацыі.*

Культурнымі традыцыямі грамадства вызначаюцца формы маўленчых паводзін (маўленчага этыкету). Існуюць, напрыклад, самыя разнастайныя мадэлі маўленчых паводзін госця і гаспадара, дзяцей і бацькоў, мужчыны і жанчыны (спецыяльныя формы пашаны, пачцівасці і інш.). У індзейцаў Бразіліі, напрыклад, развітваючыся з гаспадаром і гасцямі, трэба абавязкова падысці да кожнага з прысутных, сказаць пра свой адыход і пачуць ідзі. А калі вяртаешся, то зноў трэба падысці да кожнага і пачуць вярнуўся Адказаць так. Агульныя ж бывайце ці прывітанне не дапускаюцца – гэта найстрашнейшае парушэнне этыкету (Л. Сямешка).

*Раскажыце, якія формы прывітання існуюць у беларускай мове? Назавіце вядомыя вам формулы беларускага маўленчага этыкету.*

*197. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры дыялогу ў наступным тэксце. Укажыце словы, пры дапамозе якіх уводзіцца простая мова:*

Першы ўвайшоў, шумліва і весела, Хоня – «Бацько і матка». Ён быў у падранай світцы і ў падранай шапцы, але і ў гэтым звычайным сваім убранстве ўдаваў проста-такі фарсуном: так спрытна вісела напашкі світа, так смела ліпла да макаўкі шапка.

– Вечар добры ў хату! Кеб жылося і кеб вялося! – сказаў ён звонка і цвёрда і дадаў такім тонам, нібы толькі ўчора бачыліся: – І табе, Васіль, добры вечар!

За Хонем паявіліся яго прыяцелі – чорны, пануры, як бацька, Пятро Пракопаў і куранёўскі гарманіст Алёша Губаты. Пятро толькі штосьці буркнуў пад нос і стаў на парозе – шырокай спіною амаль зусім затуліў Алёшу.

– От – у самы час! Бы, скажы ты, чулі – на вячэру акурат! – прамовіў усё з той жа вясёласцю Хоня і, не чакаючы запрашэння, як дома, падаўся да лаўкі, сеў шырока, вольна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дамеціха і Дамецік, як трэба было па звычаю, запрасілі хлопцаў к сталу, але Хоня за ўсіх адказаў:

– Дзякуем! Не спадзяваліся, што так добра прыбудзем, дак дома натапталіся картоплі!..

– Пад’елі, – пацвердзіў Алёша, прымошчваючыся каля Хоні.

– Пад’елі ці не пад’елі, а пасядзелі б от разам, паспрабувалі б, чаго бог паслаў… – пачала было Дамеціха, але чалавек перабіў яе разважліва:

– Было б спробуваць чаго, дак, нябось, угаварылі б як-небудзь! А то от расол адзін да картопля! (Паводле І. Мележа).

*Назавіце ўжытыя ў тэксце формулы беларускага этыкету.*

*198. Запішыце прапанаваны ўрывак з камедыі Я. Купалы «Паўлінка» як простую мову. Прасачыце, каб дзеясловы гаварэння адлюстроўвалі асаблівасці маўлення дзеючых асоб.*

*Паўлінка (да Адольфа).* Можа, пан Адольф, спяеце нам што-колечы? Я чула, што вельмі пекны голас маеце.

*Адольф (астанаўліваючыся)*. Э-э! Які так пекны! Ось так сабе! Канешне, лепшы, як у іншых.

*Колькі галасоў*. Дык проша спець. Мы ўсе просім.

*Адольф*. Калі ўжо так пекна просіце, дык можна. А якую ж бы панна Паўлінка хацела?

*Паўлінка*. А ўсё роўна, хоць якую! Ну, якая лепей у пана Адольфа выходзе.

*Адольф* (*пяе няскладна*, *махаючы хустачкай па твары*).

Плываё голэмбі,
Летаё лабэндзі;
З нашэго кахання,
Пэўна, ніц не бэндзе.

*Паўлінка*. А такі ж нічога не будзе.

*Адзін з гасцей*. Ці ж гэта «голэмбі» плываюць, а «лабэндзі» лятаюць?!

*Адольф*. Ну, калі перабіваеце, дык саўсім не буду пець.

*Альжбета*. Хай пан Быкоўскі на іх не зважае ды пяе; ведама, – блазнота, што яны знаюць.

*Паўлінка* (*паглядзеўшы ў акно).* Выбачайце, пан Адольф! У мяне няўмысле вылецела слаўцо.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Колькі галасоў*. Выбачайце, выбачайце! Просім, просім. Больш не будзем!

*Назавіце ўжытыя ў тэксце формулы беларускага этыкету.*

*199. Размяркуйце прыведзеныя формулы маўленчага этыкету па наступных групах: 1) звароты, 2) просьба, запрашэнне, 3) падзяка, 4) пажаданні, 5) сустрэча, развітанне, 6) прабачэнне, 7) згода, адмова.*

Калегі; звярніце ўвагу; прабачце; дзякуй; здаравенькі былі; добры дзень; шаноўны; немагчыма; дапамажыце мне; прывітанне; маё шанаванне; братка; заходзьце; ні ў якім разе; ласкава прашу; сардэчна дзякую; няма за што; барані божа; дачушка; скажыце; у добры час; ніяк не; добрага здароўя; шчасліва; вітаем; вельмі рад; зрабіце ласку; да пабачэння; бывайце здаровы; спадар; пакуль; выбачайце; даруйце; зразумела; дамы; дазвольце; не крыўдуйце; шчаслівай дарогі; чакайце; безумоўна; шчыра ўдзячны; запрашаю; вялікі расці; як чуешся; пажадана; шаноўная грамада.

*Складзіце з прапанаванымі формуламі дыялог на адну з тэм: у грамадскім транспарце, на занятках, у буфеце, у дэканаце, на перапынку.*

*200. Спішыце, расстаўце знакі прыпынку пры простай мове. Дзе трэба, замяніце малую літару на вялікую.*

Заручыны адбываюцца ў суботу. Калі сват, сваха і хлопец якраз пад спеў пеўня пад'едуць да хаты бацькоў дзяўчыны, на парог выходзіць гаспадар і вітае прыбыўшых такімі словамі а як маецеся, мае мілыя госці?

На што сват а мы здаровы, дзякаваць Богу, як вы маецеся ў сваёй хаце?

Як даглядаеце, так і маеце адказвае гаспадар, а праз хвіліну прашу вас да хаты з вашым Божым дарам за мой свянцоны стол.

Тады сваха бярэ скрынку з закускай, а сват – барылка і ўваходзяць у хату, дзе стаўляюць прынесенае на покуці.

Адначасова з прыездам хлопца дзяўчына хуценька збірае на стол, а потым разам з дружкаю бяжыць у вёску, каб запрасіць суседзяў, сваякоў, музыку і сваіх равесніц на заручыны.

Увайшоўшы ў першую-лепшую хату, яна гаворыць нех бэндзе пахвалёны Езус Хрыстус. На што гаспадары адказвалі на векі векаў! Маладая,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кланяючыся нізка, запрашала прасіў татко і матка, каб былі ласкавы, уступілі да нас на запоіны. А гаспадары хаты так адказваюць добра, добра мае дзеткі, прыйдзем; людзі людзям патрэбныя. Дзякую вам за тое, што вы аб нас не забылі, прыйдзем.

Пачуўшы добразычлівы адказ, дзяўчына цалуе гаспадароў у руку і гаворыць дзякую вам, што вы мяне не выракаецеся і не адмовілі маёй просьбы.

Падзякаваўшы, выходзіць першая, а дружка за ёю. Як пры ўваходзе, так і пры выхадзе дзвярэй яна не зачыняе: паводле павер'я, яна зачыніла б дзверы і перад сватамі, гэта значыць не выйшла б замуж (Паводле М. Федароўскага).

*201. Прачытайце тэксты, знайдзіце ў іх цытаты. Раскажыце аб сродках і спосабах увядзення цытат у кантэкст, аб іх афармленні і ўжыванні.*

I. Вядома, што першым сродкам для пачатку зносін у любой мове свету з'яўляецца маўленчы этыкет, асноўная функцыя якога – устанавіць кантакт паміж суразмоўцамі. Рускі лінгвіст А.Р. Балакай адзначае: «Тэрмінам ***маўленчы этыкет*** абазначаюць: 1) абмежавана шырокае паняцце: прынятыя ў тым або іншым грамадстве, коле людзей правілы, нормы маўленчых паводзін; 2) шырокае паняцце: сістэма ўстойлівых формул зносін, якія ўводзяцца грамадствам для ўсталявання маўленчага кантакту суразмоўцаў, падтрымання зносін у выбранай танальнасці ў адпаведнасці з іх сацыяльнымі ролямі і ролевымі пазіцыямі адносна адзін аднаго, узаемных адносін у афіцыйных і неафіцыйных абставінах; 3) вузкае паняцце: маўленчы этыкет складае функцыянальна-семантычнае поле адзінак добразычлівых, ветлівых зносін у сітуацыях звароту і прыцягнення ўвагі, знаёмства, прывітання, развітання, прабачэння, удзячнасці, віншавання, пажадання, просьбы, запрашэння, парады, прапановы, згоды, адмовы, ухвалення, кампліменту, спачування і г. д.» [1, с. 16–17] (Паводле Д.С. Томчыка).

***Літаратура***

*1. Балакай, А.Г.* Русский речевой этикет и принципы его лексикографического описания: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01 / А.Г. Балакай; Орлов. гос. ун-т. – Орел, 2002. – 40 с.

II. У апошнія гады ў сувязі з пашырэннем міжкультурных і міжнацыянальных кантэкстаў асаблівую цікавасць лінгвістаў прыцягвае нацыянальная спецыфіка маўленчых паводзін таго ці іншага народа. І гэта не выпадкова, паколькі нацыянальная спецыфіка лінгвакультурных аб'яднанняў пэў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нага народа істотна ўплывае на эфектыўнасць зносін на маўленчым і немаўленчым узроўнях. Як слушна адзначаюць А.А. Лявонцьеў, Ю.А. Сарокін і Я.Ф. Тарасаў, «носьбіты, што маюць адныя нацыянальныя рысы, уваходзячы ў кантакт з прадстаўнікамі іншых лінгвакультурных аб’яднанняў і нават ужываючы адзіную для іх мову, усё роўна дзейнічаюць па мадэлях тых маўленчых паводзін, якія распаўсюджаны і ўласцівы ў межах прыватных культурных ведаў пэўнага рэгіёна»[1]. Праблема асэнсавання камунікацыі людзей, якія належаць да розных культур, размаўляюць на розных мовах, асабліва актуалізавалася ў сувязі з пашырэннем міжэтнічных кантактаў і неабходнасцю вывучэння замежных моў (Д.С. Томчык).

III. У XIX ст. рэкамендавалася пазбягаць казаць кампліменты маламаёмым людзям, а ў адносінах да кампліментаў такіх асоб быць вельмі асцярожнымі, абачлівымі і разборлівымі, асабліва дзяўчатам, бо «пад імі [кампліментамі] вельмі часта хаваюцца ілжывыя прыхільнасць, сімпатыя або несапраўднае каханне». Дзяўчаты асабліва лёгка пападаліся на вуду кампліментаў такога кшталту, асабліва калі камплімент перабольшваў іх прыгажосць. Мужчына толькі тады мог рабіць камплімент дзяўчыне, калі «цалкам упэўніўся ў прыхільнасці да сябе дзяўчыны». Сціпласць забараняла жанчынам, асабліва маладым дзяўчатам, казаць камплімент мужчынам – «каб не трапіць у недарэчнае і смешнае становішча». Кампліменты ж паміж мужчынамі ўвогуле лічыліся непрынятымі і непрыстойнымі, за выключэннем хіба што тых выпадкаў, калі яны суправаджаліся лёгкай іроніяй або пераўтвараліся ў жарт [1, с. 132–133; 2, с. 61–62; 3, с. 191] (С. Важнік).

***Літаратура***

1. Правила светской жизни и этикета. Хороший тон. – М., 2007. (Репринт. изд. СПб., 1889).

2. Светский благовоспитанный молодой человек: сборник правил и наставлений, как держать себя с тактом во всех слоях общества и дома, с прибавлением необходимого словаря иностранных слов, употребляемых при разговорах в обществе и при дирижировании танцами: в 2 ч. – М., 1898.

3. Хороший тон: сборник правил и советов на все случаи жизни, общественной и семейной. – М., 1991. (Репринт. изд. СПб., 1881).

IV. Японская мова вельмі зручная для таго, каб утойваць свае думкі. З гэтай мэтай японцы нярэдка імкнуцца апусціць сувязнае звяно, induced

[1] Национально-культурная специфика речевого поведения. М., 1977. С. 3.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раючы сваё маўленне ў своеасаблівы паўнамёк, дзе сувязь абазначаецца толькі лёгкім штрыхом або падразумяваецца. Японскае маўленне ў гэтых адносінах падобнае на японскае мастацтва, якое «ўзяло на сябе задачу быць красамоўным на мове недагаворанасці» (В. Аўчыннікава). Выражаць свае думкі расплывіста – гэта асаблівасць, уласцівая японцам. Яны пазбягаюць дакладных форм выражэння. Японец баіцца быць катэгарычным. Ён адчувае сябе вельмі звязаным словам і таму баіцца сказаць нешта пэўнае. Адсюль у маўленні японцаў вельмі высокая частотнасць такіх выразаў, як: *соноуці* ‘як-небудзь’, *тэкітон* ‘пэўным чынам’, *тасё* ‘колькі-небудзь’, *цётто* ‘крышачку’, *нанто-наку* ‘неяк незразумела’ і г. д. (Паводле В. Фраловай).

*202. Дадзеныя крылатыя выслоўі выкарыстайце ў кантэксце як цытаты.*

1) Адным словам можна вельмі шмат выказаць, або тым жа самым словам нічога не сказаць (К. Чорны. Небеларуская мова ў беларускай літаратуры). 2) Дык шануй, Беларус, сваю мову – / Гэта скарб наш на вечныя годы; / За пашану радзімаму слову / Ушануюць нас брацця-народы! (А. Гарун. У чатырохлецце «Нашае нівы»). 3) Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы: хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы (Ф. Багушэвіч. Прадмова да зборніка «Дудка беларуская»). 5) Родная мова – гэта кроў народа, пакуль жыве яна – жыве народ (Ядвігін Ш. Хто чым можа – хай дапаможа). 5) Там, / Дзе не шануюць роднай мовы, / Мялеюць рэкі, / Нішчацца дубровы, / Каля магілак пасвяцца каровы, / Народ там мёртвы, / А той край – нямы (Г. Бураўкін. Я ведаю…).

## Тэст

1. Адзначце нумары сказаў з простай мовай:

1) Кажуць прыйдзе Ілля – наробіць гнілля (І. Чыгрынаў).

2) А ты, Ядвіська, калі ласка, заспявай звярнуўся пан падлоўчы да дачкі (Я. Колас).

3) Лабановіч спытаў сам у сябе куды ж ён ідзе і чаго ідзе, і спыніўся, азіраючыся (Я. Колас).

4) Ён зняў лямпу з драціны, кажучы асвятляе ўсё як на далоні, і павесіў яе пад бэлькай пры сцяне (П. Пестрак).

5) Калі тая самая ахмістрыня… прынесла нам вячэру і пакінула нас адных, я спытаў з кім я размаўляю (У. Караткевіч).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Адзначце сказы, якія адпавядаюць схеме «П, – а. – П»:

1) Вечар добры, панове заракатаў Дубатоўк што вы гэта сумныя, як мышы пад шапкай (У. Караткевіч).

2) І я шукаў удзякі словы, казаў іх шчыра, без прыкрас дзень добры вам, лясы, дубровы (П. Броўка).

3) І нашы куранёўцы не горай за другіх плылі паволі думкі ў Міканора і з нашымі можна рабіць… (І. Мележ).

4) У мяне шмат людзей горача загаварыў Белакрас у мяне людзей, як лісцяў у гэтым лесе, як хваль у Дняпры (Л. Дайнека).

5) А чаго яго біць спакойна сказаў бацька і нібы растлумачыў мядзведзь. Узялі, то цярпець маем (У. Караткевіч).

3. Адзначце схему, згодна з якой трэба аформіць простую мову ў сказе: *Не думаў ён гэтак далей жыць нельга* (Я. Колас).

1) – П, – а. – П. 2) – П, – а, – п. 3) «П, – а, – п».
4) «П, – а: – П». 5) А: «П».

4. Адзначце сказы, дзе знакі прыпынку пры простай мове пастаўлены правільна:

1) – Прыйдзі, мая галубка. Прыйдзі… – гэтак жа горача просіць і цётка і праводзіць Ганьку да веснічак (А. Васілевіч).

2) Цяпер гаварыла пані Любка: Ты так і не зразумеў мяне (У. Караткевіч).

3) – Паверыў бы ты, Панас, – гаворыць адзін з іх, Анкудовіч – што ў сябе дома будзем вот так хадзіць? Туляцца, як зайцы… (І. Навуменка).

4) – Сварба ўжо не паможа, трэба млён які браць, – Корсак, лёгка паляпваючы каня па шыі, павёў яго ў поцемак хлява, адтуль ужо гукнуў: – Дзе гэта ходзіш, каб хто спытаў (В. Адамчык).

5) Лабановіч падумаў: «А добра гаворыць Бас», і ўпотайку пазайздросціў яго красамоўству (Я. Колас).

5. Адзначце, які знак прыпынку прапушчаны пры афармленні простай мовы:

– Паспявалі б вы, дзяўчаткі – папрасіла маці, – некалі ж, калі мы яшчэ хадзілі на «вянок», дык весела было (Г. Далідовіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

## НОВАЕ Ў ПРАВІЛАХ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ[1]

### Правілы напісання галосных

***Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я***

- *Пашыраецца прынцып перадачы акання на пісьме:* § 4, п. 2. Незалежна ад паходжання слова гук [о] ў ненацiскных складах вымаўляецца як [а], што перадаецца на пісьме: ***трыа, радэа, Токіа***.
- *Сфармулявана правіла правапісу літар* ***э, е*** *на канцы іншамоўных слоў:* § 3, п. 2. На канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён і геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя ***л, к,*** пішацца ***э***: ***купэ́***, ***рэзюмэ́***, ***кафэ́***, ***кашнэ́***, ***фрыкасэ́***, ***каратэ́***, ***Мерымэ́***, ***Мо́рзэ***, ***Душанбэ́***, але: ***са́льта-мартáле***, ***піке́***.
- *Пашырана напісанне літары* ***э****, у тым ліку канцавога, у запазычаных словах:* § 3, п. 3. Літара ***э*** ў запазычаных словах пасля губных зычных, а таксама пасля **з, с, н** пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем. Так, словы ***капэ́ла***, ***сурвэ́тка***, ***экзэмпля́р***, ***маянэ́з***, ***тунэ́ль***, ***сэ́рвіс***, ***інтэрнэ́т*** пішуцца з літарай **э**, а словы ***меда́ль***, ***ме́неджмент***, ***не́рвы***, ***парла́мент***, ***перспекты́ва***, ***газе́та***, ***сервíз*** – з літарай **е**.
- *Сфармулявана правіла напісання фіналяў* ***-эль, -эр*** *у запазычаных словах:* § 4, п. 6. Ненацiскныя фіналі **-эль, -эр** у запазычаных словах передаюцца як ***-аль, -ар***: ***шніцаль***, ***шпа́таль***, ***лíдар***, ***камп'ю́тар***, ***пэ́йджар***.

Ненацiскныя фіналі ***-эль, -эр*** ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання передаюцца нязменна: ***Ландэр***, ***Одэр***, ***Пітэр***, ***Юпітэр***.

- *Уніфікуецца напісанне складаных слоў, першай часткай якіх з'яўляецца лічэбнік* ***сто.*** *Ён заўсёды мае форму* ***ста****:* ***стаметроўка, стагалосы***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[1] Лукашанец А., Кунцэвіч Л., Кандраценя І. Вывучаем новыя правілы беларускага правапісу // Роднае слова. – 2009. – № 1–12; Куліковіч У.І. Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні. Тэсты. Слоўнік: вуч. дапам. – Мінск: Новое знание, 2009; Беларускі арфаграфічны слоўнік / пад. рэд. А.А. Лукашанца. – Мінск: Беларус. навука, 2009.

- *Правілы перадачы якання распаўсюджваюцца на большую колькасць слоў:* § 6, п. 1. Галосныя **е, ё** ў першым складзе перад націскам абазначаюцца на пісьме літарай ***я***: ***дзе́вяць – дзявя́ты***, ***дзе́сяць – дзяся́ты***, ***сем – сямна́ццаць***, ***во́сем – васямна́ццаць, пяцьдзясят***.
- *Удакладнены правапіс літар* ***е, ё, я*** *ў складаных словах:* § 7, п. 1. У першай частцы складанага слова літара ***е*** захоўваецца незалежна ад таго, на якім складзе націск у другой частцы: ***сенакасілка, сенажаць, свежамарожаны***.
- *Размежаваны правапіс частка* ***велік-/вялік-*** ***у*** *складаных словах:* § 7, п. 1. Калі першай часткай складаных слоў з'яўляецца аснова ***велік-/вялік-***, напісанне літар ***е*** або ***я*** залежыць ад таго, які склад у другой частцы націскны: калі першы – пішацца ***е***, калі другі – пішацца ***я***: ***велікадушны***, ***велікамучанік***; ***Вялікабрытанія***, ***вялікагаловы***.

## *Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах*

*Уніфікавана напісанне слоў са спалучэннямі* ***йо, йа, йе****:* § 9, п. 2. Калі спалучэнні ***іо***, ***йо*** вымаўляюцца як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца: пасля галосных – праз ***ё*** пад націскам і ***я*** не пад націскам: ***раён, Лаёла; маяран;*** у пачатку слова – праз ***ё***: ***ёг, ёгурт, ёд.***

§ 9, п. 4. Спалучэнне ***йе*** заўсёды вымаўляецца як адзін склад і на пісьме ў пачатку слова і пасля галосных перадаецца праз ***е***: ***езуіт, праект, канвеер.***

§ 9, п. 6. Спалучэнне ***йа*** на пісьме перадаецца пасля галосных і ў пачатку слова – праз ***я***: ***Савоя, Малая, Мая, ярус.***

§ 16 п. 3. У сярэдзіне запазычаных слоў, у тым ліку ва ўласных назвах, літара ***й*** пішацца толькі перад зычнымі: ***дызайн***, ***Кландайк***, ***Драйзер***, ***лайнер***.

Гукавое спалучэнне зычнага гука ***[й]*** з галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання перадаецца ётаванымі галоснымі: ***Ёфе***, ***Нью-Ёрк***; ***маёр***, ***маярат***, ***Аюнскі***, ***фае***, ***секвоя***, ***папая***.

## *Правапіс ы, і, й пасля прыставак*

*Напісанне* ***ы*** *пасля прыстаўкі на зычны пашырана:* § 22, п. 13. Пры спалучэнні прыставак **(*аб-*, *ад-*, *над-*, *пад-*, *раз-*, *з-* (*с-*), *уз-*, *спад-*, *перад-*, *дэз-*, *суб-*)** са словамі, што пачынаюцца з ***і***, у адпаведнасці з вымаўленнем замест ***і*** пішацца ***ы***: ***абыграць***, ***узыход***, ***спадылба***, ***перадынфарктны***, ***субынспектар***, ***дэзынтэгратар***, ***дэзынфармацыя***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пасля прэфіксоідаў (***звыш-***, ***між-***, ***пан-***, ***супер-***, ***транс-***, ***контр-***) *і* захоўваецца: ***звышімклівы***, ***міжінстытуцкі***, ***паніслам-ізм***, ***контрідэя***, ***суперінтэлект***, ***трансіндыйскі.***

### *Правапіс у і ў (нескладовага)*

*Напісанне* ***ў*** *(у нескладовага) пашыраецца на вялікую колькасць слоў іншамоўнага паходжання:* § 15, п. 1. Нескладовае **у (ў)** пішацца згодна з беларускім літаратурным вымаўленнем пасля галосных: пры чаргаванні [у] з [ў]; у пачатку слова (калі гэта слова не пачынае сказ і перад ім няма знакаў прыпынку): ***для ўніята*** (*з уніятам*), ***ва ўніверсітэце*** (*перад універсітэтам*); у сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: ***саўна***, ***фаўна***, ***аўра***, ***джоўль***, ***каўчук***, ***маўзер***, ***маўр***, ***паўза***, ***раўнд***; але: ***траур***.

У канцы запазычаных слоў ненаціскное у не скарачаецца: ***фрау***, ***Ландау***, ***ток-шоу***.

п. 2. Гук [у] пад націскам не чаргуецца з [ў]: ***да у́рны, Брэсцкая у́нія, групоўка у́льтра, норма і у́зус, насілі у́нты, чулася у́ханне, ау́л, бау́л, ау́каць,*** *у* выклічніках ***у (у, нягоднікі!), ух (ух ты!), уй (уй, які смешны!).***

§ 15, п. 3. Гук [у] не чаргуецца з [ў] у запазычаных словах, якія заканчваюцца на ***-ум***, ***-ус***: ***прэзідыум***, ***кансіліум***, ***радыус***, ***страус***, ***соус*** і вытворных ад іх.

## Правілы напісання зычных

### *Правапіс спалучэнняў зычных*

*Напісанне спалучэнняў зычных у адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем распаўсюджваецца на шэраг слоў іншамоўнага паходжання, якія раней былі выключэннямі (§13):* ***кантрасны*** *(параўн.: кантраст),* ***кампосны*** *(параўн.: кампост),* ***фарпосны*** *(параўн.: фарпост).*

### *Правапіс мяккага знака і апострафа*

*Уніфікуецца правапіс прыметнікаў, утвораных ад назоўнікаў на* ***-нь****:* § 18, п. 7. Мяккі знак не пішацца ў прыметніках з суфіксам ***-ск-***, утвораных ад назоўнікаў на ***-нь***: ***чань-чунскі*** (Чань-Чунь), ***цянь-шанскі*** (Цянь-Шань).

## Правапіс прыставак

- *Сфармулявана правіла правапісу прыставак* ***су- і са-****:*

§ 22, п. 2. Прыстаўка ***су-*** пішацца:

у назоўніках, дзе ***су-*** выдзяляецца толькі гістарычна: ***сусед***, ***сувой***, ***сувязь***;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

у новых утварэннях, калі ёсць слова і без ***су-***: ***суграмадзянін***, ***супалімер***, ***сукрэдытор*** і інш.;

у словах, якія без ***су-*** не ўжываюцца: ***суквецце***, ***сузор'е***, ***суладдзе***.

п. 3. Прыстаўка ***су***- пішацца:

у дзеясловах: ***суадносіць***, ***супадпарадкоўваць***, ***сумяшчаць***, ***суіснаваць***, ***сустракаць***, ***сутыкацца***, ***супярэчыць***, ***супастаўляць***, ***супадаць***;

у прыметніках: ***сумежны***, ***сукупны***, ***суладны***, ***сугучны***, ***сучасны***, ***сувымяральны***, ***супольны***, ***сумесны***, ***суцэльны***;

у прыслоўях: ***супраць*** (***супроць***).

п. 4. Прыстаўка ***су***- захоўваецца ў лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі, што маюць прыстаўку ***су***-: ***сутачны*** (*суткі*), ***суапякунства*** (*суапякун*) і інш.

п. 5. Прыстаўка ***са***- пішацца:

у некаторых назоўніках, дзе прыстаўка выдзяляецца толькі гістарычна: ***сасуд***, ***савет***, ***сабор***, ***саюз***, ***саслоўе***;

у запазычаннях і кальках (пераважна з рускай мовы): ***саіскальнік***, ***сакурснік***, ***садружнасць***, ***сачыненне***, ***састаў***, ***саслужывец*** і інш.

п. 6. Прыстаўка ***са***- захоўваецца:

у лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі з прыстаўкай ***са***-: ***саўдзел*** (*саўдзельнік*), ***саслоўны*** (*саслоўе*), ***састыкоўванне*** (*састыкаваць*) і інш.;

у дзеясловах, калі ***са***- з'яўляецца варыянтам ***с***- (перад збегам зычных): ***садраць*** (*здзяру*), ***сагнаць*** (*зганю*), ***саскочыць***, ***сажмурыць***, ***сасмажыць*** і інш.;

у прыметніку ***сапраўдны*** і вытворных ад яго.

- *Сфармулявана правіла правапісу прыставак* ***дыз***- *і* ***дыс***-, ***дэз***-*:*

§ 22, п. 10. У прыстаўцы ***дыз***- перад галоснымі (у тым ліку ётаванымі) пішацца ***з***, а перад зычнымі – ***с***: ***дызартрыя***, ***дыз'юнкцыя***, ***дысгармонія***.

п. 11. Прыстаўка ***дэз***- пішацца нязменна: ***дэзактывацыя***, ***дэзарыентацыя***, ***дэзынфекцыя***.

- *Унесены карэкцівы ў правапіс прыставак на зычны:* § 22, п. 8. Калі корань слова пачынаецца з галосных ***а, у, э*** або ненаціскнога ***і,*** якое пераходзіць у ***ы***, замест прыстаўкі ***з***- пішацца прыстаўка ***с***-: ***сарганізаваць***, ***сумысна***, ***сэканоміць***, ***сыграць***; але: ***зымправізаваць***, ***зыначыць***.

§ 22, п. 9. У словах, утвораных ад дзеясловаў ***ісці, хадзіць***, прыстаўкі на ***з***- пішуцца ў залежнасці ад лексічнага значэння: ***зысці*** – ***сысці***, ***зысціся*** – ***сысціся***, ***зыходзіць*** – ***сыходзіць***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Правапіс суфіксаў

*Распрацаваны рэкамендацыі па ўжыванні суфіксаў* ***-ірава- (-ырава-)***: § 23, п. 2. Дзеяслоўны суфікс -***ірава***- (-***ырава***-) ужываецца:

калі без гэтага суфікса ўзнікае аманімія дзеясловаў з дзеясловамі з суфіксам -***ава***- (***-ява-***): ***буксіраваць*** – ***буксаваць***, ***парадзіраваць*** – ***парадаваць***, ***візіраваць*** – ***візаваць***;

калі дзеяслоў без -***ір***- (***-ыр-***) губляе сваю фармальную і семантычную акрэсленасць: ***шакіраваць***, ***бравіраваць***, ***гарманіраваць*** і інш.;

калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне: ***манціраваць***, ***аксідзіраваць***, ***зандзіраваць***.

У некаторых выпадках паралельна ўжываюцца дзве формы: ***акупіраваць*** – ***акупаваць, курсіраваць – курсаваць, калькіраваць – калькаваць, базіраваць – базаваць***.

## Правапіс абрэвіятур

- *Унесены змены ў правапіс абрэвіятур:* § 20, п. 1. У абрэвіятурах скарочаныя часткі пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: ***прафкам*** (*прафсаюзны камітэт*), ***рыбгас*** (*рыбная гаспадарка*), ***інтэрпал*** (*інтэрнацыянальная паліцыя*), ***лінкар*** (*лінейны карабель*).
- *Распрацаваны рэкамендацыі аб напісанні запазычаных абрэвіятур:* § 20, п. 3. Напісанне няўласнабеларускіх (запазычаных) абрэвіятур вызначаецца па слоўніку; поўны сэнсавы беларускі адпаведнік перадае значэнне такіх запазычанняў, а не расшыфроўвае іх: ***заўгас*** (загадчык гаспадарчай часткі), ***завуч*** (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце), ***спецназ*** (атрад спецыяльнага прызначэння), ***АСУ*** (аўтаматызаваная сістэма кіравання), ***ЮНЕСКА*** (Камісія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры).

## Правапіс вялікай і малой літар

- *Уведзены асобны параграф, які рэгламентуе правапіс вялікай і малой літар у найменнях асоб, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў:* § 26, п. 1. З вялікай літары пішуцца:

найменні найвышэйшых божастваў (боствау) у рэлігійных культах, а таксама ўсе словы ў спалучэннях, якія змяшчаюць гэтыя назвы: ***Бог***, ***Саваоф***, ***Алах***, ***Яхве***, ***Шыва***, ***Вішну***; ***Прасвятая Тройца***, ***Царыца Нябесная***, ***Месія***;

прыметнікі, утвораныя ад слова ***Бог***: ***Божы*** (***Боскі***) ***храм***, ***Божая*** (***Боская***) ***міласць***;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асабовыя імёны (і ўсе словы ў састаўных асабовых назвах, акрамя агульных назваў) заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, а таксама біблейскіх асоб (апосталаў, прарокаў, святых і інш.): ***Ісус Хрыстос***, ***Буда***, ***Брахма***; ***Іаан Хрысціцель***, ***Святы Павел***;

імёны легендарных і міфічных асоб, язычніцкіх багоў: ***Антэй***, ***Зеўс***, ***Тытан***, ***Венера***, ***Даждбог***, ***Жыжаль***, ***Пярун***, ***Цмок***, але як агульныя назвы: ***пярун*** – удар грому, ***іуда*** (***юда***) – здраднік, ***цмок*** – змей, ***тытан*** – волат;

уласныя назвы ўяўных і казачных істот, герояў літаратурных твораў: ***Папялушка, Чырвоная Шапачка, Калабок, Снягурка, Дзед Мароз, Баба Яга, Пегас, Буцэфал, Атлант***, але як агульныя назвы: ***дзед-мароз*** – ёлачнае ўпрыгожанне, ***баба-яга*** – агідная старая, ***буцэфал*** – стары конь, ***атлант*** – у архітэктуры;

агульныя назвы істот, а таксама з'яў і прадметаў, калі яны персаніфікуюцца, выступаюць у ролі імёнаў герояў літаратурных твораў (у казках, байках і інш.): ***Мядзведзь***, ***Воўк***, ***Ліса*** (***Ліска***), ***Заяц*** (***Зайка***), ***Асёл***, ***Бусел-клекатун***, ***Карась-лежабок***, ***Сонца***, ***Праўда***, ***Крыўда*** і інш.

п. 2. З малой літары пішуцца:

слова ***бог*** **(*гасподзь*)** ва ўстойлівых выразах, звязаных з выказваннем розных пачуццяў у прастамоўі, а не са зваротам да Бога паводле рэлігійнай абраднасці і ўяўленняў: ***бог яго ведае, крый бог (божа), не давядзі бог (божа, госпадзі), алах з ім***;

слова *бог* з агульным значэннем боства ў спалучэнні з асабовай назвай або з назоўнікам з агульным значэннем у родным склоне: ***старажытны славянскі бог Пярун, бог сонца Даждбог, Сварог – бог неба***;

агульныя назвы ўяўных істот: ***архангел, анёл, муза, дамавік, русалка, гном, троль, здань, хохлік*** і інш.

- *Уведзены асобны параграф, які рэгламентуе правапіс вялікай і малой літар у найменнях пасад і званняў, ветлівых зваротах і спецыяльных абазначэннях:* § 29. З вялікай літары пішуцца:

словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца афіцыйнымі назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных і рэлігійных пасадах: ***Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь***, ***Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь***, ***Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь***, ***Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь***, ***Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь***, ***Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь***, ***Генеральны пракурор Рэспублікі***

***Беларусь***, ***Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі***, ***Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі***, ***Папа Рымскі***, ***Далай-Лама***. У неафіцыйным ужыванні словы *прэзідэнт*, *старшыня*, *кароль*, *імператар* пішуцца з малой літары: ***візіт прэзідэнта***, ***прыём у караля***, ***загад імператара***; **але:** ***выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь***;

словы або спалучэнні слоў, якія з'яўляюцца назвамі асобы па вышэйшых дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь і іншых краін (акрамя слова ***кавалер***): ***Герой Беларусі***, ***Герой Савецкага Саюза***, ***Герой Сацыялістычнай Працы***, ***кавалер ордэна Ганаровага Легіёна***;

у розных афіцыйных пасланнях, лістах займеннік ***Вы*** як форма ветлівага звароту да адной асобы;

у высокім стылістычным ужыванні такія агульныя назвы, як ***Радзіма***, ***Айчына***, ***Бацькаўшчына***, ***Чалавек***, ***Маці***, ***Настаўнік***, ***Майстар*** і інш.;

словы ў назвах бакоў у пагадненнях, кантрактах і іншых дагаворах: ***Высокія Дагаворныя Бакі***, ***Аўтар і Выдавецтва***, ***Заказчык і Выканаўца***.

- *Пашырана напісання вялікай літары ў назвах традыцыйных і рэлігійных святаў:* § 32, п. 1. З вялікай літары пішуцца:

аднаслоўныя ўласныя назвы і першае слова ў састаўных назвах дзяржаўных, традыцыйных і рэлігійных святаў: ***Нараджэнне Хрыстова, Дзень памяці, Дзень беларускай навукі, Ушэсце Гасподняе, Уваскрэсенне Хрыстова, Вялікая субота, Таццянін дзень, Радаўніца, Вялікдзень, Каляды, Купалле, Дабравешчанне, Наўроз, Рамадан***.

Запомніце напісанне – ***Вялікае Княства Літоўскае***.

## Правілы пераносу

*Спрошчаны правілы пераносу слоў:*

§ 41, п. 2. Калі ў сярэдзіне слова паміж галоснымі маецца спалучэнне зычных, то пераносіцца на наступны радок або ўсё гэта спалучэнне, або любая яго частка. Можна пераносіць: ***ся-стра***, ***сяс-тра***, ***сяст-ра***; ***ра-скрыць***, ***рас-крыць***, ***раск-рыць***; ***дзя-ці-нства***, ***дзя-цін-ства***, ***дзя-цінс-тва***, ***дзя-цінст-ва***; ***двац-цаць***, ***два-ццаць***; ***калос-се***, ***кало-ссе***; ***мыц-ца***, ***мы-цца***; ***паа-бапал, па-абапал***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Дадатак 2*

## Адказы на кантрольныя заданні

**21**. 1) *паланэз*, шынель, фанетыка, медаль, нэцке; 2) камп’ютар, лідар, менеджар, *Юпітэр*, шніцаль; 3) сальта-мартале, *сямнаццаць*, велікамучанік, легкадумны, велюр; 4) гросмайстар, мовазнаўства, штогод, *стагоддзе*, контрігра; 5) праінфармаваць, праіснаваць, *прайграць*, праілюстраваць, праіранскі.

**22**. 1) бібліяграфія, 2) арфаэпія, 3) ётаваныя, 4) археалогія, 5) трыа, 6) іерогліф, 7) экзэмпляр, 8) почырк, 9) інтэрнэт, 10) прынтар.

**41**. 1) амністыя, *гільяціна*, пантэон, паштэт, факультэт; 2) *бамбардзіроўшчык*, дыспетчар, Нідэрланды, кандыцыянер, дэгустатар; 3) вастрыць, вустрыца, *оканне*, есавульскі, востраў; 4) Аксіння, *Ілья*, Жанна, Ганна, Таццяна; 5) двукоссе, донна, суддзя, Мекка, *пано*.

**42**. 1) ерэтык, 2) ёг, 3) дэвіз, 4) цір, 5) эцюд, 6) экзарх, 7) субцітр, 8) акардэон, 9) дылема, 10) дырыжор.

**46**. 1) канферансье, 2) ад’юнкт, 3) ранцье, 4) ад’ютант, 5) фельд’егер, 6) альянс, 7) кан’юнктура, 8) інтэр’ер, 9) віньетка, 10) ар’ергард.

**55**. 1) *адхлыньце*, з’ешце, крочце, насыпце; 2) раёны Гомельскі, *Любанскі*, Скідальскі, Чэрвеньскі; 3) пяцьсот, шэсцьсот, *восемсот*, дзевяцьсот; 4) *вагончык*, карэньчык, праменьчык, струменьчык.

**56**. а) Дзям'янава юшка (І.А. Крылоў), як дзядзька ў Вільні (Я. Колас); б) вось табе, бабка, і Юр'еў дзень; в) гульня ў бірульки; г) вераб'ю па калена, з вераб'ёў нос; д) мераць асьмінай (пра грошы); е) на казе не пад'едзеш.

**82**. 1) бясцэнныя; 2) мастацтва, маленства, сваяцтва; 3) злажанай, зададзенасці; 4) народжанаму; 5) згублены; 6) перавучвацца; 7) чалавецтва; 8) мноства; 9) вылечвае; 10) паказваем.

**83**. Дзённік, бляшаны, доменны, канапляны, клеены, клятвенны, імянінік, конніца, кухонны, ленасць, марожанае, дзянніца, манны, мільённы, абранніца, сасоннік, намуляны, раслінаводчы, салонны, саламяны, свіны, выгнаннік, спантанны, сцюдзёны, танкаструнны, упэўнены, сяннік.

**92.** 1) водаправодны, доўгатрывалы, індаеўрапейскі, *прынцыпова новы*; 2) вадалазны, іншамоўны, узаемаабумоўлены, *добра арганізаваны*; 3) літаратурна-мастацкі, народна-дэмакратычны, *малапрыкметны*, горка-салёны; 4) паравозавагонарамонтны, доўгачаканы, *блакітна-шэры*, конегадоўчы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**101.** 1) не абы-як, 2) ані якія буры-вятры, 3) усё-такі, 4) зусім, донкіхоты, 5) усё роўна, 6) кіраваць-то, 7) семсот, 8) ганебна-нізка, змяіна-паўзучае, 9) знову, змоладу, 10) набок, 11) дружба дружбай, служба службай.

**102. Разам**: назаўсёды, старажытнабеларускі, аднавокі, самабытнасць, нагара, якраз, трыццаціметровы, уранні, міжволі, быць напагатове, электразварка, штодзень, унізе, процізапаленчы, нізашто, саматрэніроўка. **Асобна**: на памяць, духоўна багаты, на дзіва, у глыб лесу, у адзіночку, на векі вечныя. **Праз злучок**: студэнт-завочнік, па-трошку, з-за, усё-такі, рок-музыка, трава-крапіва, гарнітур-тройка, цуда-юда, экс-чэмпіён.

**133.** 1) Купалава; 2) багіня, Чалавечнасць, Праўда, Вера, Любоў; 3) Беларушчына; 4) магеланы; 5) Біблія; 6) Радзіме; 7) Беларусь; 8) ракфелеры, форды; 9) Вербнай нядзелі; 10) Скарынавых, Куляшова.

**135.** Палац моладзі, пушкініст, паў-Лагойска, Дзень друку, Любанскі раён, Асіповіцкае вадасховішча, Мінска-Маладзечанскае ўзвышша, асіповіцкія вуліцы, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (Мінюст), Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр балета Рэспублікі Беларусь, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», гарызонт, тэлевізар «Гарызонт», Другая сусветная вайна, медаль «Залатая Зорка».

**179.** Тастамент

Адпісаў бы табе зямлі. Але ў мяне, селяніна, адабралі яе і, знявечыўшы, засеялі чарнабыльнікам.

Адпісаў бы табе грошы. Але я існаваў з працы рук сваіх – не сабраў за жыццё і капейчыны.

Адпісаў бы табе храм. Але яго няма, а на руінах святыняў яшчэ правіць шабаш антыхрыст.

І таму адзінае, што адпісваю табе, – гэта Любоў да краю роднага. Зберажы яе і перадай дзецям сваім. А дзеці няхай перададуць сваім дзецям. А тыя – сваім...

Тады мо ўсё і вернецца на кругі свая (Я. Пархута).

**192**. Ноч прыйшла да зямлі на спатканне,
Захад скончыў агнём палаць,
І дубы ў малочным тумане
Веліканамі ціха стаяць.
Бач, агеньчыкі вёскі далёкай,
Бач, на ростані ўзняўся курган.
Явар сумны і адзінокі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пахіліў задумёны стан.
Кветка тут у начы расцвітае,
Водар мяккі пялёсткі льюць…
І яе па роднаму краю
«Кветкай матчынай» людзі завуць.
Я крануў яе ціха рукою –
І пялёсткі спеў завялі,
І паўсталі вакол чарадою
Ўсе паданні роднай зямлі.
Вось карона ў рацэ заблішчэла,
Хтось плыве, як туман, па вадзе
Па дарозе, ад месяца белай,
Цар змяіны кудысьці паўзе.
Цені ў лесе бягуць. Цямнее.
І ў чароўнай лясной гушчыні
Праімчаўся кудысь, як завея,
Ян Прыгожы на белым кані (У. Караткевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Дадатак 3***

## Ключы да тэстаў

*Правілы напісання галосных*

| ***1*** | ***2*** | ***3*** | ***4*** | ***5*** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 3, 4 | 1, 4, 5 | 2, 3, 5 | 1, 5 | 2, 4, 5 |
| ***6*** | ***7*** | ***8*** | ***9*** | ***10*** |
| 1, 3, 4, 5 | 1, 2, 5 | 2, 4 | 2, 4, 5 | 2, 5 |
| ***11*** | ***12*** | ***13*** | ***14*** | ***15*** |
| 1, 2, 4, 5 | 1, 4 | 2, 5 | 1, 3, 4 | 1, 5 |

*Правілы напісання зычных*

| ***1*** | ***2*** | ***3*** | ***4*** | ***5*** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 2, 3 | 4, 5 | 2, 4 | 2, 3, 4 | 1, 3, 4 |
| ***6*** | ***7*** | ***8*** | ***9*** | ***10*** |
| 1, 5 | 2, 4, 5 | 1, 2, 3 | 1, 2 | 1, 5 |
| ***11*** | ***12*** | ***13*** | ***14*** | ***15*** |
| 1, 5 | 1, 4 | 3, 4 | 1, 3, 4 | 1, 5 |

*Правапіс мяккага знака і апострафа*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 3, 5 | 3, 4 | 2, 5 | 3 | 3, 5 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 1, 2, 4 | 1, 2, 4 | 1, 3 | нюанс | цянь-шанскі |

*Правапіс прыставак*

| ***1*** | ***2*** | ***3*** | ***4*** | ***5*** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 3, 5 | 1, 2, 4, 5 | 2, 4 | 1, 2, 4 | 1, 3 |
| ***6*** | ***7*** | ***8*** | ***9*** | ***10*** |
| 1, 2, 5 | 2, 3 | 1, 3 | 3, 4, 5 | 2, 3 |
| ***11*** | ***12*** | ***13*** | ***14*** | ***15*** |
| 1, 2, 3, 5 | 1, 2 | 1, 2, 4 | 1, 3, 5 | 1, 2 |

*Правапіс суфіксаў*

| ***1*** | ***2*** | ***3*** | ***4*** | ***5*** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 4 | 2, 3 | 1, 2, 4 | 1, 2, 3 | 1, 5 |
| ***6*** | ***7*** | ***8*** | ***9*** | ***10*** |
| 1, 4, 5 | 2, 5 | 1, 3, 5 | 2, 3 | 1, 3, 5 |
| ***11*** | ***12*** | ***13*** | ***14*** | ***15*** |
| 4, 5 | 2, 4, 5 | 3, 4, 5 | 1, 3, 5 | 1, 3 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 5 | 3, 4 | 2, 4, 5 | 2, 3, 4 | 2, 3 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 2, 4 | 4, 5 | 1, 3 | 1, 3, 4 | 2, 4 |

*Правапіс часціц не, ні з рознымі часцінамі мовы*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 2 | 1, 3, 4 | 1, 2, 5 | 1, 2, 4 | 3, 4, 5 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 2, 3, 4 | 1, 4 | 1, 2, 4, 6, 7 | а-3, б-1 | 1, 4, 5 |

*Правапіс вялікай і малой літар*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 2, 3 | 3, 4 | 1, 5 | 3, 5 | 1, 2, 3, 5 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 2, 4 | 1, 3 | 1, 3, 5 | 2, 5 | 3, 4, 5 |
| **11** | **12** | **13** | **14** | **15** |
| 3, 4 | 1, 3, 5 | 2, 3, 4 | 2, 5 | 1, 3, 5 |

*Правілы пераносу*

1-Б; 4-В; 5-В, 6-А; 9-В; 10-В; 12-Б; 13-А; 15-Б; 16-А; 17-В; 18-А; 19-А, В; 20-А, В.

*Правілы пастаноўкі працяжніка*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 3, 5 | 1, 2, 4 | 1, 5 | 2 | 2, 3, 4 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 2, 5 | 2 | а-3, б-2, в-4 | 2, 3, 5 | 1, 3, 5 |

*Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 2, 5 | 1, 4, 5 | 2, 5 | 1, 2, 5 | 2, 4, 5 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 1, 2, 4 | 1, 2, 5 | 2, 4 | 1, 3, 5 | 1, 2, 3 |
| **11** | **12** | **13** | **14** | **15** |
| 2, 3, 4 | 3, 5 | 1, 4, 5 | 1, 2, 5 | 2, 4, 5 |
| **16** | **17** | **18** | **19** | **20** |
| 1, 4, 5 | 1, 4, 5 | 1, 3, 5 | 1, 2, 4, 5 | 1, 3, 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Знакі прыпынку ў складаным сказе*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 1, 3, 4 | 1, 3, 4 | 4, 5 | 2, 4 | 2, 3, 5 |
| **6** | **7** | **8** | **9** | **10** |
| 1, 4 | 3 | 4 | 1, 3 | 1, 3 |

*Знакі прыпынку пры цытатах і простай мове*

| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
|---|---|---|---|---|
| 2, 4 | 3, 4 | 3 | 1, 4 | коска |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА** ........ **3**

**ПРАВІЛЫ АРФАГРАФІІ** ........ **5**

Правілы напісання галосных ........ 5

*Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я* ........ *5*

*Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах* ........ *7*

*Правапіс літар ы, і, й пасля прыставак* ........ *8*

*Правапіс у і ў (у нескладовага)* ........ *10*

*Правапіс прыстаўных галосных* ........ *10*

*Правапіс галосных у складаных словах* ........ *11*

☑ Кантрольныя заданні ........ 12

Тэст ........ 12

Правілы напісання зычных ........ 14

*Правапіс звонкіх і глухіх зычных, шыпячых і свісцячых* ........ *14*

*Правапіс некаторых спалучэнняў зычных* ........ *16*

*Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных* ........ *17*

*Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных* ........ *18*

☑ Кантрольныя заданні ........ 19

Тэст ........ 20

Правапіс мяккага знака і апострафа ........ 22

☑ Кантрольныя заданні ........ 25

Тэст ........ 26

Правапіс прыставак ........ 27

☑ Кантрольныя заданні ........ 30

Тэст ........ 31

Правапіс суфіксаў ........ 33

☑ Кантрольныя заданні ........ 37

Тэст ........ 37

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Правапіс слоў разам, асобна, праз злучок (дэфіс) .......... 39
*Правапіс складаных назоўнікаў* .......... *40*
*Правапіс складаных прыметнікаў* .......... *40*
*Правапіс складаных лічэбнікаў* .......... *41*
*Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў* .......... *42*
*Правапіс складаных прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц, выклічнікаў* .......... *43*
☑ Кантрольныя заданні .......... 43
✎ Тэст .......... 44

Правапіс часціц не, ні з рознымі часцінамі мовы .......... 45
✎ Тэст .......... 51

Правапіс вялікай і малой літар .......... 53
☑ Кантрольныя заданні .......... 59
✎ Тэст .......... 60

Правілы пераносу .......... 62
✎ Тэст .......... 64

Правапіс скарачэнняў .......... 64

**ПРАВІЛЫ ПУНКТУАЦЫІ .......... 65**

Знакі прыпынку ў канцы сказа .......... 65

Правілы пастаноўкі працяжніка .......... 66
*Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам* .......... *66*
*Працяжнік у простым сказе* .......... *68*
✎ Тэст .......... 70

Знакі прыпынку ў простым ускладненым сказе .......... 73
*Аднародныя члены сказа* .......... *73*
*Адасобленыя азначэнні, прыдаткі, акалічнасці, дапаўненні* .......... *78*
*Параўнальныя звароты* .......... *84*
*Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі* .......... *84*
*Звароткі* .......... *86*
☑ Кантрольныя заданні .......... 87
✎ Тэст .......... 89



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Знакі прыпынку ў складаным сказе....................................................................94
*Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе ........................................................94*
*Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе ........................................................95*
*Знакі прыпынку ў складаным бяззлучнікавым сказе ..........................................97*
*Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі ..............................98*
☑ Кантрольныя заданні .............................................................................................99
✎ Тэст .......................................................................................................................100

Знакі прыпынку пры цытатах і простай мове ..........................................................103
✎ Тэст .......................................................................................................................109

**ДАДАТКІ .....................................................................................................................111**

Дадатак 1. Новае ў правілах беларускай арфаграфіі ..............................................111

Дадатак 2. Адказы на кантрольныя заданні...............................................................118

Дадатак 3. Ключы да тэстаў .......................................................................................121

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбнае выданне

**Азарка** Вольга Уладзіміраўна
**Васілеўская** Алена Станіславаўна
**Качан** Вольга Георгіеўна і інш.

# ПРАКТЫКУМ
# ПА АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Дапаможнік*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Карэктар* В.У. Юхнавец
*Тэхнічнае рэдагаванне* А.А. Пакалы
*Камп'ютарная вёрстка* І.І. Галіцкага

Падпісана ў друк 23.02.10. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура *Арыял*. Друк Riso.
Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,83. Тыраж ___ экз. Заказ

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі* «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».
ЛИ № 02330/0494368 от 16.03.09.
ЛП № 02330/0494171 от 03.04.09.
220050, Мінск, Савецкая, 18.

## Вучэбна-выдавецкі цэнтр БДПУ
**прапаноўвае Вашай увазе наступную літаратуру:**

***Азарка, В.У.***
**Гісторыя беларускай мовы : вучэб.-метад. дапам. / В.У. Азарка, А.С. Васілеўская, А.Г. Міхалевіч. – Мінск : БДПУ, 2009. – 100 с.**

У дапаможніку прадстаўлены тэарэтычны матэрыял, заданні і практыкаванні па дысцыплінах гісторыка-лінгвістычнага цыкла – гісторыі беларускай літаратурнай мовы, старажытнаславянскай мове, гістарычнай граматыцы беларускай мовы.

Адрасуецца студэнтам дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі з дадатковай спецыяльнасцю «Беларуская мова і літаратура», выкладчыкам, магістрантам і аспірантам.

***Старасценка, Т.Я.***
**Стылістыка беларускай мовы : вучэб.-метад. дапам. / Т.Я. Старасценка, В.В. Урбан, Ф.С. Шумчык. – 2-е выд. – Мінск : БДПУ, 2010. – 219 с.**

У дапаможніку разглядаюцца пытанні тэарэтычнага і практычнага характару, якія выяўляюць спецыфіку функцыянальных стыляў і асаблівасці ўжывання сродкаў лексікі, марфалогіі і сінтаксісу беларускай літаратурнай мовы.

Адрасуецца студэнтам філалагічных спецыяльнасцей БДПУ, выкладчыкам і аспірантам, настаўнікам сярэдніх школ.

***Набыць пералічаныя выданні можна:***
**у кніжным кіёску УП «Белкніга»** кнігагандлёвага прадпрыемства «Бібліятэчны калектар» па адрасе: *г. Мінск, вул. Савецкая,18 (галоўны корпус БДПУ),*
а таксама ў кніжных магазінах г. Мінска:
**Акадэмічная кніга**, *пр. Незалежнасці, 72, т. 232-46-52;*
**Цэнтральны кніжны магазін,** *пр. Незалежнасці, 19 т. 227-49-18;*
**Падпісныя выданні**, *пр. Незалежнасці, 14, т. 227-63-61.*

***Заказы можна афармляць*:**
**па тэлефоне (017) 227-89-74, 219-78-14; *e-mail*: izdat@bspu.unibel.by;**
**заказ поштай па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ВВЦ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ